**Юрась Дубовік**

# Дзеля Рэчы Паспалітай Беларусі

Вільня
«Наша Будучыня»
2006

Дубовік Ю.

Дзеля Рэчы Паспалітай Беларусі / Юрась Дубовік. — Вільня: “Наша Будучыня”, 2006. - 97 с.

Гэтая кніга — успаміны колішняга вязьня расейска-савецкіх канцлягераў Юрася Дубовіка. Сьведка мінулай эпохі, аўтар шчыра апавядае пра ўсё, што перажыў, што ведаў, чуў і бачыў. Нягледзячы на цяжкія выпрабаваньні, Юрась Дубовік захаваў сваю годнасьць, пранёс у сэрцы любоў да свае Бацькаўшчыны.

Для шырокага кола зацікаўленых чытачоў.

© Дубовік Ю., 2006
© Наша Будучыня, 2006

## *ПРАДМОВА*

Раньняй вясной 2004 году я пазнаёміўся зь цікавым чалавекам з Краснага, будучым актыўным сябрам нашага грамадзкага аб'яднаньня "Ветэраны Адраджэньня" Аляксандрам Харытонам. Пад час адной з нашых сустрэч спадар Аляксандар згадаў пра свайго родзіча і земляка Юрася Дубовіка, які цяпер жыве ў Салігорску. Інжынэр-будаўнік на пэнсіі, колішні вязень маскоўска-савецкіх канцлягераў склаў храналёгію гісторыі Беларусі, параўноўваючы яе з падзеямі ў суседніх краінах. Адзначыўшы арыгінальнасьць працы, я выказаў прапанову, каб гэты чалавек, які шмат чаго бачыў і ведае, напісаў успаміны. Потым былі тэлефонныя перамовы з Салігорскам, сустрэча ў гасьцінным доме Харытонаў у Красным, супольная паездка ў Маладзечна. Трэба было бачыць, зь якім хваляваньнем Юрась Дубовік пасьля дзесяцігодзьдзяў расстаньня пазнаваў мясьціны юнацтва — дзе працаваў настаўнікам у пачатку мінулай вайны, кватараваў, хадзіў брукаванымі гарадзкімі вуліцамі, дзе сустракаўся з каханай. Наведалі помнік Міколу Ермаловічу, а каля каменя Незалежнасьці ў цэнтры гораду беларускі патрыёт стаў "на зважай".

А на пачатку лета наступнага году рукапіс успамінаў ужо ляжаў на рэдактарскім стале.

Сын сьвядомага беларуса і жаўнера ў арміі генэрала Булак-Балаховіча, гарцэр і навучэнец віленскай гімназіі імя Пятра Скаргі, адзін з адраджэнцаў беларускага школьніцтва ў Маладзечне пад нямецкай акупацыяй, стваральнік і кіраўнік Саюзу беларускай моладзі ў Красным, шматгадовы вязень савецкай імпэрыі, прыроджаны інжынэр і вынаходнік, актыўны ўдзельнік найноўшага беларускага Адраджэньня, клапатлівы бацька, цікавы і дасьціпны суразмоўца, чалавек, які з раньняга дзяцінства маліўся па-беларуску і ўсьведамляў сябе сынам "нашае Радзімы Рэчы Паспалітай Беларусі" - такі ён, Юрась Дубовік, аўтар гэтай кніжкі.

У 1984 годзе нейкі раённы партбос, прачытаўшы беларускамоўны надпіс на надмагільлі маці Юрася Дубовіка, сказаў: "Не зря тебе давали 10 лет". Гэтая рэпліка ці то прыхадня, ці тутэйшага калябаранта сьведчыць, што ў віну Дубовіку закідалася і яго беларушчына. Маскоўска-камуністычны рэжым вынішчаў нашу мову, заганяў пад лёд нематы, зьдзекваўся зь яе, а калі зразумеў несьмяротнасьць — ненавідзеў. Юрась Дубовік у тых выпрабаваньнях не зламаўся, пранёс у сэрцы любоў да сваёй краіны, роднае слова дзеля сваіх нашчадкаў, дзеля незалежнай Беларусі.

*Міхась Чарняўскі*

## *МОЙ РАДАВОД*

Нарадзіўся я 24 ліпеня 1924 году ў вёсцы Канчаны (цяпер Маладзечанскі раён) у доме майго дзеда Рыгора Казла. Дом быў вялікі, і ў ім тады жылі бабуля Ганна — мама маёй мамы, мая мама і маміна сястра Наталіна зь сям'ёй. Дзед Рыгор быў мясцовым жыхаром, а бабуля Ганна - зь Месяты. Бацька яе Мацьвей — сын Івана Сяргея — памёр ад раку, а брат, па імю (як і прозьвішча) — Сяргей, у пошуках лепшага жыцьця паехаў у Амэрыку.

Дзед Рыгор быў непісьменны, ня ўмеў ні чытаць, ні пісаць. Неяк аднойчы яму трапілася торба з паперамі. Прынёс яе дамоў, але вельмі цікава было, што ў гэтых паперах напісана. Каб даведацца, ён хутчэй панёс іх да суседа, які ўмеў чытаць і пісаць. Высьветлілася, што паперы нелегальныя, з падпольным зьместам: жыхароў Красьненшчыны заклікалі далучацца да рэвалюцыянэраў. Адбывалася гэта ў 1905 годзе. Сусед, прачытаўшы тыя заклікі супраць цара, чаго ня мог дазволіць сабе і даравацъ іншым, пайшоў у Краснае і данёс ураднiку. Дзеда Рыгора неўзабаве арыштавалі і пасадзілі ў Вялейскую турму як рэвалюцыянэра. Там яго трымалі больш за год, вялі сьледзтва, дапытваліся пра ягоную рэвалюцыйную дзейнасьць. Аднак нічога не даведаліся, зглумілі шмат паперы, запісваючы ўсё, пра што пыталіся. А Рыгору даводзілася ў канцы кожнага іхнага пісаньня ставіць крыжык, бо ён жа быў непісьменны. За час турэмнага зьняволеньня ён гэтак навучыўся выводзіць крыжык, што многія непісьменныя, убачыўшы, зайздросьцілі яму. Зь нядоказу віны дзед Рыгор быў вызвалены і вярнуўся дамоў.

У дзеда з бабай было чатыры сыны і чатыры дачкі. Яшчэ пры жыцьці дзеда ўсе сыны і дзьве дачкі паехалі на заробкі ў Амэрыку. Тады людзі ў Канчанах жылі бедна. У дзеда была шостая частка валокі зямлі (1 валока — 21 гектар). Шмат хто выяжджаў на заробкі ў замежжа. Марыя, самая старэйшая, пазнаёмілася ў Амэрыцы зь Мікодам Начэвічам. Там яны пажаніліся і вярнуліся на Радзіму. Жылі ў Івонцавічах. Мікода быў добры і старанны гаспадар, і жылі яны добра. Выхоўвалі трох дачок: Вольгу, Ніку і Маню, а таксама сына Ільлюка. Як мяне хрысьцілі, ён стаў маім хросным бацькам. Другая дачка, Ганна, выйшла ў Амэрыцы замуж за летувіса Міхала Таранду, і яны пераехалі ў Летуву. Жылі ў мястэчку Кельме. У іх быў адзін сын Мікалай.

Старэйшы сын Аляксей ня вытрымаў таго ладу жыцьця ў Амэрыцы і яшчэ да рэвалюцыі вярнуўся на Радзіму. Нейкі час жыў у Канчанах, дзе ажаніўся з Хрыстынай, якой вельмі не любіла ягоная

мама. Але гэта не задоўжылася. Аляксея забралі ў войска, а там неўзабаве пачалася вайна. Ён стаў фэльдфэбэлем і кватараваўся ў Віцебску, куды забраў Хрыстыну. Да рэвалюцыі яна нарадзіла яму дзьвюх дачок, Маню і Таню, і сына Сяргея, які потым стаў артыстам і працаваў у тэатры імя Якуба Коласа. Пасьля рэвалюцыі яна нарадзіла яшчэ адну дачку, якая ў 1944 годзе памерла ад сухотаў, і сына Жоржыка — ён, прайшоўшы вайну, працаваў у Вільні таксістам.

Дзядзьку Аляксея два разы судзілі. Пасьля рэвалюцыі ён заставаўся ў Віцебску і бальшавікі паставілі яго як гаспадарлівага і пісьменнага чалавека загадчыкам на нейкіх прадуктовых складох. Аднойчы там выявілі нястачу цэлага вагону солі. Вінаватым зрабілі дзядзьку Аляксея і засудзілі за гэта да расстрэлу. Пакуль разглядалася ягоная просьба аб памілаваньні, знайшлі сапраўдных злачынцаў. Тыя, пакуль састаў знаходзіўся на станцыі, загналі вагон з сольлю ў нейкі тупік, разгрузілі і вярнулі яго як мае быць заплямбаваным назад. Дзядзьку выпусьцілі, але зьнялі з працы. Не пасьпеў ён адысьці ад жаху пасьля першага прысуду, як яго арыштавалі зноў, гэтым разам як царскага афіцэра (ён быў толькі фэльдфэбэлем). Асудзілі за "измену родине" на дзесяць гадоў лягераў. У канцы вайны, ратуючыся ад новых вызвольнікаў, дзядзька Аляксей пераехаў з рэшткамі сваёй сям'і ў Летуву да старэйшай сястры Ганны, дзе й памёр у 1970 годзе.

Малодшы сын Іван вярнуўся ў Беларусь пасьля рэвалюцыі і жыў у Менску. Тры разы жаніўся і ад апошняй жонкі меў сына Алека.

Сыны Сяргей і Нічыпар прыстасаваліся да жыцьця ў Амэрыцы і засталіся там. Стварылі сем'і й гадавалі дзяцей. Жылі добра, дапамагалі бабулі і нам. У Нічыпара была адна дачка Соня, зь якой я перапісваўся, пакуль яна не памерла ў 2002 годзе. Сяргеева жонка Марыя была зь Месяты. У іх нарадзілася дачка Вера. Яны з маткай прыяжджалі ў Канчаны і Месяту ў 1935 годзе. Сыны Джон і Нік жылі бяз выезду ў Амэрыцы.

Зь дзедам Рыгорам здарылася бяда. Аднойчы, гэта было ўзімку 1911 году, дзед пайшоў у Месяту да бацькоў бабулі Ганулі. Трэ' было ісьці празь лес, які тады цягнуўся ад Канчанаў аж да Месяты. Невядома, калі тое адбылося: як ён ішоў туды, ці назад. У лесе ён раптам убачыў зграю ваўкоў, што імчаліся наўпрост да яго. Ён вельмі спалохаўся і кінуўся да дрэва, каб на ім выратавацца, але ўзьлезьці ня мог - зь перапуду пакінулі сілы. Абняўшы дрэва, ён застыў нерухома. Першы воўк падбег да яго, абнюхаў і пабег далей. Усе астатнія зрабілі тое ж самае. Калі небясьпека мінула, дзед сабраўся зь сіламі й вярнуўся ў Канчаны. Падзея гэтая не засталася без наступстваў. Дзед раптоўна захварэў і праз пару тыдняў 1 красавіка памёр.

Бацька мой быў прыежджы, родам з Чапялёў, што на Старобіншчыне. Мой дзядуля па бацьку, Ігнат, таксама ня быў карэнным жыхаром у Чапялёх. Яго, як казалі мне там старыя людзі, прывезла аднекуль тамтэйшая памешчыца. У Чапялёх ён ажаніўся з Агапай. Адкуль яна родам, чыя яна, ніхто сказаць ужо ня мог. У іх былі чатыры сыны і адна дачка. Адзін сын, Рыгор, пакінуў у Чапялёх жонку Параску з дачкой Ганнай і падаўся ў Амэрыку на заробкі. Былі зьвесткі ад яго з Канады, але нядоўга. Нічога болей пра яго невядома. Дачка Васіліса і сыны Іван ды Зьмітрок жылі ў Чапялях. Васіліса выйшла замуж за Ананаса Дыма, і яны выхавалі сына Паўла - вучонага аграномa, і дачку Ліду - настаўніцу. Іван і Аксеня мелі дзьвюх дачок - Зіну і Шуру ды сына Міхася, які ў Другую сусьветную вайну быў у Беларускай самаахове і ў 1943 годзе загінуў пад час барацьбы з бандамі. У Зьмітрака і Алесі быў сын Мікалай, які жыў у Старобіне, і дачка Марыя. Івана і Зьмітра ў 1937 годзе арыштавалі бальшавікі, і далейшы іх лёс невядомы.

Самы малодшы сын Пятрок, мой бацька, нейкім чынам апынуўся ў Заходняй Беларусі ў польскім войску. Ён ніколі не расказваў, які лёс занёс яго ў гэты край. У мяне зьбераглíся некалькі фатаграфій, па якіх можна меркаваць пра гэты пэрыяд ягонага жыцьця. Адна зь іх падпісаная для нейкай "каханай Ясі" 3 красавіка 1921 году ў Вільні. Другая - на ёй 7-я рота Менскіх стральцоў (мабыць, гэта 86-ты полк) — зробленая ў Вільні ў 1921 годзе. Яшчэ ёсьць дзьве фатаграфіі, на якіх група маладых вайскоўцаў, а ўперадзе сядзяць ня простыя жаўнеры — відаць, афіцэры, і дзьве жанчыны. Падобна, гэта курсанты ды іх выкладчыкі. Мяркуючы па гэтых фатаграфіях, па вонкавым выглядзе бацькі ды іншых вайскоўцаў, бацька быў у польскім войску ў Вільні ў канцы 1920 - на пачатку 1921 году. Як ён там апынуўся? Гэтае пытаньне мяне зацікавіла пазьней, толькі тады, калі я стаў зьбіраць зьвесткі пра маіх бацькоў і дзядоў для "Гісторыі нашай сям'і". Я ўспамінаў гады і падзеі з свайго дзяцінства і юнацтва. І ўзгадаў, што ў нас дома, калі мы пераехалі ў Краснае, часта зьбіраліся вайскоўцы з 3-га батальёну 86-га палку, які тады ўжо кватараваўся ў Красным. У асноўным гэта былі падафіцэры. Часта бываў адзін афіцэр, паручнік ці капітан, па прозьвішчы Іваноўскі ці Іваніцкі, а мо' як інакш, але падобна. Звычайна сустрэчы заканчваліся бяседай. Мяне ў гэтую кампанію не дапускалі. Але што забаронена, тое цікава і схавацць ад такіх жэўжыкаў, як я, немагчыма. Яны размаўлялі на беларускай мове і часта ўспаміналі горад Петрыкаў.

Калі я вярнуўся зь лягеру і прыехаў у Слуцак, а затым у Чапялі (дзе жылі родзічы майго бацькі, ад якіх я спадзяваўся атрымаць якую-

небудзь падтрымку), мяне сустрэлі зычліва, як сына Петрака, унука Ігната, якога ўсе вельмі паважалі. Тут я даведаўся, што мой бацька быў у нейкай "бандзе" і калі "нашы" іх разграмілі, яны паўцякалі хто куды. Што гэта была за "банда", ніхто ня мог сказаць. Былі, казалі, "банды" ў Слуцку, на Капыльшчыне, на Палесьсі. Мне тады рабілася вельмі сорамна, што мой бацька — бандыт, але ж, як я яго ведаю, ён на бандыта не падобны. Ён у Красным і ваколіцы славіўся вельмі: добразычлівы, дапамагаў каму парадай, каму чым іншым — як мог. Усе яго паважалі і любілі.

Тым часам я, як і шмат хто, яшчэ нічога ня ведаў пра Слуцкі збройны чын, Булак-Балаховіча ды іншае, пра што нельга было й думаць. Як разваліўся СССР, шмат што стала вядома пра тыя падзеі. Пачаў праясьняцца і сэнс слова "банда", у якой быў мой бацька. Немцы называлі партызанаў "бандай бандытаў", бальшавікі гэтак жа называлі немцаў. Зразумела стала, што і ў дваццатых гадох бальшавікі абзывалі гэткімі словамі ўсіх, хто ім не хацеў падпарадкоўвацца. А паслухмяны, запалоханы народ, у якога іншай інфармацыі не было, верыў, што Слуцкі збройны чын, паход С.Булак-Балаховіча ды іншыя выступы супраць бальшавікоў — ня што іншае, як бандытызм. Дык калі гэта так, то ў якой "бандзе" быў мой бацька? Калі ўлічыць, што на зборках у нас часта ўспаміналі горад Петрыкаў, то пэўна ўсе яны ўдзельнічалі ў баёх у тым раёне, дзе дзейнічаў Булак-Балаховіч, а магчыма, і пад яго штандарамі. У лістападзе 1920 году, калі армія Булак-Балаховіча перайшла мяжу на польскі бок і была раззброеная палякамі, хутчэй за ўсё частка яе была ўлучаная ў польскае войска. У гэтай частцы мог апынуцца і мой бацька. Магчыма, тады й быў сфармаваны 86-ты полк і названы палком Менскіх стральцоў[1].

У час, калі я нарадзіўся, 86-ты полк кватараваўся ў Маладзечне. Там і служыў далей мой бацька, пераведзены зь Вільні.

[1] 86-ты полк Менскіх стральцоў ("стшэльыіаў") сфармаваны ў Менску ў 1919 годзе. - М. Чарняўскі.

## *ЯК МЯНЕ КЛІЧУЦЬ?*

Першыя с пробы неяк назваць мяне былі, без сумневу, адразу пасьля майго нараджэньня. Як хацела назваць мама, ня ведаю, мне яна пра гэта ніколі не казала. Татусь жа вельмі хацеў, каб нарадзілася дзяўчынка. А калі ўсё ж нарадзіўся хлопчык, прапанаваў назваць Палікарпам. З такім намерам панесьлі мяне ў Краснае хрысьціпь. У Красьненскай царкве тым часам служыў айнец Віктар Вошчанка, які незадоўга да гэтага вянчаў маіх бацькоў. Ён заявіў, што такога імя ў ягоным пераліку хрысыціянскіх (праваслаўных) імёнаў няма, і ахрысьціў імем Георгі. Бацькі не пярэчылі волі сьвятара, але дома называлі толькі Юркам, Юрачкам або Юрэчкам. Юрэчкам мяне мамуся звала да самай сваёй сьмерці, калі мне ўжо было 59 гадоў. Помню, калі я крыху падрос, мяне пужалі, што, калі я ня буду паслухмяным, мяне аддадуць кудысьці (ня ведаю куды), а прывядуць замест мяне нейкага Жоржыка. Хто такі Жоржык і чаму я так баяўся гэтае замены, не памятаю.

Ішлі гады. Калі споўнілася сем, мяне павялі ў Краснае ў школку. Беларускіх школак тады ўжо не было, і я мусіў пачынаць навучаньне ў польскай мове. Польскую ведаў, але дрэнна. Дома мы размаўлялі пабеларуску. Мой татусь быў сяржантам у польскім войску, часта браў мяне з сабой да знаёмых, на навагоднюю ялінку ды іншыя імпрэзы. Там размаўлялі па-польску. У школцы мусілі запісаць мае прозьвішча, імя, калі нарадзіўся, як звалі маіх бацькоў, якой я веры. Усе гэтыя дадзеныя я ведаў добра. Дома мяне вымуштравалі як сьлед. Я мусіў сам усё расказаць і для пацьверджаньня паказаць мэтрыку. Дзеля страхоўкі за дзьвярыма стаяла мамуся. З задачай я справіўся пасьпяхова. Мяне прынялі ў другую клясу. Вось толькі імя, якое я назваў і якое было запісанае ў мэтрыцы, выклікала ў настаўніцы незадавальненьне. Прымала мяне Яніна Савінская, полька, жонка польскага асадніка. Яна потым усе пяць гадоў была маёй кляснай кіраўніцай. Савінская заявіла, што ў польскай мове такога імя няма, а яму адпавядае Ежы. Так з згоды маёй мамусі й запісалі. Але ні дома, ні сярод сяброў мяне інакш не называлі, як Юрка, Юрэк, Юрачка. Толькі настаўніпа клікала мяне Ежы, Ежык. Айцец Віктар, які ў нашай школцы выкладаў рэлігію, называў мяне Георгі.

Увосень 1939 году, калі я паступіўу Маладзечанскае пэдвучылішча, безь ніякіх узгадненьняў са мной і не зважаючы на мэтрыку, мне прысвоілі імя Юры. У 1941 годзе пасьля пэдвучылішча я намерыўся прадоўжыць вучобу ў настаўніцкім інстытуце ў Горадні. Дзеля гэтага мне патрэбен быў пашпарт. Увесну я сабраў усе даведкі ды разам з

мэтрыкай здаў у пашпартны стол. Імя сваё запісаў, як у мэтрыцы - Георгі. Перш чым выдаць мне пашпарт, мяне выклікалі да начальніка НКВД[2]. Той узяў мае дакумэнты (яны ўжо былі ў яго), пагартаў іх, задаў мне нейкія пытаньні. Пасьля прачытаў: "Георгий" і дадаў: "Что ты нам здесь церковщину разводишь? Отныне ты будешь Юрий", — і, закрэсьліўшы імя "Георгий", чырвоным алоўкам запісаў "Юрий". Так і выдалі мне тады... ня пашпарт, а даведку, не памятаю - трох- ці шасьцімесячную. Як мне пасьля растлумачылі дасьведчаныя людзі, даведкі замест пашпарту выдаюць "неблагонадежным", а я якраз да такой катэгорыі насельніцтва тады належаў — мой бацька служыў у польскім войску сяржантам, я вучыўся ў польскай гімназіі, быў скаўтам.

На гэтым мае намаганьні вярнуць імя па хросьце — Георгі закончыліся.

[2] Я не памыліўся, назваўшы гэтую арганізацыю НКВД, а ня НКУС, як яе цяпер шмат хто называе. Не памятаю, каб на якой-небудзь мове яе тады называлі інакш.

## *ДЗЯЦІНСТВА*

24 ліпеня 1924 году. Чацьвер. А сёмай гадзіне ў дзедавай хаце пачулі крык дзіцяці. Гэта быў я. Толькі што нарадзіўся. Бацька мой тады служыў у Маладзечне. Невядома, як ён даведаўся, што мама нарадзіла. Тэлефонаў жа не было. Адзін раз на суткі хадзіў цягнік Маладзечна-Аляхновічы. Бацька, відаць, прыяжджаў у Канчаны раз у тыдзень. А мама нарадзіла — і ён тут як тут. Ці прыехаў, ці прыйшоў. Ад Маладзечна да Канчанаў ня так і далека — 16 кілямэтраў. Прыбыў сам, дый з падарункам. Бацька вельмі хацеў, каб нарадзілася дачка, і быў упэўнены, што яго мара спраўдзіцца. Купіў у Маладзечне ўсё ружовага колеру, як для дзяўчынкі. Якое ж было расчараваньне, калі, зьявіўшыся дамоў, ён убачыў немаўля мужчынскага роду. Расказвалі, што ён ня вельмі паказаў сваю разгубленасьць. Ветліва і зь любоўю прывітаўся з мамусяй і малечай. Аднак татусь палюбіў мяне і мы жылі вельмі дружна.

Аднойчы мамуся прыбірала ў хаце. Мне тады было гадоў чатыры-пяць. У пакоі пад вокнамі ля сьцяны стаялі партрэты. Я тады, мусіць, хацеў дапамагчы маме. Неяк атрымалася, што я ўпаў на адзін з партрэтаў. Шкло разьбілася, і я пакалечыў правае калена (знак ёсьць і сёньня). Была кроў, але, напэўна, больш было плачу і крыку. Чым мяне ні суцяшалі, што ні давалі, каб супакоіць, нічога не дапамагала. Нехта надумаў прынесьці ад Ліванаравых мандаліну (на ёй іграў Валодзя Ліванараў). На дзіва, як мне потым расказвала мама, я супакоіўся і доўга брынкаў па струнах. Гэта было маё першае знаёмства з музыкай і музычным інструмэнтам, які я потым даволі добра асвоіў і які, можа, дапамог мне ў цяжкія часы калі ня выжыць, дык хоць палегчыць гэтае выжываньне.

У 1931 годзе я пачаў вучобу ў Красьненскай народнай школцы. Яна знаходзілася цераз вуліцу насупраць праваслаўнай царквы. Кажуць, што ў гэтым драўляным будынку калісьці была царкоўнапрыходзкая школа. Ад нашае хаты, а мы тады жылі яшчэ ў Канчанах, да школкі былі добрыя два кілямэтры, і я хадзіў пехатою зь іншымі хлопцамі й дзяўчатамі. Дома я, як і ўсе ў Канчанах, гаварыў па-беларуску, але ведаў трохі і польскую мову. Гэта, магчыма, паспрыяла таму, што мяне прынялі адразу ў другую клясу. Да таго ж я ўмеў ужо чытаць, пісаць і рабіць простыя арытмэтычныя вылічэньні. Як добра я з гэтым спраўляўся, ня ведаю, але, калі паглядзець маё пасьведчаньне за другую клясу, ад астатніх, хто вучыўся зь першай клясы, я не адставаў. Першай маёй настаўніцай, якя ўжо пісаў, была Яніна Савінская, жонка польскага асадніка. Усе гады маёй вучобы ў гэтай

школцы яна была маёй кляснай кіраўнічкай. У гэтым навучальным годзе памёр кіраўнік школы, ён быў ужо стары. Хавалі мы яго на каталіцкіх могілках усёй школкай. На яго месца прызначылі паляка Яна Невядомскага. Ягоная жонка Ядвіга таксама настаўнічала.

У канцы дваццатых гадоў у Красным справа ўздоўж гасьцінца, як ехаць на Маладзечна, у лесе забудаваўся вайсковы гарадок. Туды перавялі адзін батальён 86-га палку Менскіх стральцоў, дзе служыў мой бацька. На гэтым жа гасьцінпы, але з другога боку, была палоска зямлі майго дзеда Рыгора Казла, якую ў пасаг аддалі маёй маме, як яна выходзіла замуж. Да гэтай палоскі дадалася палоска Ліванаравых і яшчэ чыясьці. Якім чынам усе гэтыя тры палоскі трапілі ва ўладаньне маіх бацькоў, ня ведаю, але атрымаўся вялікі пляц. Пяшчаную і запушчаную зямлю апрацоўваць не было выгады. На гэтым пляцы мае бацькі пабудавалі харошы дом, вялікі каменны склеп, а над ім - вялікі хлеў. На мяжы з суседзямі зрабілі глыбокую, з бэтонных кругоў, студню. У будаўніцтве грашыма дапамагалі нам маміны браты, што засталіся ў Амэрыцы, - Сяргей і Нічыпар. Пераехалі мы ў новую хату ў 1932 годзе. У 1933 годзе на гэтым пляцы бацька пасадзіў вялікі сад — сто яблыняў і адну грушу.

А яшчэ ў 1933 годзе з Маладзечна ў Краснае правялі электрычнасьць і да зімы ў нашай хаце загарэлася лямпачка. Увесну бацька купіў радыёпрыймальнік, што падключаўся ў разэтку. Я ўпершыню пачуў радыё. У садзе паставілі высокі слуп з суцэльнага хваёвага галамня. На ім замацавалі адзін канец антэны, а другі — на слупе ля самага дому. Па радыё можна было слухаць толькі Вільню і Менск. Ня мне аднаму радыё было ў навіну. Да нас часта наведваліся нашыя суседзі, бацькавы сябры і госьці з Канчанаў ды Месяты. Адны хацелі паслухаць Вільню, адкуль нейкі Пясэцкі расказваў пра Савецкі Саюз і ўсё, што там адбывалася ў тыя часы. Другім вельмі цікава было пачуць родную мову, родныя песьні, музыку зь Менску. Пясэцкаму ня ўсе верылі.

Ад 1932 году мы ўжо вучыліся ў другой школцы — новай, што стаяла за царквой. У тым жа годзе пры школцы стварылі гарцэрскую арганізацыю на чале з Гэленай Петчык. У гарцэры прымалі без увагі на нацыянальнасьць і рэлігію. Нацыянальнасьць замоўчвалася — гэта адзін з мэтадаў палянізацыі: усе як быццам палякі. Мужчынская дружына гарцэраў насіла імя Завішы Чорнага, а дзявочая — Эмілі Плятэр. Завішу Чорнага і Эмілю Плятэр лічылі тады польскімі героямі — змагарамі за незалежнасьць толькі Польшчы. Пра іх беларускае паходжаньне і ня згадвалі. Улетку мы хадзілі ў паходы. У 1933-м былі ў Радашкавічах, на мяжы з Савецкім Саюзам. Хацелі пабачыць

бальшавікоў, але, як мы ні крычалі, ніводзін пагранічнік з савецкага боку не паказаўся. У 1934 годзе хадзілі аж за Раёўку. Катя вёскі Старынкі паставілі палаткі і жылі там дзесяць дзён. Вечарамі палілі вогнішча і ля яго сьпявалі, танцавалі, выступалі. Да нас прыходзілі вясковыя дзеці й дарослыя. У Раёўцы наведалі кардонную фабрыку. Пах сьвежага кардону я помню чамусьці і сёньня. У 1935-м былі на зьлёце гарцэраў у Вялейцы. Жылі мы ў палатках у лесе над ракой Вяльлёй. Гарцэраў сабралася шмат, пэўна, з усяго Віленскага ваяводзтва. Мне вельмі спадабаліся выступы вясьлярных дружын гарцэраў на байдарках і на лодках зь ветразямі. На нашай рачулцы Вушы такое немагчыма, і я тады зайздросьціў тым, у каго такая магчымасьць была.

Вучыўся я старанна, хоць і на польскай мове. Праўда, толькі айцец Віктар паставіў мне за першы год тройку па рэлігіі. Ён мяне дакараў і часта лаяў, што я ня так, як трэба, чытаю малітвы. Аднойчы назваў мяне "герэтык ты эдакий". Тады я ня ведаў, што значыць слова "герэтык", але вельмі пакрыўдзіўся, бо быў упэўнены, што гэта нешта вельмі дрэннае. А адбывалася ўсё гэта з тае прычыны, што я аніяк ня мог прачытаць малітву "Отче наш иже еси на небеси...", а чытаў яе па-свойму: "Ойча наш, каторы ёсьць у нябёсах..." Я ня ведаю, хто навучыў мяне маліцца па-беларуску, а маліўся я па звычцы ранкам, перад ядой і перад сном.

## *ВІЛЬНЯ - МАЛАДЗЕЧНА*

Калі я закончыў шостую клясу Красьненскай школкі, бацькі павезьлі мяне ў Маладзечна паступань у гімназію імя Тамаша Зана. Не памятаю, як тое адбывалася, але я не паступіў. Усё лета давялося займацца паўтарэньнем вывучанага ці мо' і недавучанага. Займалася са мной Марыся Казак, студэнтка Віленскага ўнівэрсытэту, родам недзе з-пад Краснага. Улетку яна жыла і харчавалася ў нас. У матэматыцы я быў моцны і паўтараць патрэбы не было. Марыся займалася са мной польскай мовай: граматыкай і правіламі. Яна была рыжая і вельмі настырная. Я яе не любіў, але цярпеў.

Улетку да нас прыяжджала цётка Марыя, жонка брата маёй мамы Сяргея, з дачкой Верай. Татусь мой захапляўся Верай, яна яму замяняла дачку, замест якой нарадзіўся я. Тым летам бацькі заняліся купляй зямлі ў Пяцюлях. Але мяне гэта зусім не цікавіла.

У жніўні бацькі зноў павезьлі мяне паступаць у гімназію. На гэты раз у Вільню. Нехта прапанаваў тады аддаць мяне ў расейскую гімназію, якая яшчэ дзейнічала ў Вільні. Бацька быў супраць. Беларуская гімназія да гэтага часу была зачыненая, а ў дзяржаўнай гімназіі шанцаў на паступленьне мала. Мяне прынялі ў прыватную агульнаадукацыйную гімназію імя Пятра Скаргі. Яна разьмяшчалася на вуліцы Людвісарскай.

Першая мая клясная кіраўніца — Дэмбінская, выкладчыца польскай мовы. Казалі, што яе мужык — камуніст і што ён сядзеў у Віленскай турме на Лукішках. Вельмі ветлівая і зычлівая да ўсіх вучняў, Дэмбінская працавала толькі адзін год. Варта адзначыць, што ўсе пэдагогі ў гімназіі былі ветлівыя, а ўрокі праводзілі вельмі цікава і зразумела. Мы іх мусілі называць "пан прафэсар" ці "пані прафэсарка". Я добра памятаю сваіх выкладчыкаў: нямецкай мовы — Тытэль, лацінскай — Беганьскага, гісторыі - Звольскага, матэматыкі — Навіцкага. Усе яны паводзілі сябе з намі, можна сказаць, пасяброўску. Поўная супрацьлегласьць настаўнікам з Краснага — фанабэрыстым, недасягальным, з залішне высокай думкай пра сваю асобу і пасаду. Усе тры гады рэлігіі вучыў мяне айцец Мароз, родзіч вушанскага папа Мароза, сын якога жыў з намі ў 1937-1939 гадох. У гэтага айца было вельмі добра вучыцца. Ён размаўляў па-беларуску і ня надта патрабаваў.

Усе гімназісты абавязкова насілі адну форму: цёмна-сіні касцюм, белую або блакітную кашулю, цёмна-сіні гальштук і на левай руцэ на пінжаку блакітны шчыток з нумарам гімназіі — 966. Уранку ўсе вучні выстройваліся на калідоры. Дырэктар выступаў з кароткай прамовай

аб навінах у гімназіі і ў краіне. Затым усе сьпявалі малітву "Божэ цось..." і разыходзіліся па клясах.

Штогод на канікулах ад гімназіі праводзілі турыстычныя паездкі. У 1937 годзе езьдзілі на поўдзень Польшчы, у Львоў, Калуш, Ворахту, Ярэмчу. Кіраваў паездкай наш матэматык Навіцкі — украінец родам зь Львова. У 1938 годзе ладзілі паездку ў Летуву. Узначаліў яе сам дырэктар. Я удзельнічаў у адной і другой.

Абавязковым быў удзел у якім-небудзь гуртку. Я наведваў "Чырвоны крыж", а яшчэ - дадатковыя заняткі па замежных мовах. Вывучаў ангельскую. Улетку 1937 году прыяжджаў з Амэрыкі мамін брат Нічыпар. Мяне прымусілі выступіць перад дзядзькам, паказаць сваё веданьне ангельскае мовы. Я чытаў яму нейкі верш. Дзядзька слухаў уважліва, ні разу мяне не перапыніў, а калі я скончыў, пахваліў. Але мне здалося, што ён нічога не зразумеў.

У 1937 годзе ў нашай клясе стварылі струнны аркестар. Яго арганізаваў Люцыян Савіцкі, зь якім мы разам вучыліся. Ён іграў на банджа, я на мандаліне, Хаброўскі на гітары і яшчэ адзін (не памятаю прозьвішча) на скрыпцы. Да зімы мы ўжо сыграліся і выступалі ў клясе і на школьных вечарох.

Першы год у Вільні я жыў у знаёмых Барташэвічаў на вуліцы Паплаўскай. Наступныя два гады са мной у Вільні жыла мама. Мы займалі адзін пакой на вуліцы Сьвятога Яна. З намі жыў сын папа з Вушы — Ігар Мароз. Ён таксама вучыўся ў нашай гімназіі, але на адну клясу ніжэй.

Неяк раз я ня вывучыў гісторыі і Звольскі паставіў мне ў дзёньніку двойку. Дзёньнік мусіла падпісаць мама. Але як наважыцца даць ёй яго на подпіс? Такога ў мяне яшчэ ніколі не было. Я вельмі перажываў. Пра гэта ведаў Ігар, і ён параіў мне купіць нейкую рашчыну, што змывае любыя плямы ад чарніла. Двойку я змыў, але папера дзёньніка засталася шурпатай і мама гэта заўважыла. Стала дапытвацца і плакаць. Я ня вытрымаў і ва ўсім прызнаўся. На другі дзень мама пайшла ў гімназію да Звольскага. Выклікалі мяне. Мама плакала, Звольскі яе супакойваў, а я кляўся, што падобнае не паўторыцца. Я вельмі перажываў.

Але гэта яшчэ ня ўсё. Днямі мусіў прыехаць мой татусь. Набліжалася 23 красавіка — дзень маіх імянінаў (паводле новага календара). Якраз у гэты дзень тата прыехаў у Вільню і ўвечары мы пайшлі ў краму. Раней ён абяцаў купіць на імяніны фотаапарат. Мяне дакарала сумленьне — падзеі апошніх дзён не давалі мне права на якія-колечы падарункі. Мы яшчэ не зайшлі ў фотакраму, і я ня вытрымаў — сказаў татусю, што не заслужыў сваімі паводзінамі

падарунак. Я расплакаўся, а татусь адказаў, што мама яму ўжо ўсё расказала і ён упэўнены, што такое ў мяне больш не паўторыцца. А фотаапарат усё ж купіў, і не абы-які, а самай апошняй мадэлі - "Кодак-Рэтынэ-2". Успамінаючы гэтыя падзеі і татаў мэтад выхаваньня, я міжволі расчульваюся і з вачэй цякуць сьлёзы.

Мой татусь часта бываў па службе ў Вільні. Неяк яшчэ ў самым пачатку ён завёў мяне ў Беларускі камітэт, які тады разьмяшчаўся на вуліцы Міцкевіча. Знаёміцца ў той дзень не было з кім, там было мо' толькі два чалавекі. З адным, маладым, я адразу пасябраваў. У пакоі на сьцяне вісела некалькі музычных інструмэнтаў. Я з дазволу Эдзіка (так звалі гэтага маладога чалавека) зьняў мандаліну і стаў яе настройваць. Эдзік зьняў гітару і падаў мне "ля". (На мандаліне яшчэ ў Красным вучыў мяне іграць Валодзя Ліванараў, ён добра ўмеў і на мандаліне, і на скрыпцы, і на балалайцы, і на гітары.) Мой новы знаёмы, як выявілася, добра іграў на гітары і, калі я пачаў свой улюбёны "Крыжачок", ён хутка падабраў адпаведныя акорды і стаў мне акампанаваць. Так мы пасябравалі, сыграліся і нават аднаго разу выступілі перад катектывам.

Аднаго разу, увесну 1937 году, як звычайна ў нядзелю, я пайшоў у камітэт. Аднак туды ня трапіў — на дзьвярох вісеў замок. Як я потым яшчэ заўважыў, не было й шыльды. Перш я падумаў, што камітэт перабраўся ў другое месца, але нейкая пажылая жанчына, убачыўшы маю разгубленасьнь, сказала, што на гэтым тыдні тут была паліцыя, і яны павесілі заимок і зьнялі шыльду. Калі зноў прыехаў татусь, я яму пра гэта расказаў. Назаутра ён мне сказаў, што палякі закрылі камітэт, і параіў не шукаць і не гаварыць пра гэта анікому, бо я яшчэ малады і нікога не знайду. На жаль, Эдзіка я больш ніколі не сустрэў.

21 чэрвеня 1939 году нам выдалі пасьведчаньні аб заканчэньні чарговага навучальнага году. Сабраліся мы ўсёй клясай і доўга не маглі разысьціся. Як быццам прадчувалі, што шмат з кім больш ніколі не сустрэнемся. Сьпявалі песьні, наш аркестар падыгрываў. Абменьваліся адрасамі і абяцалі пісаць лісты. Разьвітваліся, і было сумна: прадчувалася бяда. Разышліся ўсе, і толькі наш аркестар, а з намі Янка Жэгіш, Аліцыя Эрыксон, Элка (забыўся на прозьвішча) яшчэ доўга блукалі па алеях парку бэрнардынаў. Як стала цямнець, разьвіталіся.

У Вільні мы доўга не заставаліся. На наступны дзень выехалі ў Краснае. З намі паехала, паводле дамоўленасьці з бацькамі, Меця Гард'е, дачка вайскоўца, які даўней служыў з бацькам у Красным. Яна таксама вучылася ў гімназіі імя Пятра Скаргі. Я зь ёй крыху фліртаваў.

У Красным мы прабылі пару дзён і паехалі ў Пяцюлі: там татусь зьбіраўся адсьвяткаваць сваё саракагодзьдзе (29 чэрвеня, на Пятра і Паўла). Тады прынята было адзначаць імяніны, а ня дзень нараджэньня. На сьвята сабратася шмат гасьцей. Былі Жыгліцкія, Капацэвічы, Пагажэльскія з дочкамі, нашыя крэўныя з Івонцавічаў і Канчанаў. Шмат прыйшло маіх аднагодкаў. Было вельмі весела.

Большую частку канікулаў я праводзіў у Красным. У Пяцюлях не было рэчкі і не ставала сяброў. Тыя хлопцы і дзяўчаты, зь якімі я пасябраваў у Пяцюлях, у будзённыя дні займаліся хатняй працай. У Красным я меў больш сяброў, і амаль заўсёды яны былі вольныя. Зь імі я купаўся ля вадапомпавай станцыі, дзе глыбей, чым у іншых месцах нашай рэчкі Вушы. Бывалі дні, што я заставаўся дома і купаўся ў рэчцы ля хаты, але тут было мелка — па калені. Я забіваў калкі ды пераплятаў іх лазой, каб падняць ровень вады. Памятаю, за такім заняткам засьпеў мяне дзядзька Сяргей Ліванараў. Ён пасьвіў кароў за рэчкай і сачыў за мной. "Юрка, ты ня будзеш доктарам. Ты будзеш інжынэрам", — сказаў Сяргей. Ён ведаў, што я мару стаць доктарам. Прадказаньні дзядзькі Сяргея спраўдзіліся.

У гэтым годзе за кашарамі ў лесе пад Касьцюшкамі быў лягер гарцэрак зь Вільні, і я зь сябрам Крываблоцкім панадзіўся езьдзіць туды на ровары. Мы знайшлі там сабе сяброўак: ён - Маню Б., я — Іру Кункевіч. На жаль, вайна перашкодзіла нам сустрэцца ў Вільні.

У жніўні, як штогод, Красьненскі батальён выходзіў на манэўры. Як заўсёды, жонкі і дзеці праводзілі сваіх ваяроў ажно да Месяты, а можа хто і далей. Звычайна да пачатку навучальнага году яны вярталіся дамоў. Сёлета - не вярнуліся. 1 верасьня 1939 году немцы напалі на Польшчу, і Красьненскі батальён, як і ўсё войска, пасьля манэўраў трапіў на вайну. Чуткі пра нашых сваякоў даходзілі самыя супярэчлівыя, часам неверагодныя і нярадасныя. А праз пару дзён над Красным зьявіўся нямецкі самалёт і скінуў дзьве бомбы, але яны ўпалі далека ад вёскі, недзе на Дзёмкавай гары.

17 верасьня польскую дзяржаўную мяжу з усходу перайшлі савецкія войскі. Па абедзе на гасьцінцы, якраз перад нашым домам, спыніўся савецкі танк і зрабіў кулямётную чаргу па кронах бяроз. Ніякага супраціву ў Красным не было. Зьмена ўлады прайшла ціха і спакойна. Зьявіліся некалькі красьненцаў з чырвонымі павязкамі на рукавох і з дубальтоўкамі за плячыма. Адзін зь іх, здаецца па прозьвішчы Заблоцкі, — спэкулянт, некалькі разоў наведваўся да нас, пытаўся, ці не вярнуўся мой тата. А татусь вярнуўся толькі недзе ў сярэдзіне кастрычніка і ў Красным стараўся пакуль не паказвацца. Займаўся гаспадаркай у Пяцюлях.

На пачатку вайны я хацеў ехаць у Вільню, даведацца пра далейшую вучобу, але мама мяне не пусьціла. Яшчэ да прыходу саветаў я ўсё ж паехаў у Маладзечна, але дарэмна — гімназія была зачыненая. У кастрычніку стала вядома, што ў Маладзечне адчыняецца сярэдняя школа і пэдагагічнае вучылішча. Наступная мая паездка сталася выніковай. У драўляным прасторным будынку былой музычнай школы, што побач з будынкам былой гімназіі, ужо працавалі нейкія курсы па вывучэньні беларускай мовы. Я, хоць і з спазьненьнем, запісаўся. Падручнікаў не было, а вывучалі мову па газэтах. Мне такое навучаньне здавалася вельмі нудным і нецікавым. Я ўжо меркаваў кінуць гэтыя курсы, але якраз пачаўся набор у пэдвучылішча.

Прымалі на першы і другі курсы. Мяне залічылі на другі курс, куды ў асноўным траплялі тыя, хто ведаў беларускую мову і да гэтага вучыўся ў гімназіі або яе скончыў. Усе настаўнікі (з выняткам Смольскага - настаўніка музыкі і сьпеваў, які дасюль быў у тутэйшым касьцёле арганістам) - наежджыя з Усходняй Беларусі. Дырэктар Дарафееў — выкладчык гісторыі, геаграфію выкладаў Сяргей Аляксандравіч Дрэйман (як ён часта любіў пажартаваць, "Пушкин наоборот"), матэматыку і яе мэтодыку — Хаюцін, беларускую мову, мэтодыку і пэдагогіку — Пётра Цімафеевіч Бутанаў, беларускую літаратуру — Герчык.

Усе вучыліся добра і старанна, бо прыйшлі не пад прымусам. Сьцяпан Яцукевіч быў закаханы ў гісторыю, я - у матэматыку (улюбёнец Хаюціна). Вайнштэйн — музыка. Ён арганізаваў у пэдвучылішчы духавы аркестар і прыняў мяне, бо я добра ведаў ноты. Я вельмі хацеў іграць на флейце, але яе ўжо нехта заняў, і ён угаварыў мяне асвоіць клярнэт. З студэнтамі першага курсу Аляксандрам Ракам ды іншымі арганізавалі струнны аркестар, і нас, памятаю, узімку на нейкае сьвята адправілі пехатой выступаць у адну вёску. Настаўнік Смольскі арганізаваў пры пэдвучылішчы хор. Неўзабаве ў сваім старым будынку запрацавала музычная школа. Я чуў, як Смольскі з настаўнікам гэтай школы ігралі для сябе Штраўса "Над блакітным, чароўным Дунаем". Адзін — на фартэпіяна, другі — на флейце. Узьнікла і ў мяне жаданьне заняцца музыкай. Іграць на флейце не атрымалася, а на раялі — мяне прынялі. Вучыў мяне Смольскі.

Першы навучальны год быў падоўжаны за кошт скарачэньня канікулаў. Другі навучальны год быў ня менш загружаны. Дадалася пэдагагічная практыка, якую мы праходзілі ў школах Маладзечна і бліжэйшых вёсак. Узімку зьявілася жаданьне і надалей займацца пэдагагічнай адукацыяй. У Горадні тым часам адчынілі Настаўніцкі

інстытут. Ён даваў права сваім выпускнікам выкладаць у 5-7 клясах. Я і мой сябра Яцукевіч пачалі актыўна туды рыхтавацца.

У Маладзечна з Вушы перасяліліся Геня і Поля Талікі зь іхнай мамай. Я сябраваў з Геняй яшчэ ад часу вучобы ў Красьненскай школе. На пачатку 1941 году ўзімку ў Маладзечне пачаўся "хапун". Схапілі і Талікаў. Ужо пагрузілі іх у цяплушкі. Вагоны стаялі ў тупіку на станцыі. Днём я ды некалькі хлопцаў і дзяўчат пайшлі на вакзал. Знайшлі цягнік, які ахоўваўся ўзброенымі вайскоўцамі. Знайшлі і вагон, дзе знаходзіліся нашыя дзяўчаты. Дзьверы вагонаў былі адчыненыя, і мы маглі на адпаведнай адлегласьці свабодна перамаўляцца. Падыходзіць блізка і перадаваць што-небудзь было забаронена. Было халаднавата, і канваіры хадзілі туды-сюды ўздоўж вагонаў. Неяк здарылася, што канваір прайшоў у другі бок і не заўважыў, як Геня і Поля выскачылі з вагону і ўпалі. Мы кінуліся дапамагчы ім устаць. Канваір пачуў мітусьню, разьвярнуўся, ляснуў затворам вінтоўкі і крыкнуў: "Отходи от вагона. Стрелять буду!" Мы паслухаліся, але з намі адышлі і Геня з Поляй. Перш мы ня ведалі, што рабіць далей. Мама нашых дзяўчат пачала крычаць, каб яны ўцякалі і неадкладна выяжджалі ў Львоў, там у іх, мабыць, былі родзічы ці добрыя знаёмыя. Дзяўчаты хваляваліся, ня ведалі, што рабіць, бо і матку пакідаць было шкала. Ужо зьмяркалася, і трэ' было адыходзіць ад вагонаў далей. Пагадзіўшыся зь лёсам, дзяўчаты з плачам разьвіталіся з мамай і пайшлі з намі, а праз пару дзён выехалі з Маладзечна. Пра датейшы іх лёс я, на жаль, нічога ня ведаю.

Увесну пачаліся экзамэны. Я здаваў усё бездакорна. Заставалася толькі пэдагогіка, але...

## *ПАД НЯМЕЦКАЙ АКУПАЦЫЯЙ*

22 чэрвеня 1941 году. Нядзеля. У сераду 25 чэрвеня мае быць апошні экзамэн у пэдвучылішчы па пэдагогіцы. Я да экзамэну гатовы. Крыху паўтару ў панядзелак і аўторак, а сёньня ў нядзелю па дамове з канчанскімі хлопцамі і дзяўчатамі пойдзем у Сьніткаў лес па суніцы. Уранку я ўжо быў у Канчанах. Бабулька сказала, каб доўга ў лесе ня бавіўся і да абеду быў дома. Яна абяцала сьпячы "мядзьведзя" — гэта бабка з таркаванай бульбы. Яна ў маёй бабулькі атрымоўвалася вельмі смачная. Сабралася нас пяцёра ці, можа, болей, і пайшлі мы аж пад Сурымты. Там ведалі добрыя мясьціны на суніцы. Такой кампаніяй у лесе заўсёды весела. Да абеду, як было наказана, вярнуліся ў Канчаны з суніцамі, весела шчабечучы і не адчуваючы стомы. Але як падыходзілі ўжо да бабульчынай хаты, заўважылі, што на вуліны Канчанаў і далей на гасьцінцы ў Красным нейкі не зусім звычайны для нядзелі рух. Зайшоўшы ў хату, даведаліся, што пачалася вайна. "Мядзьведзя" ўсё ж зьелі з апэтытам.

Доўга ў Канчанах я не заседжваўся. Цікава было хутчэй трапіць дадому, дзе можна было болей даведацца пра падзеі гэтага дня, тым больш што ў нас яшчэ было і працавала радыё. У нас жыла Вольга Ліванарава, якая выйшла замуж за лейтэнанта Аляксея Каралькова. Калі я вярнуўся дамоў, мама мая была ў паніцы, Вольга плакала, Каралькова ўжо не было. Вельмі сьпешна яго і другіх адклікалі ў вайсковы гарадок. Я зайшоў да Антона Капцюга, зь якім сябраваў і які жыў цераз адну хату. Ягоная сястра Маня таксама была замужам, за лейтэнантам Віктарам Уваравым - фэльчарам. Яна таксама плакала, бо і яе мужыка пасьпешліва адклікалі ў гарадок. Па радыё зь Менску амаль бесьперапынна гучала маршавая патрыятычная музыка зь перапынкамі на кароткія зводкі і заклікі тыпу "врага будем бить на его территории" ды іншыя падобныя да гэтага.

У зале ў нас жыў палітрук, ці камісар, з жонкай і дачкой. На пятліцах у яго былі дзьве шпалы. У панядзелак да нашага дому пад'ехала грузавая машына. Кватаранты хутка пагрузіліся і ад'ехалі, яшчэ захапіўшы наш радыёпрыймальнік. Рух машын па гасьцінны ў кірунку Менску павялічваўся з кожнай гадзінай. Але нас, маладых, гэта мала цікавіла. Мой татусь увесь гэты пераходны пэрыяд быў у Пяцюлях, а я з мамусяй былі ў Красным.

Дні стаялі вельмі цёплыя, і мы амаль увесь час праводзілі на рэчцы. У аўторак я, Антон Капцюг, Болек Крываблоцкі і другія купаліся і загаралі на рэчцы каля вадапомпавай станцыі. Адтуль пампавалі ваду для запраўкі паравозаў і таму там было глыбей, чым у

іншых месцах. Савецкай улады ў Красным ужо не было. Казалі, што немцы пад Маладзечнам. Але ў Красным іх яшчэ не было. Ад вадапомпавай добра была відаць пякарня (былая Награбэцкага). Каля пякарні ўжо таўкліся нейкія людзі. Потым пад'ехалі двое ці трое калёсаў. Дзьверы ў пякарню выламалі і пачалі выносіць муку ў мяхох і грузіць на калёсы. Раптам над Красным зьявілася некалькі самалётаў. "Нашы, нашы", — закрычалі каля пякарні. А гэтыя "нашы", заўважыўшы ля пякарні рух людзей, узяліся страляць па іх з кулямётаў. Ці пацярпеў хто ад гэтага, ня ведаю. Усе разьбегліся хто куды. Але, пераканаўшыся, што небясьпека мінула, сталі вяртацца і прадоўжылі рабаваньне.

Прайшло некалькі дзён, моʼ тыдзень ці болей, і ў Красным сабралі моладзь. Зьбіраў нейкі незнаемы мне чалавек. Нас сталі прымушаць выконваць розныя работы. Усе жылі і харчаваліся дома, а на працу хадзілі па раскладзе. Мне выпала ахоўваць у асноўным ноччу аптэку Бартлеўскіх, або тую ж пякарню, дзе да гэтага часу ўжо, можа, нічога не засталося. Аднаго разу вартаваў дом, дзе пры паляках разьмяшчалася камандаваньне 10-га багальёну КОП[3], а цяпер быў нейкі пакінуты бальшавікамі склад. На ахову пасылалі па два чалавекі. Звычайна мы знаходзілі паблізу ахоўнага аб'екту месца, дзе можна было схавацца ад дажджу, ад начнога халадку і ад рабаўнікоў, што маглі яшчэ насьмеліцца пралезьці на аб'ект. На нашае шчасьце, такога не здаралася, але каб і здарылася, я ня ведаю, што б мы маглі зрабіць. Дзённая варта была меней небясьпечнай. У гэткіх заробках я прабыў, можа, дзён дзесяць. Відаць, бацька ці маці выпрасілі звольніць мяне ад гэтай работы. Я заставаўся дома ў Красным або езьдзіў у Пяцюлі. Праз тры гады сьледчы палічыў гэта за маю добраахвотную працу ў паліцыі і барацьбу з партызанамі. А ў тым часе яшчэ ніхто нічога ня чуў пра партызанаў і пра беларускую паліцыю.

Аднаго разу я зьезьдзіў у Маладзечна. Думаў, можа, хто застаўся ў пэдвучылішчы і падкажа, што рабіць далей. Але ні ў пэдвучылішчы, ні ў Маладзечне я нікога знаёмага не сустрэў. У жніўні пайшла чутка, што ў Беларусі будуць адчыняць беларускія школы. У другой палове жніўня да мяне прыехаў у Краснае мой сябра па вучобе ў пэдвучылішчы Аляксандар Рак, мы яго звалі Шурка. Між іншага, мы абмеркавалі і наш удзел у адкрыцьці школы. Праз пару дзён я быў у Маладзечне. Там ужо працаваў бухгальтарам у нейкай гандлёвай установе мой дзядзька Іван. Ён жыў на вуліцы Міцкевіча, за бальшавікамі перанazванай у вуліцу Пушкіна, на першым паверсе двухпавярховага дому. Я пасяліўся ў яго. У Маладзечне тым часам ужо быў павятовы

[3] Корпус аховы памежжа ("Корпус охроны пограніча").

школьны інспэктар. Я з Ракам зьвярнуліся да яго ў справе працаўладкаваньня настаўнікамі. Ён нас нічым не парадаваў. Сказаў, што гарадзкая рада выдзеліла памяшканьне для школы, але кіраўніка школы яшчэ няма і з настаўнікамі будзе праблема. Старых вопытных настаўнікаў у Маладзечне няма. Тых, што вучылі за палякамі, не было: яны або самі выехалі ў Польшчу, або бальшавікі вывезьлі іх у другі бок. Савецкіх, што зьявіліся пасьля верасьня 1939 году, таксама не было, паўцякалі. Параіліся мы і намерыліся шукаць тых, хто вучыўся ў пэдвучылішчы. Знайшлі Сьняпана Яцукевіча, я ўспомніў, што на Вялейскай вуліцы калісьці жылі дзьве настаўніцы - сёстры Рымшы. Зрабіў да іх візыт — і не дарма. Яны вельмі ўзрадаваліся і абяцалі нам падтрымку. Параілі мне зайсьці да Бельскай, якая жыла непадалёк адна. У мінулым яна была настаўніцай. Я загаварыў зь ёю па-беларуску, хоць ведаў, што яна палячка і працавала ў польскай школе. Якое было мае зьдзіўленьне, калі пачуў у адказ згоду памагаць нам на добрай беларускай мове. Рак зь Яцукевічам сустрэлі Ганну Гулевіч, а я зь яе дапамогай і Шарко (не памятаю, як звалі). Аднекуль да нас прыстаў яшчэ Леанід Сурнін. Ён ня ведаў беларускае мовы, але стаўся добрым сябрам і заўзятым прыхільнікам нашае справы.

Дамовіліся сустрэцца ўсе ў будынку, які гарадзкая ўправа выдзеліла пад будучую школу. Там, відаць, і раней была школа. Цяпер засталіся толькі сьцены, страха, падлога і дзе-нідзе ваконныя рамы бяз шыбаў. Сьцены абшарпаныя, на падлозе бруд. Настрою ў нас паменела. Ды не абышлося без гумару. Ад імя няіснай дырэкцыі і пасыўнага інспэктарату Аляксандар Рак запрасіў усіх у настаўніцкі пакой. Зайшоў сам, а за ім астатнія, у першы пакой. Ён дадаў, што, магчыма, сярод нас крочыць і будучы дырэктар. Дамовіліся прайсьці, пакуль што якое, па дамох Маладзечна да чыгуначнага пераезду і па Вялікім Сяле. Расказаць людзям аб становішчы нашай школы, а заадно скласьці, хоць і прыблізныя, сьпісы будучых вучняў. Праца ў кожным разе неабходная, хто б ні быў кіраўніком школы. Эфэкт атрымаўся нечаканы. У школу сталі завозіць аконныя рамы, некаторыя ашклёныя, дзьверы і нават парты. У некага прачнулася сумленьне і сталі вяртаць забранае. Рабавалі ж у сваіх дзяцей. Сярод бацькоў знайшліся добраахвотнікі цесьлі, якія адразу ж пачалі дапасаваньне аконных рамаў, дзьвярэй. Зьявіліся маляры, шкляр. Вельмі актыўна дапамагалі дзеці, якія запісаліся ў школу.

Шмат бракавала шкла, не было партаў. Выканаўца абавязкаў інспэктара і гарадзкая рада нічым у нашай працы не памаглі, у іх проста нічога не было. Тады мы наважыліся праявіць і сьмеласьць, і нахабства. Пастанавілі зьвярнупца да Маладзечанскага ортскаман-

данта. Прагаласавалі аднадушна за мяне і за Рымшу, бо мы хоць крыху ведалі нямецкую мову. Заадно хацелі выведаць, як камандатура ставіцца да нашае справы і чым яны ўвогуле могуць нам памагчы.

Выявілася, на нашую радасьць, што ортскамандант вельмі добразычлівы. Яму вельмі спадабалася, што мы зьвярнуліся да яго панямецку без дапамогі перакладніка. Яшчэ, можа, нашай справе паспрыяла тое, што зьвярталіся да каманданта добра пажылая настаўніца і зусім малады настаўнік. Ён паабяцаў ня проста даць, а завезьці некалькі скрынак шкла і паспрыяць нам у аглядзе памяшканьня пэдвучылішча (ранейшай гімназіі). Мы выйшлі ад яго радасныя, хаця ня вельмі верылі ў абяцанкі. Якое ж было нашае зьдзіўленьне ды яшчэ большая радасьць, калі ўранку мы агледзелі ўжо разгружаныя і занесеныя ў памяшканьне пяць ці мо' і болей скрынак з шклом. Сусед па школе, які ўзяўся даглядаць яе, гаварыў, што ўвечары на машыне прывезьлі і разгружалі чалавек пяць.

Не забыўся ортскамандант і пра пэдвучылішча. Праз пару дзён даў двох немцаў, а я ўзяў некалькі вучняў з бацькамі. У пэдвучылішчы нас даволі падазрона і непрыязна прыняў другі камандант. На другі паверх нас не пусьцілі. Не пусьцілі і ў большасьць клясаў першага паверху. А вось падвал і сьметнік аддалі ў поўнае карыстаньне. Тут мы сабралі шмат (праўда, паламаных) партаў, клясных дошак, крэйды, розных кніжак і нават клясных журналаў. Усё гэта на падводах перавезьлі ў школу. Пазьней з гэтага "кніжнага фонду" я выбраў падручнікі беларускай мовы, батанікі, заалёгіі, анатоміі й фізыялёгіі, кожных штук па пяць, а гэта ўжо скарб для настаўніка. Выбралі там і кнігі па літаратуры, матэматыцы ды іншыя, якія маглі б дапамагчы нам у навучаньні, хоць яны і савецкага выданьня.

Да сярэдзіны верасьня мы падрыхтавалі для навучаньня шэсьць пакояў: настаўніцкі і пяць клясных, у якіх сабралі па дзесяць-пятнаццаць партаў. Трэба адзначыць тую самаахвярнасьць, зь якой працавалі настаўнікі, бацькі і вучні. Я ні разу ня чуў, каб хто-небудзь хоць раз абмовіўся пра аплату за іх працу.

Ледзь ня шокам стала для нас вестка, што ніякіх пастановаў пра адкрыцьцё школ у Беларусі яшчэ не было. Былі толькі хадайніцтвы ксяндза Гадлеўскага і абяцаньні нямецкіх уладаў. Якраз гэтым часам у Маладзечне зьявіўся новы энэргічны школьны інспэктар Магер і ня менш ініцыятыўны і дзейны кіраўнік нашае школы А. Яворскі. Яны нас усьцешылі, што патрэбная пастанова аб адкрыцьці ў Беларусі школ падпісана ў сярэдзіне верасьня і нашая праца не прапала дарма.

Заняткі пачаліся зь першых дзён кастрычніка. Усю каманду, што працавала на адбудове школы, пакінулі працаваць у школе. Я стаў кіраўніком пятае клясы і выкладчыкам у пятай клясе батанікі, у шостай — заалёгіі й фізыкі, у сёмай — анатоміі й фізыялёгіі, а таксама фізыкі.

Аднак не пасьпелі мы правучыць два тыдні, як школу зачынілі. У Маладзечне зьявілася пагроза тыфу, і ўсіх настаўнікаў замацавалі па вуліцах, дзе нас абавязалі наведваць дамы і выяўляць захворваньне тыфам. За мною быў замацаваны правы бок вуліцы, што ішла ад рынкавай плошчы да чыгуначнага пераезду. Я сам напрасіўся на гэты ўчастак. Тут жыла Воля Бубен, якая мне вельмі падабалася. Мне была прычына часта бываць у яе дома. На гэтай вуліцы жыў мой дзядзька Іван з жонкай. Ён працаваў у нейкай гандлёвай канторы бухгальтарам. Дзядзька займаў адзін пакой у доме, што стаяў воддаль ад вуліцы ў агародзе. У другім пакоі жыў я, Рак, Яцукевіч і Сурнін. У доме гэтага ж гаспадара, які стаяў пры вуліцы, жыў наш школьны інспэктар Магер.

Харчаваліся мы ў сталоўцы Беларускай самапомачы, якую ў Менску ўзначальваў Ермачэнка. Акрамя таго, нам давалі талёны ў краму. Там мы атаварваліся па меры наяўнасьці тавару. Нам давалі хлеб, соль, махорку ці цыгарэты, цукар, гарэлку. Гарэлкі мы не пілі, можа толькі адзін раз на месяц. Лішнюю мянялі на хлеб, цукар.

Пры канцы красавіка на даручэньне інспэктара Магера я вазіў у Вялейку ў акружны інспэктарат нейкі пакет. Пошта не працавала. Мне далі каня. На зваротнай дарозе сапсавалася надвор'е. Узьнялася сьнежная завіруха, стала халодна, а я быў апрануты лёгка. Празь некалькі дзён забалела левае вуха. Доктар, да якога я зьвярнуўся па дапамогу, сказаў, што гэта запаленьне сярэдняга вуха і прыпісаў мне таблеткі і кроплі ў вуха. У школу я пакуль не хадзіў. Ад болю не знаходзіў месца. Ня спаў ні ўдзень, ні ўначы. Можа, праз тыдзень ці болей нарыў у вуху прарваўся. Боль крыху сьціх, але гнаіцца не пераставала і стала балець за вухам. Доктар сказаў, што гэта мастаідыт, што трэба рабіць апэрацыю, а гэта могуць толькі ў Менску ці ў Вільні. Я выбраў Вільню, бо там у мяне шмат сяброў і сустрэча зь імі была б мне на карысьць і маральна, і матэрыяльна. Накіраваньне ў Вільню выпісаў ортскамандант Маладзечна, даў пропуск туды мне і маёй маме. У віленскай больніцы я прабыў да сярэдзіны чэрвеня.

Вярнуўшыся ў Маладзечна, я засьпеў усіх сяброў на месцы, хоць вучоба ў школе закончылася. Яны ўсе займаліся, як мне сказалі, у настаўніцкай сэмінарыі. Заняткі праводзіліся ў будынку былога пэдвучылішча. На другі ж дзень і я запісаўся. На занятках чыталі нам

лекцыі з гісторыі Беларусі, беларускай літаратуры і граматыкі. Усё, што мы чулі там, было вельмі цікава. Мы даведаліся шмат чаго, што ад нас хавалі або перакручвалі на сваю карысьць палякі ды бальшавікі.

20 жніўня паехаў у Вільню на праверку, як рэкамэндаваў мне зрабіць хірург, што апэраваў мяне, — доктар Паканайціс. Мяне яшчэ раз паклалі ў больніцу, на гэты раз толькі на тыдзень. Тады я даведаўся, што ў Вільні зноў працуе Беларускі камітэт — у тым жа, што й раней, памяшканьні. Пасьля выпіскі з больніцы я зайшоў туды, але там былі ўсе новыя, незнаёмыя. Пацікавіўся, ці ня ведаюць майго старога сябра-гітарыста Эдзіка. Яны пра яго нічога ня чулі. Параілі мне зайсьці ў Беларускую кнігарню, якая знаходзілася ў самым пачатку вуліцы Субач. Там я набраў добрыя два пакункі - ледзь панесьці — кніг.

У Маладзечна прыехаў уначы з 3 на 4 верасьня і давялося начаваць на вакзале з прычыны камэнданцкага часу. Уранку, калі прыйшоў дамоў, не было ні дзядзькі Івана, ні ягонай жонкі, а нехта з маіх хлопцаў сказаў, што яны паехалі ў Краснае і што мне тэрмінова трэба туды ехаць. Прычыны не сказалі. Я захваляваўся і неадкладна паехаў дамоў у Краснае. Сустрэла мяне мама з плачам. Ажно ўчора пахавалі майго татуся. А здарылася вось што. Мой татусь 1 верасьня начаваў з мамай у Пяцюлях. Ноччу наляцелі бандыты. Рабавалі, што хацелі. Мой бацька, мабыць, супраціўляўся, і яны забралі яго. Хацелі забраць і маму, але яна пасьпела схавацца.

Два дні пра тату нічога не было вядома. Мама з Іванам і суседам Шумскім хадзілі, шукалі. Пад вечар другога дня пастухі падказалі, што ў лесе за вёскай Сыцавічы ляжыць забіты чалавек. Мамуся яго адразу пазнала па руцэ. У майго таты на левай руцэ на сярэднім пальцы быў адростак, як быццам маленькі пальчык. Твар быў увесь разарваны стрэлам у патыліцу. Уранку цела прывезьлі ў Краснае і, паколькі яно ўжо раскладалася, пасьля полудня пахавалі "пад Юр'ем", побач зь дзедам Рыгорам.

Пасьля гэтых падзеяў маёй маме было б цяжка заставацца адной. Мне трэ' было вяртацца ў Краснае. Таму я паехаў у Маладзечна і звольніўся. Цяжка было разьвітвацца зь сябрамі. Хто ведае, як мяне прыме калектыў настаўнікаў у Красным. Але мае хваляваньне было дарэмнае. Кіраўнік школы Невядомскі сустрэў мяне зычліва, настаўнікі паставіліся з павагай. Калектыў пэдагогаў у Красным складаўся ў асноўным з ацалелай мясцовай інтэлігенцыі: Іван і Тацяна Паплаўскія, Баслык з жонкай, Кабжоў з сынам, Віктар Ількевіч, Тарлоўскі, ну і сам Невядомскі — душой адданы пэдагогіцы, выхаваньню дзяцей. Мне

далі трэцюю клясу. Вучні трапіліся вельмі старанныя, і працаваць зь імі было лёгка. Мы вучылі ў будынку, дзе за палякамі разьмяшчаўся духавы аркестар памежных войскаў, а за першымі бальшавікамі было "заготзерно".

У тым годзе я нікуды, акрамя Маладзечна, ня езьдзіў. А туды мяне цягнула мая дарагая дружба, і хацелася, хоць рэдка, сустрэцца з Воляй Бубен. Рак, Яцукевіч і Сурнін жылі ў тым жа пакоі. Магер таксама жыў на старой кватэры, але ўжо не адзін: зь ім жыў Камароўскі — музыка, піяніст, кампазытар. Яго ўдалося вызваліць зь лягеру ваеннапалонных, што разьмяшчаўся ў Маладзечне. Камароўскі быў вельмі інтэлігентны чалавек. Ён надта любіў музыку. Заўсёды пасьля каманданцкага часу, калі бываў у Маладзечне, я гасьцяваў у іх. Камароўскі ладзіў цэлыя канцэрты. Магер і Рак ігралі на скрыпках, за піяніна сядзеў Камароўскі, а мне давалі ноты і прымушалі іграць на мандаліне. Без папярэдняй рэпэтыцыі, безумоўна, у мяне было ня ўсё гладка, але Камароўскі не злаваў. Ён, як мне здаецца, мандаліну не лічыў за сур'ёзны музычны інструмэнт, але даваў дамоў ноты, каб я да наступнай сустрэчы мог падрыхтавацца. Гралі мы тады, што памятаю, Шубэрта, Моцарта, Чайкоўскага, Штраўса: "Калыханку", "Троймэрай" (летуценьні), "Танец лебедзяў", "Венскую кроў", "Над блакітным, чароўным Дунаем" ды іншае. Усё гэта пазьней з маёй ініцыятывы гралі мы ў самадзейным аркестры ў лягерах Інты, Ілезы, Кулоя.

У Красным да мяне часта прыходзіў Валодзя Старыкевіч (не Ільлёў сын, ягонага бацьку звалі інакш). Ён добра іграў на гітары і мы прайгравалі тое, што мне задаваў Камароўскі, а таксама нашыя ўлюбёныя танцы — "Крыжачок", "Лявоніху", "Янку". Неяк праз Краснае праходзіла вайсковая часьціна славакаў і ў нашым доме кватараваўся іхны маёр. Ён чуў, як мы граем, і пачаў далучацца да нас. Як выявілася, ён па-майстэрску йграў на губным гармоніку.

У школе справы ішлі добра. Мне вельмі дапамагалі тыя кніжкі, што я прывёз зь Вільні, імі пачалі карыстацца й іншыя настаўнікі. Навучальны год закончыўся без асаблівых падзеяў.

Дома бяз бацькі было пяжка. Мама яшчэ гадавала парсючка і, здаецца, нейкі час у хляве стаяла карова. Нам вельмі шмат памагаў сын цёткі Наталіны Іван. Ён арганізоўваў збор ураджаю і перавоз яго ў Краснае. У Пяцюлі я маму не пускаў. Увесну 1943-га мы там ужо нічога не садзілі. Хапала працы і ў нашым садзе. Была бульба, былі й градкі.

Аднойчы на пачатку ліпеня 1943 году да мяне дамоў зайшоў мой сябар Юзік Кавальскі зь нейкім, на першы погляд незнаемым,

чалавекам. Той быў апрануты у зялёную форму з пагонамі, на якіх зіхацеў серабрысты квадрацік, ці мо' нават два, а на руцэ была бел-чырвона-белая павязка. Пасьля я пазнаў яго, сустракаўся зь ім у Вялейцы, кал і езьдзіў туды ў 1942 годзе з даручэньнем ад школьнага інспэктара. Гэта быў Петра Сьценьнік, цяпер ужо акруговы праваднік Саюзу беларускае моладзі. Пра СБМ у той дзень я йшчэ нічога ня ведаў. Ні радыё, ні пагатоў тэлевізара ў мяне тады не было. А на канікулах настаўнікі сустракаліся рэдка, не заўсёды трапляла і газэта. Неяк раней казалі пра моладзевую арганізацыю ў Глыбокім, але, пераехаўшы ў Краснае, я пра яе болей нічога ня чуў. Мае госьці, Кавальскі і Сьценьнік, паведамілі, што 22.06.1943 афіцыйна абвешчана пра стварэньне Саюзу беларускае моладзі. Далі мне стос папераў, газэт ды іншай літаратуры і прапанавалі заняцца арганізацыяй СБМ у Красным. Кавальскі ўжо быў прызначаны павятовым кіраўніком Саюзу ў Радашкавічах. Я згадзіўся.

З чаго было пачынаць? Ніякіх курсаў я не праходзіў. У пэдвучылішчы вучылі пэдагогіку, мэтодыку навучаньня асобных прадметаў, а пра арганізацыю гурткоў, пра такую працу з моладзьдзю нічога не было. Стаў успамінаць, як арганізоўвалі дружыны гарцэраў. Паводле гэтага узору я рыхтаваўся рабіць і ў нашай школе цяпер. Безумоўна, вывучыў статут і ўсе прывезеныя мне матэрыялы. Пры сустрэчы зь сябрамі і з вучнямі вёў размову пра новую арганізацыю. Знаходзіў шмат прыхільнікаў, але ахвотнікаў напісаць заяву было мала.

Неяк успомніў, што ў Жыгліцкай, сяброўкі маёй мамы, апошнім часам перад вайной жыла наша дружыновая гарцэраў Гэлена Петчык. Падумаў, што, можа, яна пакінула там якую-небудзь літаратуру, дапаможнікі па арганізацыі моладзі, і не памыліўся. Жыгліцкая заўсёды ветліва і зычліва ставілася да мяне, і на гэты раз яна мне памагла. Петчык пакінула цэлы куфар кніжак і сшыткаў, якія пасьля арышту яе бальшавікамі гаспадыня зацягнула на гарышча. Яна сама дапамагла мне ўсё дастаць. Дадому я ўсё перанёс разы за тры ці чатыры.

Здабытак быў багаты, але часу на вывучэньне заставалася зусім мала. Перш за ўсё я перабраў і расклаў літаратуру па прыдатнасьці для мяне на дадзеным этапе. Адклаў самае патрэбнае, на маю думку, для далейшай працы. Але і гэта за адзін месяц жнівень нельга было нават збольшага перагартаць.

У канцы жніўня Кавальскі прывёз 15 камплектаў формы СБМ, у асноўным яна была малых памераў. Самую большую мая мама з Вольгай Ліванаравай падагналі пад мяне, і першы дзень пасьля канікулаў я пайшоў у школу ва ўніформе. Я меў таксама пасьведчаньне грамадовага СБМ, на пагонах насіў два лычкі. І яшчэ адна навіна датычыла

мяне. Два разы на тыдзень увечары мне неабходна было хадзіць на станцыю да прыходу цягніка, які праходзіў штодня зь Менску ў Маладзечна, а мо' і далей. Я мусіў быць у форме СБМ і з пасьведчаньнем. З кабіны паравоза мне перадавалі пад росьпіс газэты й часопісы. Звычайна гэта былі 25 газэт і раз на месяц 5 часопісаў "Жыве Беларусь!"[4]. Часопісы я дзяліў такім чынам: адзін пакідаў сабе, адзін перадаваў кіраўніку школы Невядомскаму, а тры па чарзе даваў юнаком і юначкам СБМ, а пасьля й іншым вучням.

Школьны год як заўсёды пачаўся 1 верасьня. Я працягваў вучыць сваю клясу, цяпер ужо чацьвертую. У першыя дні па дамове з кіраўніком школы я сабраў усіх вучняў, настаўнікаў і расказаў ім, што на мне за форма і пра новую арганізацыю. Прасіў настаўнікаў дапамагчы мне, а вучням прапанаваў уступіць у Саюз беларускае моладзі, але перш параіцца з бацькамі, каб не было канфліктаў. Усіх ахвотнікаў я папрасіў прыйсьці ў нядзелю ў школу з бацькамі. Сабралася шмат бацькоў і вучняў. Заявы на ўступленьне напісалі амаль 20 хлопчыкаў і больш за 10 дзяўчынак.

З гэтага дня пачаліся рэгулярныя зборкі, але толькі па нядзелях, бо вучыліся мы ў дзьве зьмены і для пазакляснае працы месца не было. На зборках мы вывучалі найважнейшыя падзеі з гісторыі Беларусі, беларускай літаратуры, сьпявалі песьні: "Мы выйдзем шчыльнымі радамі", "Не пагаснуць зоркі ў небе", "Люблю наш край", "У гушчарах, затканых імглою", "Мы сёньня першыя паўсталі", "Зорка Венера" ды іншыя. Адна дзяўчынка вельмі хораша сьпявала "Ой не кукуй зязюля", яе, відаць, нехта навучыў дома. Я сам сьпяваць ня мог. На нашыя сустрэчы прыносіў мандаліну і граў на ёй, а юнакі падпявалі. Часта прыходзіў юнак Мешкуць з цымбаламі, тады мы йгралі ўдвох, а часам і ўтрох, як заходзіў мой сябар Валодзя Старыкевіч з гітарай. Разам мы любілі выконваць беларускія танцы: "Лявоніху", "Крыжачок", "Юрачку", "Бульбу". Тады ў нашых юнакоў ногі самі пачыналі тупаць, а ў нас зьявілася ідэя развучыць хоць адзін танец. У гэтым нам дапамагла маладая настаўніца Паплаўская (імя забыўся). Абавязковымі былі ў нас заняткі на сьвежым паветры і шыхтовае вучэньне. Да вясны ў нас ужо былі два бел-чырвона-белыя сьцягі з вышытымі на іх ромбамі — эмблемамі Саюзу беларускае моладзі. Гэта зрабілі нашы юначкі з дапамогаю сваіх бацькоў.

У той час у нашым доме кватаравалі два пажылыя нямецкія падафіцэры, якія працавалі ў вайсковым гарадку. З намі яны жылі дружна і дапамагалі, чым маглі. Аднаго разу прынесьлі мне сотні дзьве

---

[4] Друкаваны орган Саюзу беларускай моладзі.

сшыткаў і шмат алоўкаў. Гэта дало магчымасьць усім юнаком завесьці дзёньнікі СБМ, а іншым вучням — школьныя сшыткі.

25 сакавіка на спартыўнай пляцоўцы школы, што за царквою, быў арганізаваны мітынг з нагоды гадавіны абвяшчэньня Беларускай Народнай Рэспублікі. Узгадніўшы з ортскамандантам, я правёў па Красным сваіх юнакоў зь бел-чырвона-белымі сьцягамі на мітынг, дзе яны занялі першыя месцы. За некалькі дзён да гэтай падзеі атрымаў тэкст урачыстай прамовы. Пасьля майго выступу на памост узьнялася нейкая жанчына і прасьпявала "Мы выйдзем шчыльнымі радамі".

У першай палове сакавіка адбылася мая сустрэча з камандзірам 10-га батальёну Беларускай краёвай абароны, што разьмяшчаўся ў Радашкавічах, Цыбіным, зь ягонай ініцыятывы. На сустрэчы прысутнічаў Раман Цьвірка, камандзір роты гэтага батальёну, якая фармавалася ў Красным. Думаю, што нашую сустрэчу арганізаваў менавіта ён. Дзядзька Раман быў раней кіраўніком царкоўнага хору ў Красьненскай царкве. Ён добра ведаў маіх бацькоў, сябраваў зь імі. Няраз да вайны бачыў яго ў нас, калі зьбіраліся бацькавыя сябры — вайскоўцы, зь якімі ён разам служыў. Цыбін і Цьвірка прапанавалі мне ўступіць у Беларускую краевую абарону і заняць пасаду асьвятовага афіцэра іхнага батальёну. Для мяне гэта было як гром зь яснага неба. Пачаліся ўгаворы, і даволі пасьпяховыя. Я даў згоду, але з умовай, што да канца навучальнага году не пакіну настаўніцтва ў школе і СБМ і буду займацца толькі з Красьненскай ротай БКА, у якой тады ўжо было 30-50 жаўнераў, маладых хлопцаў, што добраахвотна зьявіліся з ваколіц Краснага.

Усе яны былі ў сваёй хатняй вопратцы. У форме афіцэра я бачыў толькі камандзіра батальёну Цыбіна. На ім была зялёная форма, на чырвоных пятліцах залацісты шасьціканцовы Ярылаў крыж, на рукаве нейкая эмблема, пагоны такія ж, як у немцаў, а што было на пагонах, не памятаю. Ня ведаю і ягонага вайсковага званьня. Тры зьвязовыя камандзіры былі ў чорнай форме БСА[5], але пятліцы таксама чырвоныя з залацістым Ярылавым крыжам. Я, афіцэр асьвятовы, быў у форме СБМ. Камандзір роты Раман Цьвірка - у сваёй цывільнай вопратцы. А яшчэ прысутнічалі два нямецкія падафіцэры. Яны жылі ў доме дзядзькі Івана Харытона (у вёсцы яго называлі Сынком), далека ад роты, бо аж за чыгункай.

На ўзбраеньні красьненскай роты былі два ці тры РКМы - польскія ручныя кулямёты і італійскія карабіны, можа мэтры паўтара даўжынёй. Рота займалася толькі вучэньнем па вызначаным раскладзе. Я

---

[5] БСА - Беларуская самаахова.

займаўся да абеду па адной гадзіне з кожным зьвязам[6]. Заняткі праводзіў па тэматыцы і інструкцыях, якія мне перадавалі з батальёну. У іншы час рота займалася вывучэньнем зброі, шыхтавымі й маршавымі практыкаваньнямі. У кар'еры за чыгункай праводзілі заняткі ў страляньні. Па суботах і я разы тры браў у іх удзел. Мне давалі зрабіць па дзьве чаргі (з трох патронаў), і па адным разе з кожнай я трапляў. Казалі, што гэта добры вынік. Рабіў я і па пяць стрэлаў па мішэні з італійскага карабіну. З 50 магчымых я не выбіваў болей за дваццаць адно ачко. На занятках заўсёды прысутнічалі нямецкія падафіцэры. Яны суправаджалі шыхт нашых вайскоўцаў (у цывільнай форме) на палігон і назад у школу. Якую яшчэ ролю яны выконвалі ў нашай роце, ня ведаю. У якіх апэрацыях удзельнічала нашая рота, таксама ня ведаю. Ніводнага разу я не заўважаў, каб яны куды-небудзь з Краснага адыходзілі.

З гэтае пары я быў заняты цэлымі днямі. Паводле дамовы, у роце БКА я займаўся перад абедам, заняткі ў школе былі пасьля абеду, увечары — падрыхтоўка да заняткаў у школе і ў роце БКА. У нядзелю я займаўся зь юнакамі СБМ. І, нягледзячы на гэта, знаходзіў час на сустрэчы зь сябрамі. Часьцей за ўсё сустрэчы праходзілі ў мяне дома. Зьбіралася шмат хлопцаў і дзяўчат. Гэта былі Юзік Кавальскі, Валодзя Старыкевіч, Дварэцкі, Алка Баслык, Жэня Шыпёнак, Тамара Харытон, Валя Дзік і Воля, якія калісьці вучыліся ў пэдвучылішчы і пераехалі ў Краснае нядаўна зь Ільлі ці Куранца. Былі ў мяне з начлегам Воля і Зіна Вярбіцкія і Кіра Сьцепужынекая, якія вярталіся з курсаў СБМ у Менску дамоў у Гарадок.

Аднаго разу, гэта было 6 траўня, на Юр'я, у мяне сабралася шмат сяброў. Быў цёплы дзень і мы гучна праводзілі час на вэрандзе нашага дому. Не магу ўявіць сабе, як тады я заўважыў Волю Бубен, што праяжджала па вуліцы на ровары. У Красным жылі ейныя родзічы, здаецца Чаеўскія, і яна вярталася ад іх у Маладзечна. Я вельмі прасіў яе пабыць хоць трохі з намі. Падышлі хлопцы і дзяўчаты, запрашалі яе, але яна ветліва падзякавала, спасылаючыся на позні час (ужо было пасьля полудня), разьвіталася з усімі. Я папрасіў усіх не разыходзіцца і праводзіў Волю аж да Месяты пехатою. На мосьціку, які астаўся яшчэ ад старой дарогі, мы крыху пастаялі, затым разьвіталіся, і Воля паехала. Гэта была мая апошняя сустрэча з Воляй. Ня помню, ці гаварылі мы калі пра каханьне, пра вернасьць і падобнае. Я кахаў яе моўчкі, а яна? - ня ведаю. Заўсёды была да мяне вельмі ветлівай, ласкавай, мілай. Я яшчэ пастаяў, пакуль яна ня зьнікла

[6] У савецкім войску гэта адпавядае "взводу".

ўдалечыні, і вярнуўся ў Краснае. Мая каманда ўжо падрыхтавала стол. Нашыя сустрэчы звычайна канчаліся бясьедай, але ніколі ня выпіўкай, хоць на стале была і бутэлечка. Усе вельмі зычліва паставіліся да майго спатканьня з Воляй.

Такія сустрэчы натхнялі мяне. Так узьнікла ідэя зрабіць у школе з дапамогай юнакоў Саюзу беларускае моладзі прадстаўленьне. Яго мы заплянавалі на 1 траўня 1944 году ("Першамай" і немцы сьвяткавалі). У нашай школе не было вялікага пакою, дзе можна было б зрабіць гэта, і мы пастанавілі ажыццявіць паказ на адкрытым паветры на ганку нашае школы. Дзякаваць Богу, надвор'е гэтым разам спрыяла нам. На імпрэзу сабралася шмат вучняў з бацькамі. Усё прайшло добра. Пад час прадстаўленьня зьявіўся нейкі немец з фотаапаратам. Ён здымаў выступленьні нашых артыстаў, а праз пару дзён прынёс фатаграфіі. Аддаў усе мне і прасіў раздаць іх дзецям. Калі я спытаўся, што за іх трэба яму даць, ён адказаў, што ў яго дома таксама такія дзеці і, калі ўжо хто зможа, то хай прынясе па адным яйку за фатаграфію. Дзеці былі вельмі радыя і напрыносілі шмат яек. Гэта быў першы немец, які за два гады маёй працы настаўнікам пабываў у школе.

У канцы траўня, калі заняткі ў школе закончыліся, вольнага часу ў мяне болей ня стала. Трэ' было знаёміцца і пачынаць працу ў батальёне Беларускай краёвай абароны, які разьмяшчаўся ў Радашкавічах. У самым пачатку чэрвеня на тры дні зьбіралі ў Менску афіцэраў асьвятовых БКА на сэмінар, які праводзіўся ў афіцэрскай школе. Дзе гэта канкрэтна адбывалася, я не магу ні ўспомніць, ні пазнаць тое месца. Праўда, і шукаць мне яго не даводзілася. Пасьля вяртаньня зь лягеру гэтага не дазвалялі мае матэрыяльныя сродкі, дый патрэбы не было. А цікава было б паглядзець і ўспомніць мінулае. На сэмінары я адчуваў сябе вельмі няёмка. Прысутнічата чалавек 20-30, і ўсе па ўзросьце і жыцьцёвым досьведзе значна мяне пераўзыходзілі. Прачытаныя лекцыі вельмі ўзбагапілі мае веды ў гісторыі і літаратуры, а зьвесткі з вайсковай гісторыі я, можна сказаць, увогуле пачуў упершыню. Шмат новага даведаўся і пра "бальшавіцкі рай". Пасьля вяртаньня, з новымі сіламі й ведамі, я ўжо больш упэўнена выступаў у Радашкавічах і ў Красным перад жаўнерамі роты, на якую не забываўся. Не пакінуў у Красным і грамаду маіх юнакоў СБМ. У чэрвені сярод іх правялі вэрбаваньне ў "люфтвафэ". Некалькі юнакоў завэрбаваліся, і іх неўзабаве вывезьлі ў Нямеччыну, дзе мелася адбывацца іхнае вышкаленьне.

22 чэрвеня ў Менску ладзілі сьвяткаваньне ўгодкаў стварэньня СБМ. Я атрымаў запрашэньне на гэтую імпрэзу. Камандзір батальёну

даў мне дазвол выехаць у Менск на тры дні. У самым горадзе я быў упершыню. Пазьней, пасьля вяртаньня зь лягеру, калі я меў магчымасьць пабываць у Менску, я пазнаў тыя мясьціны, дзе праводзілася сьвяткаваньне. Тэатар імя Янкі Купаты, сквэр ля яго, насупраць Дом афіцэраў, дзе праходзілі рэгістрацыю[7]. Справа, дзе цяпер рэзыдэнцыя прэзыдэнта, ці мо' крыху далей, стаялі некалькі дамоў. Там я начаваў і харчаваўся, і там былі курсы праваднікоў СБМ. 27 чэрвеня ў Менску праходзіў Другі ўсебеларускі кангрэс. Але туды я ня трапіў.

Выехаць зь Менску ў гэты час для мяне было праблемай. Нямецкія войскі адступалі і эвакуаваліся зь Менску. Незразумелае для мяне адбывалася тады і ў штабе СБМ. Ніхто ня мог нічога параіць. У Радашкавічы я дабраўся толькі 30 чэрвеня. На жаль, на месцы, дзе разьмяшчаўся батальён БКА, я нікога не засьпеў. На маёй кватэры сказалі, што напярэдадні камандзір батальёну распусьціў усіх дамоў, а сам з групай вайскоўцаў выехаў з Радашкавічаў на Маладзечна.

---

[7] Мабыць, там на першым паверсе знаходзіўся Кіраўнічы штаб СБМ.

## *У НЯВОЛІ*

У Краснае я вярнуўся 1 ліпеня. Мамуся мая была вельмі задаволеная маім вяртаньнем. Яна надта хвалявалася і перажывала за мяне, дый ейнае здароўе ў гэтыя дні пагоршала. Рух немцаў па гасьцінцы ў кірунку Маладзечна павялічваўся. Яны адступалі. Школа ў Красным, дзе разьмяшчалася рота БКА, была на замку. Я апынуўся ў адзіноце. Што рабіць?..

Пайшлі чуткі, што 3 ліпеня ў Менск увайшлі савецкія войскі. 5 ліпеня я з мамай і шмат хто з Краснага, сабраўшы самыя неабходныя рэчы, пакінулі свае хаты і пехатою перабраліся ў лес на другі бок ад чыгункі, пад Месяту. Там прабылі да 8 ліпеня, пакуль не пераканаліся, што немцаў у Красным няма. А прыйшлі савецкія войскі — і ўсё ціха. Выйшаўшы на край лесу, можна было наглядаць за Красным. 6 ліпеня над мястэчкам праляцелі некалькі савепкіх саматётаў, і ў той жа дзень пачало гарэць Краснае і наш гасьцінец. Усе думалі, што гэта самалёты падпалілі, але, калі мы вярталіся дамоў, заўважылі, што гарэлі ня ўсе хаты запар. Зразумела было, што хтосьці падпаліў. Наш дом і хлеў згарэлі, а побач хаты Гудаевіча і Бэрэнсона засталіся цэлыя. Не памятаю, дзе мы з мамай начавалі.

10 ліпеня мы пачалі зьбіраць самае каштоўнае, каб ісьці ў Канчаны ў дзедаву хату. Там цяпер жылі Курашы, але знайшлося б месца і для нас. Перад полуднем да нас падышоў нейкі вайсковец у чорнай скураной куртцы. Я яго адразу не пазнаў. Ён прывітаўся, і тады я ўбачыў ягоную выкручаную руку. Гэта быў Беньямін, жыд з Краснага, зь якім мы калісьці вучыліся ў Красьненскай школе. Спытаўшыся пра нашае здароўе і справы, ён разьвітаўся і пайшоў, але неўзабаве вярнуўся, зь ім былі два салдаты з аўтаматамі. Ён сказаў, што мне трэба прайсьці зь ім да камандзіра і каб я паводзіў сябе спакойна. На гэтым скончылася мая воля на 10 гадоў. Па дарозе да нейкага камандзіра нам сустрэўся Сьлінка, які быў у нас у школе вартаўнікам, а ягоныя дзеці прыбіралі.

— А, фашыст, папаўся, — кінуў ён у мой бок.

Гэта была першая абраза, першае абвінавачваньне мяне ў дзеях, пра якія я ніколі ня думаў, што яны злачынныя. Мама мая зразумела, што я арыштаваны, і, пакуль мяне трымалі каля нейкага бараку ў вайсковым гарадку, прынесла мне торбачку з хлебам і кавалкам сала.

Да вечара мяне і яшчэ чалавек дзесяць (незнаемых) загналі ў машыну і павезьлі. Выгрузілі ў Ашмяне і зачынілі ў нейкім хляве, дзе ўжо было чалавек дваццаць. Нікога да ранку не выпускалі і не дапытвалі. Уранку адчынілі хлеў, і мы маглі хадзіць па двары. Казалі, што

гэта зборны фармавальны пункт. І сапраўды, тут фармавалі каго куды. Дайшла й да мяне чарга. Я трапіў зноў у той жа хлеў. На другі дзень пачаўся шматдзённы пешы пераход з Ашмяны на Вільню — Араны да Гарлянаў, што пад Коўняй. Тут у Гарлянах нас першы раз абшукалі. Забралі ў мяне брытву, рэмень, нож, стары савецкі пашпарт. Больш у мяне нічога не было. Перапісалі ўсе мае дадзеныя. Зьнялі (першы раз у маім жыцьці) адбіткі пальцаў. Зачынілі нас у нейкай стадоле.

Аддзел, дзе нас трымалі і потым вялі допыты, — контрвыведка "Сьмерш"[8]. На допыты выклікалі толькі ўначы. Сьледзтва пачаў кульгавы капітан — украінец (прозьвішча не памятаю). Ён паклаў на стол тры фатаграфіі. На першай я быў зьняты ў форме гімназіста, на другой — у форме гарцэра (скаўта), на трэцяй — у форме СБМ. І адкуль у іх такія фатаграфіі, калі яны былі толькі ў нашым сямейным альбоме? Пра ўсе здымкі я павінен быў падрабязна расказаць: дзе, калі і ў якіх антысавецкіх арганізацыях я служыў. Вядома, сьледчы маім словам не паверыў. На першым здымку, паводле ягонага перакананьня, я быу у форме польскага паліцэйскага, навучэнца паліцэйскай школы. На другім - у нейкай (а якой, я мусіў прызнацца) польскай антысавецкай вайсковай часьціне. На трэнім — я ўжо "настоящий эсэсовец". Некалькі начэй я спрабаваў пераканаць сьледчага, што ён памыляецца, але дарэмна. Пратаколаў я не падпісваў, і ён пакуль ня надта гэтага дамагаўся. Нарэшце ён пайшоў на саступкі, і я падпісаў пратакол, што вучыўся ў польскай гімназіі, быў гарцэрам (скаўтам) Саюзу польскіх гарцэраў (ZHP) і сябрам Саюзу беларускай моладзі. Я гэтага ня ўтойваў, бо ня бачыў у гэтых арганізацыях нічога злачыннага. У працяг абвінавачаньняў сьледчы аднойчы заявіў, што я быў афіцэрам СС, і дамагаўся ад мяне прызнаньня. Я адмаўляўся і аднаго разу паспрабаваў давесьці сьледчаму, што гэтага ў прынцыпе быць не магло. Па-першае, я яшчэ вельмі малады, мне толькі тут, у Гарлянах, споўнілася 20 гадоў, і я нідзе вайсковую справу не вывучаў. Напалеон вучыўся і афіцэрам стаў толькі калі яму споўнілася 24 гады. Я сваёй таленавітасьцю Напалеону не раўня. Да таго ж у СС служылі адборныя нямецкія галаварэзы і мяне камандаваць імі ніхто не дапусьціў бы. Пасьля такіх доказаў сьледчы праявіў усе свае здольнасьці і

---

[8] Лічыцца, што гэты назоў азначае "Советский МЕтод Разоблачения Шпионов". Магчыма таксама, што ён паходзіць ад скарочанага лёзунгу "СМЕРть Шпионам!" СМЕРШ вядомы сваімі катаваньнямі, што ўжываліся да савецкіх вайскоўцаў, якія пабылі ў палоне або абкружэньні, а таксама да шматлікіх цывільных асобаў, якія жылі на акупаванай тэрыторыі ці былі вывезеныя на прымусовую працу ў Нямеччыну. — М. Чарняўскі.

сапраўдную гуманнасьць — і мяне бяз памяці вынесьлі ў стадолу. Калі апрытомнеў (ня ведаю, колькі праляжаў), я яшчэ сплёўваў крывёю. Арыштанты — мае таварышы па няшчасьці — далі вады, крыху абмылі. На сьледзтва мяне не выклікалі некалькі начэй — я ня мог стаць на ногі. Як пазьней выявілася, да афіцэра СС прыраўнялі маю службу ў БКА. Я перш не прызнаваўся. Думаў, што ніякіх доказаў ня будзе. У другую стадолу трапіў камандзір нашае роты Раман Цьвірка. Той, відаць, ня вытрымаў гуманных мэтадаў сьледзтва і ўсё расказаў, у тым ліку й пра мяне. Нам зрабілі вочную стаўку, і мне не было як далей адмаўляцца, тым больш што і мэтады рабіліся ўсё больш зьвярынымі.

У верасьні мяне і шмат каго яшчэ перавезьлі ў Коўню, як там гаварылі некаторыя знаўцы, у форт. У камэрах трымалі па 20 і больш чалавек. Вокнаў не было. Спалі на бэтоннай падлозе. Кармілі нейкай баландой раз на дзень, ваду давалі два разы. У куце стаяла сьмярдзючая "параша", якую выносілі раз на дзень. Доўга тут не трымалі. 26 верасьня мяне павялі на суд. Судзіў вайсковы трыбунаі 3-га Беларускага фронту. Мне зачыталі абвінавачаньне, спыталіся, ці прызнаю я сябе вінаватым, і, не зважаючы на мае пярэчаньне, зачыталі прысуд. Паводле артыкулу 63-1 крымінальнага кодэксу БССР (што адпавядае артыкулу 58-1-а УК РСФСР) мяне засудзілі на 10 гадоў "ИТЛ"[9] з пазбаўленьнем правоў на 5 гадоў і канфіскацыяй маёмасьці. Увесь працэс цягнуўся, мабыць, ня больш за 10-15 хвілін. Спыталіся, ці хачу я сказаць яшчэ што-небудзь, і, не чакаючы майго слова, прымусілі расьпісацца і завялі ў камэру, але ўжо ў іншую (праўда, нічым ня лепшую за ранейшыя). На рукі ніякай паперыны не дадзі. Я так і не зразумеў, за якія злачынствы атрымаў такі тэрмін зьняволеньня[10].

У Коўні нас доўга не трымалі. Праз колькі дзён пасьля суду пасадзілі ў таварныя вагоны і павезьлі на ўсход. У Менску цягнік ганялі некалькі разоў і, нікога ня высадзіўшы, паехалі далей. У Воршы нас выгрузілі на перасылцы. Народу было вельмі багата. Тут нас падстрыглі, пагалілі пад пахамі і лабок, памылі ў хододнай лазьні, далі (невядома якога паходжаньня) бялізну і вопратку — каму целагрэйку, каму жаночае паліто, каму абы-што. Мне дасталіся мужчынскае паліто і нагавіцы-ватнікі. Нашае адзеньне ўсё забралі. Напэўна, пасьля адпаведнай апрацоўкі аддадуць наступнай партыі перасыльных. Зноў узялі адбіткі пальцаў. Пагрузілі ў такія ж таварныя вагоны. Але ў гэтых пасярэдзіне стаяла жалезная печка, замест парашы ў дзьвярох,

---

[9] ИТЛ — исправительно-трудовые лагеря.

[10] У 1993 годзе я падаваў заяву на перагляд маёй справы і рэабілітацыю. Мне адмовілі.

якія не адчыняліся, латок, справа і зьлева суцэльныя нары безь якога-колечы подсьцілу.

Ад'ехаўшы ад Менску, праз закратаваныя акенцы мы бачылі палі, ужо пакрытыя сьнегам. У вагоне было хадодна — бярэмя дроваў, што ўкінулі перад ад'ездам, згарэла хутка. На прыпынках у вагон ускоквалі вайскоўцы з чырвонымі пагонамі, зганялі ўсіх у адну палову вагону і, абшукаўшы першую, пераганялі ўсіх па чарзе, абшукваючы з ног да гадавы. Затым, праверыўшы другую палову, замыкалі дзьверы. Пакуль праходзіла ўся гэта апэрацыя, з вагону выходзіла ўсё цяпло. Давалі крыху дроваў, але яны, сырыя, ня надта хацелі гарэць, і мы патроху пачалі ламаць нары, каб хоць як напаліць печку. Звычайна на прыпынках пасьляператрусу кармілі. Аднаго разу, памятаю, гэтакі смачны суп далі з бобу і хлеба трапіў акраец. Во пашанцавала!

Так нас везьлі ажно да Яраслаўля. Па дарозе двох вязьняў з нашага вагону пад час праверкі вынесьлі, мабыць нежывымі. У Яраслаўлі на славутай, як казалі, "Яраслаўскай перасылцы" нас выгрузілі і разьмясьцілі ў бараках. Тут я ўпершыню ўбачыў двух'ярусныя нары, на якіх ляжалі напханыя сенам сеньнікі і такія ж падушкі. Прасьцін і коўдраў не было. У адным канцы бараку стаяла вялікая печка, ад якой ува ўсе бакі разыходзілася цяпло. Адчувалася нейкая млявасьць, і ўсіх цягнула на сон. Мне ўдалося занязь месца на першым ярусе, на другі я, зьнясілены, мог бы ня ўзьлезьці. Адзін вязень, на выгляд дзядуля, не знайшоўшы месца на першым ярусе, сьцягнуў сяньнік і лёг на падлозе. Ці доўга мы спалі, ня ведаю, але, калі нас паднялі, на вуліцы было ўжо зусім цёмна. Нас павялі ў другі барак: там разьмяшчалася сталоўка. Далі па місцы супу і лыжцы кашы. Не памятаю, з чаго яны былі звараныя, але вельмі смачныя. Ноч і наступны дзень нас ніхто не трывожыў. Кармілі два разы, і вельмі смачна, але пасьля яшчэ больш хацелася есьці. Неўзабаве прыйшла й нашая чарга. Зноў апрацоўка — стрыжка, галеньне, халодная лазьня. Пасьля лазьні голых і яшчэ мокрых аглядалі дактары — мералі, узважвалі, мацалі азадак, слухалі грудзі. Я важыў тады 36 кілеграмаў. Пасьля мэдагляду мяне перавялі ў іншы барак.

Яшчэ пару дзён, і нас зноў грузяць у таварныя вагоны — "цяплушкі" і вязуць у няведамы сьвет. На прыпынках тыя ж працэдуры —ператрусы ды кармленьне. На вуліцы ўсё халадней і ўсё болей сьнегу. Для паленьня ў печцы сталі даваць каменны вугаль, але й гэта не ратавала. Курчыліся ды прыціскаліся адзін да аднаго на яшчэ ня спаленых нарах, бо на падлозе яшчэ халадней. Хутчэй бы куды прывезьлі, каб ня мерзнуць у вагонах...

## *КАНЦЛЯГЕР*

І вось прыехалі. Чарговы прыпынак. Нас выгружаюць. Перасылка Пячора. Зноў санапрацоўка, паўхалодная лазьня, мэдагляд. Я ледзь перасоўваюся. Ногі ня хочуць згінацца, на галёнках патрэскалася скура і бачныя косьці, ягадзіцы зьніклі, толькі скура. Зубы сталі хістацца, дзясны амаль зьніклі. Пару дзён перадыху — і зноў цяплушкі. Мароз. Калёсы вагонаў скрыпяць па настылых ад марозу рэйках. Дзе-нідзе спыняемся. Чуваць, што зь некаторых вагонаў выгружаюць людзей, адчэпліваюць вагоны, а мы едзем далей. Чарговы прыпынак — і гэты ўжо наш. Адчыняюцца дзьверы, прыстаўляюць доскі, і чуем каманду: "Выгружайся!" Па адным зь цяжкасьцю спаўзаем (іначай ня скажаш) на зямлю. Хто ўжо на зямлі, мусіць садзіцца проста ў сьнег. Калі ўсе выгрузіліся, канвой праверыў вагон — ці не застаўся там хто, зачыніў дзьверы і скамандаваў: "Всем сидеть, если кто встанет — стреляем без предупреждения".

Цягнік рушыў далей, і толькі ён аддаліўся, дадзена новая каманда: "'Встать. Идти плотно один за одним. Шаг влево, шаг вправо считаем попыткой бежать. Стреляем без предупреждения".

Сьвітала. Навокал бязьмежная сьнежная раўніна. Нідзе ні дрэва, ні кусьціка. У кірунку, куды нас вялі, пратаптаная ў сьнезе сьцежка, як прайсьці аднаму. Яна ішла на нейкі ўзгорак. Мэтраў за 500 ці болей ад чыгункі на гэтым узгорку вылучалася зь сьнежнай белізны нейкая шэрая паласа. Здалёк убачыць, што гэта такое, было яшчэ немагчыма. Ішлі моўчкі — наперадзе і ззаду канвой з аўтаматамі. Ісьці было вельмі цяжка. А на ўзгорак, хоць ён быў і ня вельмі стромкі, даводзілася залазіць па вытаптаных прыступках на карачках. Перад намі быў, як неўзабаве высьветлілася, сангарадок. Прыгожа гучыць! Сюды зь Пячорскай перасылкі накіроўвалі хворых вязьняў, або такіх, што ад зьнясіленьня ледзьве рухаліся.

На тэрыторыю сангарадку прапускалі праз прахадную па адным. Калі называюць тваё прозьвішча, трэба выходзіць наперад, гаварыць прозьвішча, імя, імя па бацьку, артыкул, паводле якога асуджаны, і тэрмін зьняволеньня. Напрыклад, я павінен быў адрапартаваць: Дубовік Юрый Пятровіч, 63-1 УК БССР, 10, 5 і 5. Апошнія лічбы значылі: 10 — тэрмін у "ИТЛ", 5 — тэрмін пазбаўленьня правоў, 5 — тэрмін высылкі. Пра высылку мне зачытвалі на судзе, і я пра яе заўсёды згадваў. Фактычна яна нeяк зьнікла з майго прысуду. Пра гэта мне ніхто ніколі не казаў, але й ніколі мяне не папраўлялі, калі я яе называў.

У сангаралку чарговая лазьня, санапрацоўка і разьмеркаваньне ў бараках. Баракі ледзь бачныя з-пад сьнегу. Усярэдзіне аднаярусныя нары зь сеньнікамі і падушкамі, але на сеньніках — прасьціны і коўдры. Ля нараў — тумбачка, адна на двох. У бараках нас аглядаў доктар (у кожным бараку свой, таксама вязень). Унутры было цёпла, і на агляд да доктара мы мусілі ісьці распранутыя. Той аглядаў звонку, мацаў ягадзіцы, жывот, мускулы на нагах і руках, слухаў лёгкія і сэрца ды ўсё запісваў. Ад яго я даведаўся, што хворы на цынгу і пэлягру. Што гэта за хваробы, мы даведаліся паступова ад доктара ды яшчэ больш ад "вельмі адукаваных хворых". Лячылі нас лекамі, якія выраблялі на месцы. Два разы на дзень давалі грамаў па 100 настою ігліцы і адзін раз — дражджэй. Кармілі тры разы на дзень. Хлеб давалі раз на дзень па 300 грамаў уранку, але мы яго адразу зьядалі — і на абед і вячэру не заставалася. Таму абед і вячэра трацілі свой аздараўленчы эфэкт. Тады пачалі даваць па 100 грамаў тры разы на дзень. За парадкам у бараку сачылі два днявальныя. Іх прызначалі зь ліку тых, хто прабыў тут ужо пару месяцаў, выжыў, падужэў, паздаравеў і паказаў свае здольнасьці кіраваць. Ім за гэта давалі 400 грамаў хлеба, а яны яшчэ падраблялі на кухні і ў каппёрцы. Дапамагалі доктару — праводзілі з хворымі фіззарадку, арганізоўвалі прыбіраньне бараку і яго тэрыторыі.

Ахова два разы на дзень рабіла праверкі, часта —ператрусы (а што было ў нас шукаць?). Уранку днявальныя з доктарам да праверкі аховай рабілі абыход і глядзелі, ці няма мерцьвякоў. Іх на санях вывозілі за зону, там, мабыць, складалі адпаведны акт і завозілі на могільнік. Трупы складвалі адзін на адзін у ямы, падрыхтаваныя ўвосень, калі яшчэ не замерзла зямля. Засыпал і іх увесну, як пачыналі раставапь сьнег і зямля. Бывалі такія выпадкі і ў нашым бараку.

Перад Новым годам (1945-м) у нашым бараку зьявілася новая доктарка. Марта Карлаўна — немка, што адбывала пакараньне ў "ИТЛ", — была вельмі зычлівая і ласкавая да ўсіх хворых.

Перапіску нам забаранілі. Аднаго разу была нейкая камісія і мы ім задавалі пытаньні, чаму ня можам напісаць дахаты, што жывыя. Адзін з "камісараў" адказаў, што ідзе вайна і народ заняты заваёвай перамогі, а абслугоўваць "изменников Родины" няма калі і на гэта няма сродкаў. Аднак да Новага 1945 году нам дазволілі напісаць лісты. Ахвотнікам далі пад росьпіс аркушык паперы з сшытка. Лісты складваліся трохкутнікам, не заклейваліся і не маглі мець зваротнага адрасу. Я напісаў сваёй маме на Канчаны. Ці атрымала яна яго, ня ведаю.

Як толькі растаў сьнег, у траўні ці ў чэрвені, мяне выпісалі з сангарадку як здаровага і разам зь іншымі пад канвоем адправілі ў калёну № 16, што кілямэтраў за 10-15 ад сангарадку. Туды мы ішлі пехатою па чыгунцы. Калі ішоў цягнік, нас зганялі пад адхон і сувора папярэджвалі не варушыцца. Мы дайшлі да станцыі Сівая Маска, што знаходзілася ўжо за паўночным палярным кругам. Ня болей як за кілямэтар ад яе - калёна-16. Ужо перад яе варотамі я мог агледзець, што такое калёна. Высокая, больш за два мэтры вышынёй, агароджа. На паваротах агароджы — вышкі з кулямётамі. За два мэтры ад высокай агароджы - нізкая агароджа з калючага дроту. Перад намі такая ж, як і ў сангарадку, прахадная і вароты. Справа нейкія неабгароджаныя баракі. У зону нас прымалі гэтак, як і ў сангарадку.

На другі дзень нас разьмеркавалі па брыгадах і азнаёмілі з распарадкам у калёне. Уранку па звоне ў кавалак рэйкі пад'ём, раздача хлеба, сталоўка, развод. На разводзе выходзім за вароты брыгадамі. Там чакае канвой з аўтаматамі і сабакамі. Пералічыўшы нас, канвой сувора папярэджвае: "шаг влево, шаг вправо...", і мы падыходзім да таго неабгароджанага бараку. Гэта інструмэнталка. Брыгадзір падыходзіць туды, і адтуль нам выносяпь патрэбны ў гэты дзень інструмэнт. Мы яго разьбіраем і зноў становімся ў строй. Ідзём на месца нашай працы. У сярэдзіне дня прыносяць абед — запяканку з кукурузных ці ячных крупаў памерам 10х10х3 сантымэтры. Вельмі пажыўная і смачная. Хвілін 30 перапынак — і зноў работа. Працоўны дзень 8-10 гадзін. Увечары ля варот зноў пералічваюць, падазроных абшукваюць і запускаюць у зону. Па чарзе ўсёй брыгадай ідзем у сталоўку. Там даюць суп (часта з турнэпсу), пару лыжак кашы, кавалачак рыбы або аленевага мяса. Да адбою, калі ў каго ёсьць сілы, можна хадзіць па зоне і заглядаць у другія баракі. Пасьля адбою па зоне хадзіць не дазвалялася, хіба што ў прыбіральню. Так было штодня, без выходных. Не працавалі ўлетку, калі ішоў вялікі дождж, і ўзімку, калі мароз быў мацнейшы за -27°С ці ў завею. Работу выконвалі розную. Ля станцыі меліся будаваць два дамы. Мы займаліся пляніроўкай пляцоўкі. Тое, што цяпер робіць бульдозэр ці скрэпэр, мы рабілі ўручную, а зямлю адвозілі на тачках. Тачкі звалі машынамі АСО - дзьве ручкі і ад но кола.

Увосень на 330-м кілямэтры (ад Пячоры) пачалі капаць вялікі катлаван. Капалі яго толькі ў маразы, бо гэта было ў балоце: зямлю дзяўблі кіркамі і вывозілі тачкамі. Разгружалі пясок з чыгуначных плятформаў, затым перавозілі яго ў тачках на земляное палатно. Узімку бэтанавалі на гэтым месцы вялікую трубу для вады. Вясной закончылі трубу, і ўсё лета адсыпалі над ёй земляное палатно пад

чыгунку. Пракопвалі новае рэчышча для ракі Уса, каб пусьціць яе ваду праз трубу і засыпаць старое рэчышча. Чыгуначнікі пракладвалі рэйкі новай выпраўленай каляіны, мы падсыпалі пясок, рабілі адхоны, падштыкоўвалі пад шпалы. Зімой часта ачышчалі ад сьнегу чыгунку на станцыі.

У нашым бараку жыў геадэзіст Мурашка зь Віцебску. Неяк я пахваліўся яму, што ў мяне ў Віцебску жыве дзядзька зь сям'ёй, а ягоны сын — артыст у тэатры Якуба Коласа. Калі я назваў дзядзькава прозьвішча - Казлоў, ён больш зацікавіўся ў размове са мной і спытаўся, ці ня звацць дзядзькаву дачку Нінай. Высьветлілася, што ён добра ведаў Ніну, вучыўся зь ёй у пэдвучылішчы і нават сябраваў. Але Ніна захварэла і перад самай вайной памерла. Мурашку забралі ў армію і там у 1942 годзе засудзілі паводле артыкулу 58-10 УК РСФСР (агітацыя супраць саветаў) на 5 гадоў "ИТЛ". На працу Мурашку выпускалі без канвою. Давяралі, дый праца такая, што не ўпільнуеш. З сабой ён браў аднаго ці двох чалавек. Яму давяралі і гэтых людзей. Летам ён браў мяне. Зь ім рабіць было легка і паёк быў большы: заўсёды хлеба давалі 450 грамаў.

У 1947 годзе на гэтым участку працы паменела і некалькі брыгад перавезьлі на іншыя калёны. Я трапіў на станцыю Верхняя Інта. Тут пачыналася будаўніцтва гораду. Ад гэтай станцыі адыходзіла чыгуначная каляіна на Інту, дзе былі вугальныя шахты і другі лягер — "Интлаг". Наш называўся "Печорлаг". Тут я пачынаў працаваць дапаможным рабочым у мулярнай брыгадзе. Вельмі цяжка было насіць цэглу на другі паверх на "казе", па 8-10 цаглін за раз. Часта пускаў сьлязу, успамінаў маму, сяброў, Краснае, Волю. Рэжым дня тут ужо крыху зьмяніўся — працавалі па 8 гадзін на дзень, у нядзелю быў выходны. Праўда, часта ў нядзелю адраблялі за такія дні, калі не выходзілі на працу праз дождж ці холад.

Казалі, што за нашу працу налічваюць заробак, зь яго вылічваюць за харчы, вопратку ды іншыя паслугі, а што застаецца — кладуць на рахунак кожнага ў ашчаднай касе ў Пячоры. З гэтай сумы штомесяц выдавал і на рукі 10 рублёў тым, хто не парушаў рэжыму (і калі было з чаго іх выдаць). Раз у тыдзень працавала крама, дзе можна было купіць хлеб, цукар, маргарын, цукеркі, сшыткі, алоўкі, ніткі, тытунь.

Яшчэ на калёне-16 нам дазволілі пісаць лісты і атрымоўваць па адной пасылцы ў месяц. Першую пасылку я атрымаў на Пакровы, 14 кастрычніка 1946 году. У ёй былі толькі чорныя сухары і пачкаў дзесяць махоркі. Пасылку выслала з Канчанаў цётка Наталіна, маміна сястра. Мой ліст з зваротным адрасам нейкім чынам перадала маёй маме Вольга Ліванарава. Яна тады працавала ў Канчанах пашталь-

ёнам. Мама тым часам хавалася ў Летуве і сама пасылаць баялася, каб ня выкрыць сябе. Яна перадавала ў Канчаны нейкім таемным спосабам пасылкі, а цётка перасылала іх мне. Гэтак я атрымаў некалькі пасылак на Сівой Масцы і ў Інце. З маіх лістоў мама зразумела, што з Канчанаў мне высылаюць ня тое, што яна ім перадае. Пазьней я стаў атрымоўваць пасылкі ад дзядзькі Івана — мамінага брата, які працаваў у Вільні бухгальтарам у пякарні. Дзядзька Іван з мамай зьбіралі й пасылалі мне тушонку, сала, тытунь. Атрымоўваючы такія пасылкі, можна было па-іншаму ўладкоўваць жыцьцё. Я завёў сяброўскія дачыненьні з "помпотруду"[11], з брыгадзірам. Дый сам ажывіўся, памацнеў.

На маю просьбу дзядзька Іван дасылаў мне часопіс "Полымя", зборнікі твораў Купалы, Багдановіча, Танка. Я сам выпісаў праз "кнігу — поштай" падручнік ангельскай мовы і ангельска-расейскі слоўнік. Пасябраваў з маладым расейскім паэтам Валодзем Гур'янам. Яму вельмі спадабаліся некаторыя беларускія вершы. З маёй дапамогай Валодзя пераклаў на расейскую мову "Зорку Венеру" Багдановіча ды пачаў працавань над "Курганом" Купаты. У яго таксама было трохі кніжак. Я зь вялікім задавальненьнем, як кажуць, ад вокладкі да вокладкі, прачытаў трохтомнік Бялінскага. Ля мяне згуртаваліся землякі-беларусы: Віктар Мураўскі з Наваградку, Міхась з Глыбокага, два хлопцы з Баранавічаў, Капацэвіч з Слуцку.

Артыст Іваноў з Масквы арганізаваў у калёне гурток мастацкай самадзейнасьці і струнны аркестар. Я граў на мандаліне, Жора-масквіч - на скрыпцы, ён жа йграў і вучыў іншых на гітары ды на балалайцы.

"Помпотруду" перавёў мяне ў брыгаду цесьляроў. Цесьляром працаваць было лягчэй, але неяк увосень мы прыбівалі латы на страсе двухпавярховага дому. Дзьмуў вецер, мяло сьнегам — у руках не ўтрымаць ні сякеры, ні цьвіка. А насупраць у доме працавалі тынкавальнікі — распранутыя, вясёлыя. Увечары пайшоў да "помпотруду". Праблем ня стала. Назаўтра я ўжо быў у брыгадзе Кудрашова вучнем-тынкавальнікам.

Сгтэцыяльнасьць мне вельмі спадабаіася, і я за кароткі тэрмін асвоіў гэтую прафэсію. Да 1950 году працаваў тынкавальнікам, а ўлетку — лепнікам на аздабленьні школы.

Увесну 1950 году ў Пячоры праходзіў агляд гурткоў мастацкай самадзейнасьці. Наш, дзе быў і я, таксама браў удзел. Нам выдалі новую бялізну, вопратку, керзавыя боты. Везьлі нас у Пячору не ў

---

[11] Гэта нешта накшталт начальніка аддзелу кадраў.

таварных вагонах, а ў пасажырскіх. Канвой быў, але без аўтаматаў і сабак. Агляд праходзіў у зоне перасылкі цягам трох дзён. Уранку, калі я выйшаў на двор, дык заплакаў: на тэрыторыі перасылкі расьлі вялікія, прыгожыя, як у Беларусі, хвоі. Туга сьціснула мне грудзі.

Атрымаць які-небудзь прыз нам не ўдалося, але карысьць ад паездкі вялікая. Паглядзелі на людзей і сябе паказалі. Калі выступала сьпявачка з Варкуты, яе назвалі — Сьвятлана Тухачэўская. Мне гэтае прозьвішча тады нічога не сказала. Сябры па самадзейнасьці былі старэйшыя і жылі ў СССР даўно. Яны расказалі, чыя гэта дачка і хто такі Тухачэўскі. Тады я ўспомніў, што, калі вывучаў у пэдвучылішчы гісторыю СССР, у падручніках былі замазаныя некаторыя прозьвішчы і партрэты — Тухачэўскі, Блюхэр ды іншыя. А за што адбывала тэрмін зьняволеньня Сьвятлана? Адказ на гэтае пытаньне стаў вядомы шмат гадоў пазьней, калі ня стала СССР.

На пачатку 1950 году шмат каго, у тым ліку й мяне, сталі часта выклікаць да "кума" (опэрупаўнаважанага). Я так і не зразумеў, што яны ад нас хацелі. Пытаньні былі розныя: пра жыцьцё, працу, вольны час, пра мінулае. Каторы раз іх цікавіла асоба Краснова, які быццам жыў у Красным.

Да Новага 1951 году нямала вязьняў перавезьлі ў іншыя калёны. Я трапіў у Ілезу, у Архангельскую вобласьць. Цяпер на карце яе не знаходжу. Гэта недзе паміж Вельскам і Кулоем. Ад станцыі Кулой ішла чыгуначная адводка ў Ілезу на склад лесу і шпаларэзку. Побач з намі разьмяшчалася другая зона, аддзеленая ад нашай такой жа высокай агароджай і ахоўнай зонай. Нашая калёна займалася толькі лесапавалам, адгрузкай лесу, нарыхтоўкай і адгрузкай шпалаў для шырокай і вузкай каляін. Мяне ўлучылі ў брыгаду Курашвілі — на лесапавал. Курашвілі тут ужо пяць гадоў. У мінулым ён быў капітанам у савецкай арміі, у першыя дні вайны трапіў у палон, зь якога яго забрала нейкая львавянка. Спачатку ён быў у яе работнікам, а потым, як ён нам расказваў, стаў мужыком. З прыходам савецкай арміі яго арыштавалі і як "изменника Родины" асудзілі на 10 гадоў "ИТЛ" і 5 гадоў пазбаўленьня правоў. Чалавек ён вельмі інтэлігентны, перажываў, але ніколі не паказваў гэтага. Да работнікаў брыгады ставіўся па-людзку, ня тое што на Сівой Масцы.

На працу нас вазілі ў вагончыках па вузкакалейцы. На кожную брыгаду быў свой вагончык. У дождж маглі там схавацца. Арганізацыя працы на лесапавале была такая. Брыгада бесканвойных рабіла прасекі шырынёй 5-10 мэтраў, на скрыжаваньні якіх будавалі вышкі для канвою. Атрымоўваліся дзялянкі 500 х 500 мэтраў. На іх мы й працавалі. Дазвалялася перамяшчацца свабодна па ўсей дзя-

лянцы, але на прасеку выходзіць было небясьпечна - маглі падстрэліць. Лес валілі электрапіламі. Была перасоўная электрастанцыя і па адной піле на брыгаду. Пілы цяжкія — 20 кіляграмаў. Пілавалі ўтрох — двое на піле і адзін зь вілкай пхаў дрэва ў патрэбным кірунку. Гэтае зьвяно перасоўвалася ўздоўж дзялянкі, сьпілоўваючы паласу мэтраў 10-15. Калі небясьпека, што каго-небудзь прываліць, мінала, за працу браліся чадавек шэсьць "сучкасекаў" і "кастрапалаў". Яны абсякалі сукі і гальлё з паваленых дрэваў, выбіралі месца для іх спальваньня і, калі гэта было ўзімку, — палілі, а калі ўлетку, — складвадзі ў лаўжы. Улетку сучкі не палілі, бо баяліся, што загарыцца лес. Адначасова некалькі чалавек расьпілоўвалі галамні на бярвёны патрэбнай даўжыні. Калі ад камля на даўжыні 2,4 мэтра ў верхнім водрубе быў дыямэтар 28 сантымэтраў, пілавалі шпальнік, калі меншы — піловачнік даўжынёй 6 мэтраў і г.д. За імі прыходзілі тралёўнікі, якія рыхтавалі бярвеньне для траляваньня яго коньмі на склад. Склады рабілі ўздоўж вузкакалейкі так, каб потым бярвёны можна было легка грузіць на плятформы вузкакалейкі. Кожнай брыгадзе давалі двох коней, іх даглядалі конюхі — таксама арыштанты. У кожнай брыгадзе быў свой маркіроўнік, які аглядаў расьпілаваныя бярвёны, замерваў верхні водруб і на ім запісваў дыямэтар. Заадно запісваў сабе для ўліку кожнае бервяно, а адтраляваныя — асобна. Для гэтых нататак у яго былі дзьве фанэркі. Увечары ён дакладваў брыгадзіру, а той — майстру лесу, колькі й якога матэрыялу ў штуках і ў кубох нарыхтавалі.

Ад першых дзён я працаваў сучкасекам, потым — кастрапалам. Сучкасекам было вельмі цяжка рабіць. За дзень гэтак намахаесься сякерай, што рук ня чуеш. Але ж і кастрапалам не лягчэй. Мокрыя сучкі не хацелі гарэць (пакуль яшчэ іх распаліш), а летнія кучы ўжо спалілі. Добра, што ў мяне ўжо зьявіліся сябры. Я стаў маркіроўнікам і так працаваў да восені 1952 году, калі мяне перавялі на шпаларэзку майстрам. Я сачыў за якасьцю пілаваньня шпалаў і якасьцю іх апрацоўкі спэцыяльнай рашчынай ад гніеньня. Арганізоўваў пагрузку шпалаў у вагоны. Дапамагаў начальніку складу лесу - Фаміну, які таксама быў да вайны афіцэрам і перажыў нямецкі палон.

На кожнай калёне займаліся выпраўленчым выхаваньнем. Сродкі былі розныя: расейскі мат, ізалятар, фізычнае пакараньне ды іншае. Неяк дзіўна, але пералічаныя спосабы на калёне-16 хоць і выкарыстоўвалі, але вельмі абмежавана. Можа, гэтаму спрыяла тое, што кіраўнічыя пасады займалі інтэлігентныя людзі. Сам начальнік калёны ставіўся да арыштантаў па-людзку, ня так, як, прыкладам, на Сівой Масцы. На адным з сходаў ён заклікаў нас арганізаваць мастацкую самадзейнасьць. Сярод нас выявіліся два артысты — Валодзя

Зубараў з Масквы і Аляксей Міхайлаў з Іванава. Музычным гуртком узяўся кіраваць наш цырульнік — вуніяцкі сьвятар зь Львова Міраслаў Лукіч Гайдучок. Ён, я і Юрка Рыбко з Заходняй Украіны йгралі на мандаліне. Валодзя Васільеў — на гітары, Кепуліс, латыш, — на скрыпцы і Зубавічус зь Летувы — на акардэоне, які яму прыслалі з дому. Варта яшчэ зазначыць, што Васільеў быў майстрам лесу, Рыбко — нармавальнікам, Гайдучок — калёнexistным цырульнікам (да яго і з аховы вольнанаёмныя прыходзілі падмаладзіцца). Ну і я, не без удзелу названых, стаў майстрам шпаларэзкі. Кепуліс працаваў з электрапілой на валцы лесу, Зубавічус - на траляваньні лесу (праўда, у іншых брыгадах). Вельмі багатыя на артыстаў былі драматычны і вакальны гурткі. Там браў удзел нават старшы кухар.

Займаліся мы пасьля працы і ў выходныя. Часта давалі канцэрты. Дый кожная рэпэтыцыя была свайго роду канцэртам. Прыходзіла шмат лягернікаў паслухаць і падтрымаць нас маральна. Народ тут сабраўся ўжо падужэлы, больш сьведамы, спагадлівы, не такі сквапны — жаданьне паесьці ўжо не было асноўнай марай жыцьця. Калі ў лесе пасьпявалі ягады, бесканвойная брыгада пуцейцаў прыносіла для кожнай брыгады задарма па вядры малін. Казалі, нібыта яны іх не зьбіралі, а проста падстаўлялі вядро пад куст і трэсьлі, а ягады самі сыпаліся. Увосень прыносілі шмат грыбоў, але іх аддавалі адразу на кухню.

А яшчэ на нашай калёне арганізаваўся гурток шахматыстаў. На Сівой Масцы і ў Інце мне было не да шахматаў, а тут і я ўспомніў, як татусь мяне муштраваў, вучыў гуляць. Ён у сваім трэцім батальёне да вайны займаў першае месца. Памятаю, калі я ўжо вучыўся ў гімназіі, тата прыяжджаў на шахматныя спаборніцтвы ў дывізіі. Я ў гімназіі чэмпіёнам ня быў, але лічыўся моцным шахматыстам. Да гэтага часу ў зьняволеньні я не гуляў у шахматы, але хутка ўспомніў і нават стаў прэтэндэнтам на чэмпіёна па калёне. За першынство змагаўся з нашым акардэаністам Зубавічусам.

Добрымі маімі сябрамі сталіся зьняволеныя суседняй калёны. Цішком мы пачалі перамаўляцца праз высокую агароджу, ня бачачы адзін аднаго. На той калёне знаходзіліся асуджаныя на 15-25 гадоў. Там было шмат беларусаў. Я ім перакідваў часопісы "Полымя" і зборнікі нашых паэтаў. Наш барак быў самым блізкім да іхнай агароджы. Яны чулі, як мы рэпэтуем, і прасілі часьцей іграць на сьвежым паветры, каб ім было лепш чуваць. За лета 1953 году я пасябраваў такім чынам зь Місюком з Слуцку. Калі падыходзіў тэрмін майго вызваленьня, ён перакінуў мне ліст да свайго брата ў Слуцак, каб я яго перадаў або пераслаў. У будучыні той зрабіў мне добрую справу.

У сьнежні 1953 году я перадаў справы шпаларэзкі іншаму і на працу хоць і выходзіў, але нічога не рабіў. Казалі, перад цяжкой работай на волі трэба хоць месяц адпачыць. Ад новага 1954 году мяне зусім пакілалі ў зоне. Як нясьцерпна і балюча заставацца ў бараку аднаму з днявальным! Я і хадзіў туды-сюды, і граў на мандаліне, каб разагнаць тугу. Дакладнай даты майго вызваленьня ніхто не казаў. Толькі наглядчык сказаў, што гэта будзе ў сярэдзіне студзеня. Нарэшце ў нядзелю 10 студзеня ён загадаў мне рыхтавацца ў панядзелак да ад'езду. Сябры зрабілі мне разьвітальны канцэрт. За агароджу я перакінуў усе свае кніжкі, акрамя падручніка ангельскае мовы ды слоўніка. У Вельск мяне павезьлі не ў панядзелак, а ў аўторак. Там у асобным бараку начавала нас пяць чалавек — усіх рыхтавалі да вызваленьня, на волю.

13 студзеня 1954 году мяне вывелі з зоны ў дом непадалёк — Упраўленьне лягеру. Не памятаю, як праходзіў увесь працэс. Выдалі мне даведку аб вызваленьні і прапанавалі застацца на вольным пасяленьні. Я згоды на гэта ня даў. Прапанавалі падумаць да серады і далі накіраваньне ў гасьцініцу, куды я ішоў без канвою — упершыню за дзесяць гадоў!

14 сьнежня я, ужо вольны грамадзянін, прыйшоў ва Упраўленьне. Прасіў адпусьціць мяне на Радзіму — вельмі замаркоціўся па маме, сваякох. Больш прапановаў не было. Спыталіся, куды я хачу ехаць. Папярэдзілі, што ў сталіцы і абласных гарадох мяне не прапішуць; у прымежных раёнах, а таксама ў Маладзечне і Красным, дзе я "занимался преступностью", за якую мяне судзілі, пражываньне не рэкамэндуецца. Я назваў Слуцак. Мне выдалі пашпарт. У даведцы дапісалі, што еду ў Слуцкі раён. Выдалі новую бялізну, цэлагрэйку, ватныя штаны, чорныя вайлакі. Атрымаў рэшту грошай - 260 рублёў. Увечары далі білет на цягнік да Слуцку і пасадзілі ў вагон. Я вольны ехаў дадому! Ня верылася.

## *ВЯРТАНЬНЕ Ў РОДНЫЯ МЯСЬЦІНЫ*

Манатонна адстукваюць колы вагонаў кожны стык рэйкаў. Ужо ноч, але мне ня сьпіцца. Я еду вольны і, магчыма, па той жа дарозе, па якой везьлі мяне амаль дзесяць гадоў таму пад канвоем. У вагоне цёпла, і месца мае на ніжняй паліцы. У маім куфэрку — бохан хлеба, цукар і бляшанка тушонкі, але есьці ня хочацца. А як хацелася тады, калі ехалі ў цяплушках! Калі я даеду дадому? Як там мама? Ці знайду яе па тым адрасе, што маю?

Праехалі Волагду. Аднастайны стук колаў і паўночная ноч закалыхалі мяне. Прачнуўся, як на двары ўжо разьвіднела. У купэ ўсе тыя ж пасажыры. На верхніх паліцах — вызваленыя, якіх пасадзілі ў вагон разам са мной, маўклівыя, як напалоханыя чымсьці. Толькі сказалі, што ў Маскве ім трэба пераяжджаць на Кіеўскі вакзал. На ніжняй паліцы — пажылы чалавек, таксама маўклівы. Падазрона паглядаў на нас - не давяраў. Было відаць, што мы зь лягераў. Хто нас ведае, за што мы сядзелі і якія ў нас цяпер намеры? Як клаўся спаць, дык старанна запіхваў пад падушку свой саквояж. А еў употай, як быццам баяўся, што адбярэм. Я папрасіў яго даць мне нажа, каб парэзаць хлеб і адчыніць тушонку, — даў. Я запрасіў яго паесьці са мной — адмовіўся. Я пайшоў і прынёс кіпню, пасаладзіў, хоць і без заваркі. Спытаўся, ці ня хоча ён кіпню. Ён не адмовіўся. Я прынёс і яму. Можа, ён баяўся пакінуць свае рэчы, а з саквояжам ісьці па ваду няёмка й нязручна. Так і ехалі — моўчкі, чужыя. А хіба маглі мы быць сваімі? Хто яго ведае.

Пад'яжджаем да нейкай вялікай станцыі. Яраслаўль. Мяне скаланула. Пранесьліся ў памяці страшныя падзеі дзесяцігадовай даўніны — перасылка, санапрацоўка, канвой, голыя нары, цяплушкі. Ці ўсё гэта можна будзе калі забыць?

У Маскву прыехалі ўначы. У вакзал зайшлі ўчатырох, не разышліся чамусьці ў натоўпе. Я спытаўся ў нейкай дзяўчынкі, як нам дабрацца да Беларускага і Кіеўскага вакзалаў. Яна паказала, дзе зайсьці ў мэтро і як даехаць куды нам трэба. Зайшлі ў мэтро ўтрох — чацьвертага згубілі. Я не сьпяшаўся. Першы раз у жыцьці ехаў на эскалятары, але ня ўпаў. На пэроне ўважліва ўсё абгледзеў — як імчацца электрычкі, як самі адчыняюцца і зачыняюцца дзьверы. Усё вельмі цікава, бо ўпершыню ў жыцьці. Але знаёміцца з усім няма часу. На Беларускім вакзале знайшоў касу, дзе мне пракампаставалі білет да Слуцку празь Менск. Да адыходу цягніка заставалася некалькі гадзін. У вакзальным рэстаране (больш не было дзе) я добра і, як мне тады здалося, нядорага пад'еў.

Да Менску цягнік ехаў гадзін дванаццаць, і, калі пад'яжджалі да гораду, ужо зусім разьвіднела. У Менску я мусіў зрабіць перасадку на цягнік да Слуцку. Я тады яшчэ ня ведаў, што да Слуцку зь Менску чыгункі няма і туды давядзецца ехаць аўтобусам сваім коштам. Я гадаў, як мне быць далей. Хутчэй хацелася пабачыць маму, а дзеля гэтага трэ' было кіравацца ў Вільню.

Яшчэ ў Вельску мяне папярэдзілі, што па прыезьдзе ў Слуцак неабходна адразу зарэгістравацца ў міліцыі. А калі я паеду перш у Вільню, ці не пакараюць мяне за гэта? Перамагло жаданьне працягваць паездку да Вільні. Цягнік ішоў да Вільні ці мо' да Калінінграду, а білет у мяне да Слуцку. Я пацікавіўся ў праваднiцы, дзе мне рабіць перасадку на Слуцак. Яна была добрая, спагадлівая жанчына. Завяла мяне ў свае купэ, дастала мапу і мы ўдваіх разглядалі, шукалі, як даехаць да Слуцку. Пастанавілі, што ў Маладзечне трэба перасесьці на цягнік да Баранавічаў, а адтуль — на Слуцак. Доўгая і непажаданая дарога. А можа, наведаць Краснае і Канчаны? Хацелася пабыць тут, але ўсё ж болей хацелася перш пабачыць маму. Не даяжджаючы да Маладзечна, я зноў зайшоў да праваднiцы. Расказаў, куды хачу ехаць і чаму, спытаўся, як мне гэта аформіць. Мы разгаварыліся. Высьветлілася, што два яе сыны недзе ў лягерах у Сыбіры таксама адбываюць тэрміны зьняволеньня. Яна расплакалася. Мне стала няёмка, і я ня ведаў, што рабіць. Крыху супакоіўшыся, яна сказала ісьці на сваё месца і спакойна ехаць да Вільні. У Вільні я зь ёй разьвітаўся, падзякаваў і пажадаў дачакацца сваіх сыноў жывымі й здаровымі.

Вільня. Як яна цяпер выглядае? Захацелася прайсьці па ўсіх знаёмых вуліцах, зазірнуць ва ўсе знаёмыя куточкі. Выйшаў на вуліцу. Не паехаў аўтобусам на другі бок Вяльлі, пайшоў па Зялёным мосьце пехатою. Вось я ўжо перад Вострай брамай. Праезд, як і раней, зачынены. Перайшоў браму. На вуліцы перад ёй, як і даўней, кленчыла шмат людзей з непакрытымі галовамі. Я таксама стаў на калені і хацеў памаліцца, але якія малітвы казаць, калі я на іх усе забыўся? Неяк у душы я дзякаваў Матцы Божай Вастрабрамскай за тое, што жывы й здаровы стаю цяпер перад ёю, прасіў дапамогі пасьпяхова сустрэцца з мамай. А ці ёсьць там цяпер абраз Маткі Божай? Паверх шчыльна закрыты. Але сёньня субота. Можа, у нядзелю яе адчыняюць. Пастаяўшы на каленях яшчэ колькі хвілін, я падняўся і рушыў далей. Вароты і брамка ў Сабор Сьвятога Духа таксама зачыненыя, але па яго тэрыторыі ходзяць людзі, пэўна, зайшлі туды недзе праз другую брамку. Па вуліцах Вялікай і Замкавай я дайшоў да Катэдральнага пляцу. Усё, здавалася мне, безь перамен, як і раней. І Катэдра, і Замкавая гара ніяк не зьмяніліся.

Далей па ўзьбярэжжы Вяльлі церазь Зялёны мост — і нарэшце я на вуліцы Мельнікайтэ. Прайшоў па ёй у адзін бок, вярнуўся. Знайшоў патрэбны дом — двухпавярховы, абгароджаны парканам з жалезных пруткоў. Падышоў да брамкі і ўбачыў ля дому жанчыну, якая нешта выбівала. Я пазнаў яе.

- Мамуся, — гукнуў я. Яна павярнулася і кінула анучу, што выбівала. Зьбянтэжаная, пабегла да брамкі, ледзь ня ўпала — было сьлізка. Нарэшце мы ў абдымках зь сьлязьмі гора перажытага і радасьці дачаканага.

Мама жыла і працавала тут служанкай. У яе быў свой пакой на другім паверсе. Гаспадароў дома не было, яны некуды выехалі і меліся вярнуцца толькі ў нядзелю. Мама карміла мяне і плакала. Яна за гэтыя гады перажыла ня менш за мяне. У 1944 годзе пасьля майго арышту мама жыла ў Канчанах. Стаўленьне да яе з боку Курашоў, і асабліва сына Наталіны Аляксея ды зяця Пасярэніна, было невыноснае. Апрача грубасьцяў і папрокаў, маму ўвесь час палохалі хапуном. А ёй было чаго баяцца. Пры такім да яе стаўленьні і з такім нядаўнім мінулым (жонка польскага сяржанта і сын у лягерах) ад гэтых сваякоў можна дачакацца ўсяго. Мужык Вольгі Ліванаравай Каралькоў у гэты час працаваў у "органах" (НКВД). Да мамы ён ставіўся з удзячнасьцю за мінулае: калі яны з Вольгай пажаніліся, жылі ў нашым доме як адна радня. Каралькоў папярэдзіў маму, што на яе ў органы ўжо зьяўляюцца даносы, і раіў куды-небудзь выехаць. Аднойчы, нікому нічога ня кажучы, мама села на цягнік і, нікім не заўважаная, выехала. Вольга Ліванарава ўпотайкі паднесла да цягніка невялікі клунак самых неабходных рэчаў.

У Летуве маму прыняла яе сястра Ганна, якая жыла ў горадзе Кельме з сынам Мікалаем. Пад выглядам госьці мама жыла то ў Кельме, то на хутары пад Кельме ў пляменьніцы, дачкі брата Аляксея. У 1948 годзе сваяк Ганны (па мужыку), нейкі важны міліцэйскі супрацоўнік зрабіў маме пашпарт і забраў яе ў Вільню. Да 1952 году мама жыла ў яго як служанка. У малым гарадку Кельме і на хутары яна ўвесь час была на вачох у людзей. У Вільні ж у вялікім натоўпе на яе не зьвярталі ўвагі і яна жыла больш свабодна і сьмела, тым больш што ў яе былі дакумэнты. У 1952 годзе гэтага міліцэйскага супрацоўніка перавялі ў іншы горад на падвышэньне. Маму паводле ягонай рэкамэндацыі прынялі як служанку Нявінскія — летувісы. Яны таксама займалі нейкія важныя пасады і жылі на вуліцы Мельнікайтэ, 4, дзе я і сустрэўся з мамай. Мая мама была вельмі працавітая і акуратная, і яны яе надта паважалі й любілі. Яна ўсё гэта мне расказвала і не магла стрымаць сьлёзы. Вось у такіх умовах мама зьбірала мне

пасылкі. Калі стала зразумела, што з Канчанаў, куды яна перадавала, мне высылалі іншае, пасылкі стаў высылаць мамін брат Іван, які цяпер працаваў на нейкай пякарні ў Вільні. У гэтай справе маме шмат дапамагаў і Мікалай Таранда, яе пляменьнік, сын сястры Ганны.

Пакуль не было гаспадароў, мама вымыла мяне ў купелі, дала новую бялізну, шкарпэткі, якія сама вязала, кашулю, прызапашаную для майго прыезду.

Назаўтра ўвечары зьявіліся ўсе Нявінскія. Мама іх сустрэла і сказала, што я прыехаў. Прасіла, каб дазволілі пажыць зь ёй пару дзён. Яны ня толькі дазволілі, але й запрасілі мяне павячэраць зь імі. Пасьля вячэры дзяцей паклалі спаць, а Нявінскі з жонкай доўга сядзелі з намі. Ім было цікава падрабязна даведацца ад мяне аб перажытым за дзесяць гадоў. Я іх яшчэ добра ня ведаў і баяўся пра ўсё расказваць. Нявінскі сказаў, што я магу жыць у іхныхм доме, колькі мне трэба. Ён заўважыў, што я ў вайлаках. А калі даведаўся, што ў мяне другога абутку пакуль няма, прынёс цёплыя чаравікі, ня новыя, але ў іх яшчэ можна было доўга пахадзіць. Назаўтра мама хадзіла на рынак па прадукты і купіла мне нагавіцы. Так я крыху апрануўся і стаў не падобны да вязьня. У такім выглядзе ўжо сьмялей выходзіў за брамку дому.

Аднаго разу ў суботу Нявінскія дазволілі маме правесьці са мною два дні, як нам захочацца. Мы наведаліся да дзядзькі Аляксея. Ён цяпер жыў з сынам Жорыкам. Жорык працаваў таксістам у Вільні, а ягоная жонка Вольга (прыгожая жанчына) — мэдсястрой. Я іх бачыў упершыню. Як і прынята, гасьцей вітаюць бясedай. Сабралі на стол і для нас. Упершыню ў жыцьці я апынуўся за сталом, дзе было болей бутэлек з гарэлкай і півам, чым ежы. Дзядзька Аляксей з сваёй сям'ёй да вайны жыў у Віцебску. Там, за саветамі (як я пасьля зрабіў выснову і, відаць, справядліва), галоўным пачастункам лічылася гарэлка, і чым яе больш — тым лепш. Я да гэтага ня быў прывучаны ў сям'і, а тым больш у зьняволеньні. Кілішкаў не было, а толькі стограмовыя чаркі, і тыя налівалі поўныя. Я хацеў выпіць першую, але папярхнуўся, закашляўся і ад далейшых адмовіўся. Піў толькі піва. Жорык зусім ап'янеў і ня чуў, калі мы з мамай разьвіталіся і пайшлі дамоў. Вось так адбылася нашая першая сустрэча. Ня лепшымі былі й наступныя.

У будныя дні я крыху падарожнічаў па Вільні ў пошуках знаёмых. Але дарма. Нікога не знайшоў і не сустрэў. Даведаўся толькі, што Лютэк Савіцкі, які ў гімназіі арганізаваў струнны аркестар, захварэў і

памёр. Пра гэта мне сказала ягоная маці, якая жыла на старым месцы адна. Мужыка яна таксама пахавала.

Мама хацела, каб я прабыў у Вільні даўжэй. А яшчэ лепш, каб застаўся там назаўсёды. Яна сказала пра гэта Нявінскаму і прасіла разьведаць, ці гэта магчыма. Той, параіўшыся ў адпаведных колах (у яго было шмат важных знаёмых), праз пару дзён паведаміў пра немагчымасьць гэтага. Калі б у мяне не было пазбаўленьня правоў або калі б я ведаў летувіскую мову, можна было б рызыкнуць. А так, пры існым рэжыме, шыла ў мяшку не схаваеш. Ён параіў ехаць, куды было накіраваньне, бо туды зь месца майго звальненьня ўжо, напэўна, пайшлі адпаведныя паперы. Дамовіліся з мамай, што я на пару дзён заеду ў Краснае і ў Канчаны, а адтуль ужо — у Слуцак. Сабраў я неабходныя рэчы (а толькі яны ў мяне й былі) ды дзьве пары бялізны, цёплыя чаравікі, што даў Нявінскі, падручнік ангельскае мовы і слоўнік. Узяў яды, што сабрала мама ў дарогу, і трохі грошай. Па абедзе мама зь сьлязьмі праводзіла мяне на вакзал.

У Краснае я прыехаў, калі на двары ўжо цямнела. Я так і хацеў, бо хто яго ведае, като я, сышоўшы зь цягніка, убачу і як той хтосьці анэнінь нашую сустрэчу? З памяці ўсё не выходзіла сустрэча зь Сьлінкам у 1944 годзе і ягоныя "прывітальныя" словы. Атакіх людзей у Красным і ў Канчанах магло быць і больш. Сустрэча зь імі прыкрая і непажаданая, бо я такіх водгукаў, лічу, не заслужыў. Але ўсё можа быць.

Быў марозны вечар. Я ня ведаў, хто і што на нашым пляцы ў Красным, і таму туды пакуль не пайшоў. Накіраваўся ў Канчаны. Дзедава хата стаяла, як і раней. Насупраць — Ліванараў хлеў, і ля яго з-пад сьнегу выступаў той жа камень, на якім часта Валодзя Ліванараў, сабраўшы сваю каманду, граў вальсы ды долькі на скрыпцы і мандаліне. Побач тады ляжаў іхны сабака Рэкс з абарваным вухам, стары. А калі зайграюць, ён завываў, як быццам хацеў падпець музыкам. Зьбіралася шмат дзяўчат, хлопцаў і сталых людзей. Насупраць, пад плотам дзедавай сядзібы, была лавачка, на якой займалі месцы старыя — мая бабуля Ганулля, бабуля Альжбета Ліванарава ды іншыя. Было весела. Але гэта было ўлетку і ў іншыя часы.

Перад дзедавай хатай, як і раней, агарод на шырыню хаты да самай вуліцы абгароджаны штыкетнікам. З-пад сьнегу ў агародзе тырчаць нейкія сьцяблiны. У куце ад вуліцы калісьці расла вішня, а бліжэй да дому — другая; уздоўж штыкетніку ад вуліцы расло шмат мяты; на астатняй частцы агароду былі градкі з кветкамі. Памятаю, увесну мама наводзіла парадак на гэтай частцы агароду, а я ёй "дапамагаў". Ад маёй дапамогі, вядома, было больш шкоды. Дабраўся

я і да мяты. Зразумела, захацеў яе пакаштаваць. Яна аказалася горкая, і ад гэтага ў мяне пацяклі ня менш горкія сьлёзы, а плачу было яшчэ болей...

Зьлева ад хаты безь перамен: агарод абнесены плотам на пяць жэрдак па вышыні. Паміж гэтымі двума агародамі праезд шырынёй мэтры тры. Вароты на вуліцу расчыненыя і, здаецца, зьнятыя з завесаў і прыпёртыя проста так да плоту. Нягледзячы на сьнежную зіму, праезд да хаты амаль на ўсю шырыню пратаптаны. Во, думаю, колькі ходзіць народу да цёткі Наталіны. У двары зьлева студня і гэты вялікі камень авальнай формы ў папярочным сячэньні. Ляжыць, як і раней, і нават не пакасіўся.

Як апярэдзіў мяне Якуб Колас! Як хочацца і мне сказаць:

Мой родны кут,
Як ты мне мілы...

Гэтыя словы, мусіць, належаць ня толькі паэту. Гэтыя словы – усяго беларускага народу.

Праходзячы паўз вакно, у якім гарэла сьвятло, я ўбачыў празь фіранкі цётку Наталіну за швейнай машынкай. У яе даўно была ручная машынка, на якой яна шмат каму рабіла паслугі як швачка. Я не пастукаў у вакно, а падышоў да дзьвярэй. Дзьверы ўсё тыя, што паставіў мой татусь, кал і мы тут яшчэ жылі. Рабіў іх, здаецца, Стасюкевіч, а кручкі каваў жыд Вукала, вядомы ў Красным і навакольлі каваль.

Я пастукаў. Ніхто не адчыняў. Тады пастукаў у вакно. Цётка Наталіна разгарнула фіранкі і, убачыўшы мяне, пабегла адчыняць. Абдымала, хапала за рукі, і сьлёзы каціліся з вачэй. Я ж яе хросьнік. Безьліч пытаньняў: адкуль, дзе, як, куды, што і г.д. Я ледзь пасьпяваў адказваць і ня мог спытацца пра яе жыцьцё, дзяцей і ўнукаў. Так цягнулася да позьняй ночы.

Дзедава хата была ў даўжыню 12 мэтраў і разьдзеленая на дзьве роўныя часткі капітальнай сьцяной. Раней у гэтай хаце ўсім ставала месца. У 1945 годзе памерла бабуля Ганна, за ёй у тым жа годзе адышоў мужык цёткі Наталіны Кірыла Кураш. У 1948-м памёр сын Віктар. Старэйшы сын Аляксей ажаніўся і пераехаў у Мададзечна. Другі сын Іван пайшоў у прымы да Галі Маршалковіч, а трэці - Сяргей засеў у Красным на нашым пляцы. Дачка Таля выйшла замуж за Канстанціна Пасярэніна, савецкага вайскоўца (тады ён, мабыць, быў лейтэнантам), і жыла ў Чавусах. Нейкі час у хаце жыў дзядзька Іван з жонкай Лідай і сынам Алекам. Цяпер цётка Наталіна жыла адна. Часта да яе наведваліся суседзі і ўнукі. А на дзяцей яна крыўдзілася. Казала, толькі Іван ёй дапамагае.

Жыла цётка ў палове ад вуліцы. Тут было чыста й цёпла. Другая палова, калі я ўранку зайшоў, была ў жудасным стане. Сьцены і столь закураныя, пэўна гадоў дзесяць ня чышчаныя і ня беленыя. Падлога засьмечаная, валяюцца недакуркі. Па ўсім пакоі ў беспарадку расстаўленыя лаўкі. Як высьветлілася, гэтую палову выкарыстоўваў калгас для сходаў, паказу кіно, а моладзь — для танцаў, гульні ў карты і г.д. Карацей кажучы, гэта быў нібыта "красный уголок", а фактычна — "грязный уголок".

Назаўтра я яшчэ вылежваўся ў ложку, як пачуў нейкі жаночы голас. Цётка некаму расказвала, што я прыехаў. Хацеў устаць, але ў пакой, дзе я спаў, зайшла жанчына. Не стрымалася. Гэта была Вольга Ліванарава. Зноў абдымкі, пытаньні і яшчэ пытаньні. Праз гадзіны дзьве завіталі Моцік Цімохаў, Ніна Ліванарава, Сяргей Ліванараў, Кацярына Мяцеліцава. Гэтыя ўвайшлі з падарункамі. Несьлі хто кавалак сала, хто свойскую кілбасу, масла, яйкі, а Моцік нават бутэльку гарэлкі прынёс. Пытаньні, спагады, пажаданьні. Ад Моціка я даведаўся, што Аляксандар Рак таксама быў арыштаваны і недзе ў лягеры памёр. Сьцёпа Яцукевіч працуе ў Цюрлях настаўнікам гісторыі, але вельмі шмат п'е і яго за гэта ўвесь час лаюць, разьвёўся з жонкай.

Нарэшце папаўдні мне ўдалося застацца аднаму і я перабег да Вадодзі Ліванарава. Ён жа мой першы настаўнік ігры на мандаліне, за што я яму вельмі ўдзячны. Ён быў рады, што я на яго не забыўся і наведаў. Адчувалася, што Валодзя хворы, і я ня стаў яму доўга дакучаць.

На другі дзень зайшоў Іван і мы пайшлі да Маршалковічаў. Яны расказалі мне шмат навін. Люба Шумская, зь якой я некалі сябраваў, выйшла замуж. У яе дзьве дачкі. Жыве ў Радашкавічах. Сватам быў Сяргей Кураш. Вось табе й маеш — стрыечны брат! А ён жа добра ведаў пра мае сяброўства зь Любай.

Галя дапамагла мне ўвечары сустрэцца з Жэняй Шыпёнак. І Жэня, і я былі вельмі радыя гэтай сустрэчы. Аднак Жэня не давала мне наблізіцца да яе. Яна з жалем паведаміла пра сваю хваробу. Мне ня верылася, але неўзабаве выйшла, што гэта праўда. Жэня памерла.

На трэці дзень я пабыў на нашым пляцы ў Красным. Там гаспадарыў Сяргей Кураш. Над склепам ён пабудаваў ужо невялікі домік і завяршаў пабудову хаты на фундамэнце нашай згарэлай. Пры сустрэчы ён выглядаў вельмі зьбянтэжаным. Хацеў мяне частаваць, але, калі на стале першай зьявілася бутэлька з самагонкай, я ад пачастунку адмовіўся. Ён ня надта і настойваў. Памяняў мне целагрэйку на паўпаліто мясцовага пашыву, якія тут цяпер былі ў модзе. Разьвітаўшыся, я накіраваўся ў цэнтар Краснага. Думаў пабачыцца з Паплаўскімі.

Знайшоў іхную хату, але там нейкая бабулька сказала, што іх ня будзе яшчэ цэлы тыдзень. Па дарозе ў Канчаны сустрэў Валю Сьвечку. Раней мы неаднойчы сустракаліся ў Курашаў. Яна расказала, што сябруе з Воляй Бубен і ведае пра мае зь ёй дачыненьні. Воля выйшла замуж, у яе дзьве дачкі, жыве ў Маладзечне.

З такімі ня вельмі добрымі для мяне весткамі я пакідаў Канчаны і Краснае, не знайшоўшы тут патрэбнай падтрымкі і надзеі на яе. Сабраў свой саквояж, што даў мне ў Вільні Нявінскі, і ўранку 12 лютага, разьвітаўшыся зь цёткай Наталінай, рушыў на станцыю. Па дарозе з аднаго двара мяне нехта пазваў. Я спыніўся і пазнаў стрыечнага брата маёй мамы Мікалая Балаховіча (так яго звалі вяскоўцы, а сапраўднае прозьвішча — Харытон). Ён запрасіў мяне ў хату. Я вельмі сьпяшаўся, але падумаў, што непрыстойна адмаўляцца ад запрашэньня дзядзькі, і зайшоў. Адразу ж мяне распранулі і пасадзілі за стол. Тут — зноў бутэлька з гарэлкай. Я выкручваўся, што не прывучаны да гарэлкі і што яна чалавека дурыць, а мне трэба быць цьвярозым хоць бы пакуль аформлюся на працу. Дзядзька Мікалай не прымушаў, ён разумеў, у якім стане я цяпер знаходжуся. Адбыўшы павіннасьць за сталом, я падзякаваў і пасьпяшаўся на станцыю. Дзядзька Мікалай даў мне на дарогу кавалак сала, кілбаску і 30 чырвонцаў. Дзеля прыстойнасьці я аднекваўся, але ўзяў. Такія дружныя былі Банадыські.

Зь Менску ў Слуцак можна было даехаць аўтобусам або на спадарожнай машыне. Я выбраў больш надзейны сродак транспарту — аўтобус, бо ня ведаў, дзе шукаць спадарожнай машыны і дзе мне трэба будзе выходзіць. Аўтобусы зь Менску ў Слуцак хадзілі толькі два разы на дзень, і адзін аўтобус ішоў праз Слуцак на Старобін. У Слуцак я прыехаў папаўдні, вось-вось пачынала цямнець. Да цямна пасьпеў знайсьці вуліцу 1 Мая, дзе жыў Місюк, якому я вёз ліст ад брата. У незнаемым мне пакуль Слуцку Місюк і ягоная сястра дапамаглі знайсьці кватэру на вуліцы Вялікае Кальцо, непадалёк ад цэнтру. Пакойчык 2х4 мэтры з ложкам і маленькім столікам ля вакна. Гаспадар — украінец, трактарыст у калгасе, гаспадыня — служанка, нідзе не працавала. У хляве стаяла карова і рохкаў парсючок. Дамовіліся, што я буду ў іх харчавацца. За ўсё, як мне здалося, ня вельмі вялікая плата. Калі харчавацца разам, дык я выклаў свае пажыткі таксама на агульнае карыстаньне. Гэта ім спадабалася, і, колькі я жыў у іх, гаспадыня глядзела мяне як свайго.

У панядзелак я пайшоў у міліцыю. Дзяжурны накіраваў мяне да начальніка. Той разгледзеў маю даведку, зрабіў там адзнаку, запісаў у сваю кніжку і накіраваў мяне ў пашпартны стол на прапіску. Параіў больш не займацца антысавецкай дзейнасьцю і ня вельмі расказваць,

дзе быў і што рабіў. Яшчэ раз нагадаў мне, што значыць "пазбаўленьне правоў".

З пашпартнага стала я зайшоў у школу № 1, што знаходзілася побач зь міліцыяй. Можа, думаю, знойдзецца праца. Дырэктар школы Ф. Ф. Ілюкевіч разьвёў рукамі: школа ўкамплектаваная настаўнікамі. У мяне не было ніякіх дакумэнтаў, што пацьвярджалі маю адукацыю, і, нават калі б месцы былі, мяне на работу не ўзялі б. Дырэктар параіў не марнаваць часу на пошукі працы ў гарана і ў іншых школах.

— З вашым мінулым на пэдагагічную работу варта забыцца. Такі час, — шчыра сказаў ён.

Я пацікавіўся яшчэ, ці можна мне здаць экзамэны за 10 клясаў экстэрнам. Гэта ў іх не практыкавалася. Адзінае выйсьце — падаць заяву, здаць экзамэны ў дзясятую клясу, правучыцца там год і здаваць экзамэн з усімі на агульных умовах.

Зайшоў на пошту, на электрастанцыю, але нідзе нічога мне не паабяцалі. Па дарозе дамоў пазнаёміўся з гарадзкой бібліятэкай. Думаў узяць там патрэбных падручнікаў, каб рыхтавацца да экзамэнаў, але ніякіх падручнікаў там не было. Расчараваны вярнуўся дамоў.

За вячэрай мой гаспадар сказаў, што каля млынкамбінату будуецца некалькі домікаў і там павінны пачаць будаўніцтва элеватару. Назаўтра я пайшоў да млынкамбінату. Там сапраўды заканчвалі будоўлю двох дамоў. Адзін, паводле выгляду, прызначаўся для канторы, другі — для жыльля. Рабочыя паказалі мне старую кантору - барак. Мяне прыняў начальнік будаўнічага ўпраўленьня Рэзьнік, як мне пасьля расказалі, — былы партызан, жыд. Гутарыў ён са мной доўга і лагодна. Паабяцаў прыняць на працу тынкавальнікам, але як крыху пацяплее і дамы будуць гатовыя пад атынкоўку. Я напісаў заяву, а ён падпісаў яе і аддаў Эле Яфімаўне з бухгальтэрыі. Мне сказаў прыходзіць 22 сакавіка, але можна наведвацца і раней.

Што ж рабіць цэлы месяц? Не памятаю, як я зьвязаўся з Таляй Пасярэнінай, дачкой цёткі Наталіны, якая жыла тады ў Чавусах. Яна запрасіла прыехаць да іх. На станцыі ў Чавусах мяне сустрэў яе мужык і завёз у вайсковы гарадок, дзе яны жылі. У кватэры пратрымалі цэлы дзень, кармілі, спрабавалі паіць. Я ўжо патроху пачынаў піць, але ня гэтулькі, колькі хацеў бы Пасярэнін. Яму хацелася выпіць, але не было з кім, а я стварыць яму кампанію быў ня здольны. Крыху (хоць ужываным) абнавілі мой гардэроб, на дарогу далі трохі грошай.

Вярнуўшыся ў Слуцак, я не гуляў. Здабыў некалькі падручнікаў у кнігарні, крыху ў суседзяў. Паўтараў, рыхтаваўся да экзамэнаў.

На працу я выйшаў за тыдзень да таго, як мяне афармілі, — 15 сакавіка. Брыгада толькі фармавалася. Уручную лушчылі дранку для

абіваньня драўляных сьцен і столі пад атынкоўку. Рэзьнік не хацеў прызначаць мяне па шостым разрадзе. Не было выйсьця, і я згадзіўся на чацьверты. Са мной у брыгадзе працавала ўжо дзесяць чалавек - пяць мужчын і пяць жанчын. Тынкавальнікі слабыя: зь пяці жанчын, як высьветлілася, толькі адна магла трымаць кельму ў руках. Атынкоўку пачалі з канторы млынкамбінату. Ва ўсіх пакоях мусілі зрабіць карнізы, а ў вэстыбюлі стаялі чатыры калёны зь пераменным сячэньнем і капітэльлю. Брыгадзір быў нечым заслужаны, але ў будаўнічых справах слабы, таму раіўся са мной і лічыўся з маім меркаваньнем. Атынкоўку пачалі з вэстыбюля. Ён увесь быў застаўлены рыштаваньнем пасьля мулярных работ, і, каб зрабіць доступ да другіх пакояў, трэ' было атынкаваць яго і разабраць рыштаваньне. Была й іншая прычына, дзеля якой я ўпарта прапаноўваў пачынаць з вэстыбюля. Тут, у адным памяшканьні, я хацеў і мог паказаць свае здольнасьці, каб мяне афармілі па шостым разрадзе. А гэта вельмі важна пры налічэньні заробку.

Рэзьнік намерваўся шукаць спэцыялістаў, але, мабыць, успомніў пра мае прэтэнзіі. Сабраў для гэтага брыгаду. Я запэўніў яго, што, калі мае патрабаваньні будуць выкананыя, — карнізы, калёны, капітэлі ды іншае аздабленьне нашая брыгада зробіць без чужых майстроў. Рэзьнік ня надта верыў у нашыя магчымасьці, але паабяцаў: як толькі ўбачыць вынік хоць у адным пакоі, мае патрабаваньні будуць выкананыя. Пакуль брыгада тынкавала столь і верхні ярус сьценаў, я рыхтаваў у сталярні шаблёны і маячныя рэйкі. Дамовіліся з мэханікам, і ён зрабіў мне камплект маячных прыстасоваў з жалезнай палоскі для выцягваньня крывалінейных карнізаў. (На Поўначы ў Інце мне даводзілася рабіць падобныя цягі, але тады я карыстаўся вяроўкай і алябастрам. Выходзіла гэта вельмі марудна і малаэфэктыўна. Тады ў мяне была думка зрабіць нешта з жалеза, але ўмовы лягеру не далі такой магчымасьці.) Пазьней я дапамог мэханіку аформіць гэта як рацыяналізатарскую прапанову і атрымаць нагароду, а мне гэта палегчыла працу.

Восем дзён сакавіка — гэта вельмі мала, але я мусіў хоць як пераканаць Рэзьніка ў нашых магчымасьцях. Столь у вэстыбюлі ўжо атынкавалі, сьцены яшчэ тынкавалі, карнізы выцягнуць не пасьпявалі, і я пастанавіў зрабіць хоць па цэнтры столі разэтку, якая плянавалася па праекце. Разэтка атрымалася выдатная. Мы зрабілі вакол яе прыцірку тынкоўкі, і, беленькая на фоне зелянявага тынку, яна выглядала вельмі важна. Прараб Глінскі, відавочна, расказаў пра гэта Рэзьніку, і

той нечакана зьявіўся на аб'екце. Агледзеў зьнізу, потым падняўся на рыштаваньне. Мы навешвалі маячныя рэйкі пад цягу[12] карнізаў. Рэзьнік быў задаволены. Падпісаў загад аб прыняцьці мяне тынкавальнікам шостага разраду.

На пачатку красавіка атрымалі першы заробак за восем дзён. Не памятаю, ці шмат я атрымаў. Але гэта мая першая "палучка" на свабодзе. "Трэба замачыць", - сказалі мне, і гэта была мая першая "замочка", але ў меру. Брыгадзіру і аднаму з хлоппаў падалося, што мала, і яны недзе ў горадзе дадалі. Ды гэтак дадалі, што трапілі ў міліцыю і, здаецца, надоўга, бо кагосьці пабілі. Рэзьнік "разжалаваў" брыгадзіра і прапанаваў мне ўзяць кіраўніцтва брыгадай. Я згадзіўся. Калі мы атрымалі заробак за красавік, да мяне падышла адна з тынкавальніц і цішком падала пачак грошай. Я ня мог зразумець за што. Высьветлілася, што тут завядзёнка — зьбіраць з усіх грошы для брыгадзіра. Я загадаў зараз жа вярнуць грошы і болей гэтым не займацца. Гэта ня лягер. Акрамя таго, адмяніў усе п'янкі, затое ўвёў сьвяткаваньне дзён нараджэньня кожнага з нас. Гэта ўсім, асабліва жанчынам, вельмі спадабалася.

Летам мне не пашанцавала. Распухла і вельмі балела нага. Я ня мог хадзіць. У паліклініцы мне далі бальнічны і прыпісалі таблеткі і ўколы. А мая гаспадыня прывяла нейкую бабку, і тая пачала загаворваць і паліць над хворай нагой кудзелю. Кажуць, была рожа. Паліклініка знаходзілася далёка ад майго дому, і хадзіць туды на ўколы было вельмі цяжка. Мэдсястра, якая калола мяне, жыла непадалёк ад мяне. Я крыху жартам, крыху сур'ёзна запрапанаваў ёй калоць мяне дома, і яна згадзілася. Звалі яе Надзя. Дзень за днём - і мы пасябравалі, а паправілася нага - сталі вечарамі сустракацца, хадзілі разам у кіно, у Дом афіцэраў, на танцы ў парк.

У жніўні я здаў экзамэны і быў залічаны ў дзясятую клясу вячэрняй школы. 1 верасьня пачаліся заняткі. Было цяжкавата: з працы бег дамоў, пасьля ў школу, а затым яшчэ на сустрэчу з Надзяй. Надзя пачала шукаць кватэру для сябе бліжэй да паліклінікі, а для мяне — бліжэй да школы. Знайшла. Да зімы я перабраўся на вуліцу ля самага рынку і школы. Надзя жыла на той жа вуліцы насупраць мяне. Вучыўся я пасьпяхова. З працай таксама спраўляўся. Рэзьнік быў задаволены і ў калектыве хваліў мяне, хоць часам я ня ведаў за што.

Яшчэ ў пачатку лета, у нядзелю, я ўзяў у свайго гаспадара ровар і паехаў у бок Старобіну. Хацеў знайсьці вёску Чапялі, адкуль мой бацька. Доўга шукаць не давялося, бо гэта вялікая веска ўздоўж

---

[12] Выраб карнізаў тынкавальнікі называюць цягай карнізаў.

дарогі на Старобін. Праяжджаючы па Чапялёх, я ўбачыў у адным двары жанчыну і запытаўся ў яе, ці ня ведае яна, дзе жыве Ліда Апанасаўна Дым. І трэба ж так трапіць — гэта была менавіта мая стрыечная сястра Ліда. Таго ж дня пазнаёміўся яшчэ зь яе маткай Васілісай, сястрой майго таты, і зь яе сынам Паўлам. Іхныя хаты стаялі побач: невялікія, крытыя саломай, усярэдзіне не атынкаваныя і з глінабітнай падлогай. Як мне сказала Ліда, у Чапялёх толькі ў дзьвюх хатах падлога з дошак. Ліда і ейны мужык працавалі ў школе настаўнікамі. Я не ўяўляў сабе, што ў наш час людзі маглі жыць так бедна. Пазьней, у іншыя выходныя, калі я прыяжджаў сюды, пазнаёміўся з другімі нашчадкамі роду Дубовікаў і зь іхнымі суседзямі. Народ тут вельмі працавіты й зычлівы. Павел падарыў мне фотаапарат, які ён прывёз з вайны, і я захапіўся фатаграфаваньнем. Але часу на гэта не ставала, дый грошай лішніх не было, каб заняцца гэтым сур'ёзна.

У маёй брыгадзе тым часам працавала шэсьць жанчын: Воля, Валя, Маня, Зіна — дзеўкі, Тамара - разводная і замужняя Валя. Усе стараліся мне дагаджаць як маглі, каб зьвярнуў на каторую ўвагу. Але ўсё дарэмна. Я быў асьлеплены Надзяй. Тады яны прыдумалі пасварыць мяне зь ёй. Сталі шукаць, як цяпер кажуць, кампрамат. Некалькі разоў я чуў дакоры, што гуляю з жыдоўкай, калі навокад шмат прыгожых беларускіх дзяўчат. Я гэтага ня ведаў, бо Надзя са мной размаўляла па-беларуску. Мне тое падабалася, і я быў упэўнены, што яна беларуска. Але я ўвогуле мала ведаў пра яе і чамусьці не імкнуўся даведацца больш. Я ведаў, што яна з Грозава, што была замужам, але разьвялася. Пару разоў я прапанаваў ёй пажаніцца, але яна аднеквалася, спасылаючыся на тое, што яшчэ мала мяне ведае. Нашае зблізкэньне канчалася толькі пацалункамі. Большага яна не дазваляла, казала — да жаніцьбы, а жаніцьбу таксама адкладала. Я адчуваў нейкую няшчырасьць.

Аднойчы зноў зайшла размова пра жаніцьбу. Гэта было ўжо ў красавіку 1955 году. Яна тады выказала свае падазрэньні, што я, закончыўшы вячэрнюю школу, захачу паступіць у інстытут. А калі паступлю, мне спатрэбіцца грашовая дапамога, каб вучыцца. Вось дзеля чаго я быццам хачу ажаніцца зь ёй. У мае пляны гэта не ўваходзіла. Надзя не была нагэтулькі багатай, каб я разьлічваў на яе грошы. Я адчуў сябе вельмі абражаным, але пакуль прамаўчаў.

Аднойчы Надзя была ў мяне і ёй трэба было выйсьці. Яна пабегла на вуліцу, а на стале пакінула сваю сумачку. Безь ліхога намеру я прачыніў сумачку і ўбачыў там яе пашпарт. Ён мяне зацікавіў. Я мог праверыць тыя плёткі, што даходзілі да мяне ўсё часьцей. Я разгарнуў

пашпарт: нацыянальнасьць — "еврейка", далей запісы пра шлюб і развод, а яшчэ далей — пра двох сыноў, не памятаю іх імёнаў. Вось гэта навіна! Я хутка загарнуў пашпарт і паклаў яго назад. Прыйшла Надзя, але я не падаў выгляду, што мне сталі вядомыя такія дэталі яе жыцьця. Запрапанаваў Надзі сустракацца ня кожны дзень, як мы гэта рабілі, а раз на тыдзень, каб у мяне было болей часу для падрыхтоўкі да экзамэнаў. Вядома ж, даць згоду на гэта яна не хацела. А я быў задаволены, што бяз сваркі і дадатковых тлумачэньняў зьявілася нагода аддаліцца ад Надзі хоць часова, а можа, што я ўжо меркаваў, і назаўсёды.

У другой палове красавіка мая стрыечная сястра Зіна нарадзіла дачку. На 1 траўня прызначылі хрэсьбіны і запрасілі мяне прыехаць. На хрэсьбінах мне спадабалася Зініна кума Надзя Пятровіч, сястра Зінінага мужыка Мішы. Пакуль ішло гуляньне, я ў яе добра закахаўся, тым больш што з слуцкай Надзяй пастанавіў больш ня мець ніякіх справаў. 2 траўня гулялі ўжо ў кума, а затым — у кумы. Такі тут звычай. Я замацоўваў сваё знаёмства і пачуцьці. У наступную нядзелю зноў прыехаў у Чапялі і большую частку дня правёў у Чэканаў - так звалі вяскоўцы сям'ю маёй новай Надзі.

Звычайна, калі я прыяжджаў у Чапялі, перш-наперш заходзіў да Ліды. У яе начаваў, калі даводзілася, і ад'яжджаў таксама ад яе. Яна была маім апекуном. У гасьцёх садзілася побач са мной і сачыла, каб я ня вельмі выпіваў, а калі й выпіваў, каб добра закусваў. У гэтую нядзелю я таксама зайшоў да Ліды. Заявіў — буду жаніцца. Яна думала, што я жартую, але потым зразумела, што я сказаў сур'ёзна. Дамовіліся, што ў наступную суботу я прыеду пасьля абеду і мы пойдзем да Чэканавых у сваты. Сватамі ўзялі Лідзінага мужыка — Хведара Краўца і мужыка другой стрыечнай сястры Шуры - Валодзю Марака[13]. Так і зрабілі. Начаваць я застаўся ў Чэканавых, а ў нядзелю 15 траўня, як сабралася ўся кампанія, пайшлі ў сельсавет і расьпісаліся. Ніякага вясельля, ніякага пасагу. Увечары сабралі ў клунак Надзіны рэчы, выйшлі на дарогу і на спадарожнай машыне выправіліся ў Слуцак.

У Слуцку я загадзя памяняў кватэру. Зьняў асобны невялікі пакойчык на вуліцы 4-й Працоўнай, 19/4. Днём, як заўсёды, хадзіў на працу, потым — у школу або на экзамэны ў вячэрнюю школу. Надзя заставалася дома. Пасябравала з гаспадыняй і дапамагала ёй на агародзе. Вольнымі вечарамі я вадзіў Надзю ў кіно, у Дом афіцэраў, у парк на танцы. Яна дагэтуль нідзе не была, акрамя Чапялёў.

---

13 Мараком яго звалі ў вёсны, бо ён служыў у марфлоце, а сапраўднае прозьвішча яго — Клішэвіч.

Тыдні праз два ці тры прыехала да нас зь Вільні мая мама. Безумоўна, ёй хацелася б мець іншую нявестку. Але як я выбраў такую — бедную і неадукаваную, яна скарылася. Мы ўтраіх пабывалі ў Чапялёх. Мама ўпершыню пазнаёмілася з крэўнымі майго бацькі, яе мужыка, і з бацькамі Надзі. Маму ўразіла бяднота, у якой жылі людзі. Яна такога яшчэ ня бачыла нідзе — ні ў Заходняй Беларусі, ні ў Летуве. Але яе зьдзівіла і тая шчырасьць, зычлівасьць і ветлівасьць людзей, зь якой яны ставіліся да нас. Адна Надзя — мая мама - убачыла, у якой бядноце і галечы жывуць людзі, другой Надзі — маёй жонцы — давядзецца спазнаць іншае, што ёй, магчыма, падасца раскошай.

Неяк раз я выйшаў з прахадной млынкамбінату і накіраваўся дамоў. Насустрач ішла першая Надзя зь сяброўкай. Яны ішлі на выезд з Слуцку, каб на спадарожнай машыне даехаць да Грозава. Прывіталіся. Надзя адразу выказала незадавальненьне, што мы ўжо амаль месяц не сустракаемся. Яна заходзіла на маю старую кватэру. Гаспадыня-бабулька паведаміла ёй, што я перасяліўся, але куды, невядома. Я пацьвердзіў гэта і сказаў, што больш мы сустракацца ня можам і ня будзем, бо я жаніўся. Яна расьсьмяялася. Не паверыла. У мяне з сабой быў пашпарт, і я паказаў ёй запіс аб шлюбе. Тут яна спахмурнела. Не памятаю, пра што мы далей зь ёй гаварылі. Я расхваліў сваю жонку, што яна багатая і я сьмела буду вучыцца за яе кошт, што яна, як і я, вельмі любіць і хоча дзяцей і што, можа, празь дзевяць месяцаў мы будзем бацькамі — мы ўжо паклапаціліся пра гэта. Пасьля мне зрабілася сорамна за такія заявы ды шкада яе, і я прапанаваў ёй застацца сябрамі. Больш я зь ёй не сустракаўся, бо неўзабаве мы выехалі з Слуцку.

Атрымаўшы атэстат сталасьці, я сабраў неабходныя даведкі, напісаў заяву, аўтабіяграфію, запоўніў лісток па ўліку кадраў і здаў усё у Беларускі політэхнічны інстытут. Там было завочнае аддзяленьне Ленінградзкага індустрыйнага інстытуту. На час экзамэнаў завёз Надзю ў Чапялі, а сам паехаў у Менск. У вольныя ад экзамэнаў дні жыў у Канчанах. Неяк даведаўся, што пачалася распрацоўка балота Чысьць. Там плянавалі, а мо' і пачалі ўжо будаўніцтва торфапрадпрыемства і жылога пасёлку. Пасьля здачы экзамэнаў я наважыўся на ўсялякі выпадак зазірнуць туды.

Да Чысьці, як мне сказалі, кілямэтры тры-чатыры. Гэта недзе паміж Касьцюшкамі і Асаўцом. Прыкладна паміж гэтымі дзьвюма вёскамі я і ўзяў кірунак свайго падарожжа. Блудзіць не давялося. У гэтым кірунку ўжо ішлі нейкія работы - высыпалі пяском дарогу, але невядома — пад чыгунку ці пад аўтадарогу. Але ня гэта важна. Важна, што кірунак я ўзяў правільны. Так я прайшоў нізіну, за якой

справа непадалёк былі відаць Касьцюшкі. Падняўся на невысокі пагорак, зарослы невялікім хвойнікам. Там, удалечыні паміж хвоек, убачыў нейкую будоўлю. Я пайшоў туды. Гэта будаваўся вялікі, як мне падалося, па плошчы дом каркаснай канструкцыі. Адно ягонае крыло, праўда невялікае, было ўжо накрытае. Як сказаў мне адзін чалавек, там разьмяшчалася кантора. А ў канторы дзяўчынка паказала, дзе кабінэт начальніка. Прыймальні і сакратара не было. Я пастукаў і, калі адтуль пачуўся голас, зайшоў. Мяне прыняў кіраўнік будоўлі Буістаў. Ён, выглядала, ня вельмі куды сьпяшаўся, і мы даволі доўга размаўлялі. Буістаў сказаў, што да вясны тынкавальнікі ім не патрэбныя. Можа, толькі такія, што ўмеюць працаваць з сухой тынкоўкай. Я зь ёй ня меў справы, але чытаў пра спосабы яе выкарыстаньня ў часопісе "Строитель". Сказаў пра гэта Буіставу, і недарма. Той запрасіў мяне, калі не перадумаю, пераяжджаць да яго на працу, падабраць пакуль невялікую брыгаду, чалавек пяць. На зіму работы хопіць, а ўвесну — будзе ўдосталь. Да кастрычніка абяцаў нікога ня браць.

У Слуцку мяне чакала непрыемная размова з Рэзьнікам. Ужо ішло поўным ходам будаўніцтва элеватару. Яго бэтанавалі ў пад'ёмнай апалубцы. Брыгада тынкавальнікаў зацірала бэтонныя сьцены ўнутры банак. Другой працы ім не было. Рэзьнік папракнуў мяне, што тым часам як на элеватары гэтулькі працы, я разьяжджаю па інстытутах, займаюся жаніцьбай ды іншай непатрэбшчынай. Я не разумеў, у чым прычына такой раптоўнай перамены ў стаўленьні да мяне. Хваліў мяне, я быў добрым работнікам і брыгадзірам, і на табе — стаў злачынцам, хоць выганяй. За маю адсутнасьць Рэзьнік паставіў на мае месца іншага брыгадзіра. А мяне, быццам з тае прычыны, што няма адпаведнай шостаму разраду працы, хацеў перавесьці на трэці. Я ня хмог на гэта пагадзіцца і падаў заяву на звальненьне. Мае дзяўчаты, як і ўсе жанчыны, заўсёды вельмі шмат ведалі, і на гэты раз яны былі ў курсе апошніх падзеяў. Яны растлумачылі прычыну такіх зьменаў у стаўленьні Рэзьніка да мяне. Высьветлілася, што бацька Надзі, зь якой мы рассталіся, працуе ў Грозаве вэтэрынарам. У часе вайны яны з Рэзьнікам служылі ў адным партызанскім аддзеле і цяпер працягвалі сяброўства. Пакуль я сустракаўся з Надзяй, было спадзяваньне на мяне як на новага і нядрэннага, на іхную думку, зяця. А як ажаніўся з другой Надзяй, зьнікла і цікавасьць да мяне. Мне ўжо ўсё гэта было абыякава. Шкада толькі, што марна пражыў гэты год.

З выпіскай з Слуцку ў міліцыі праблем не было. У канцы верасьня паехаў у Менск, у інстытут. Забраў дакумэнты, бо мяне не прынялі. Набраў з дваццаці пяці дваццаць тры балы і не прайшоў па конкурсе.

Ну што ж, налета зноў буду паступаць, мо' прайду. Заехаў на Чысьць. Аформіўся з 5 кастрычніка брыгадзірам тынкавальнікаў. А пакуль паехаў у Чапялі. Сабралі мы з жонкай свае рэчы ў два клункі і на спадарожнай машыне прыехалі ў Менск. Зь Менску ехалі чыгункай, Надзя першы раз у жыцьці. Ёй гэта было вельмі цікава, але, відаць, і боязна, бо ўсю дарогу тулілася да мяне. А яшчэ яе вельмі дзівілі краявіды. Было ўжо, праўда, цёмна, але гэта яшчэ больш узмацняла яе зьдзіўленьне. Ад Чапялёў да Слуцку і далей аж да Менску цягнецца раўніна, а тут, ёй здавадася, едзем то ўгору, то ўніз. У Краснае прыехалі, калі было зусім цёмна.

У першы дзень на працы я пазнаёміўся з прарабам Гер'ятовічам і агледзеў аб'екты. Буістаў даў мне адрасы дзьвюх дзяўчынак-тынкавальніц: адна з Касьцюшак, другая з Асаўца. Абедзьве Ганулі. Дамовіліся, што першы тыдзень мне будуць плаціць паводле тарыфу шостага разраду. Я за гэты час мушу замовіць патрэбны інструмэнт і прасачыць, каб яго зрабілі, як мае быць. Назаўтра ў Менск ехаў інжынэр па забесьпячэньні. Буістаў паслаў зь ім мяне, каб я выбраў, што патрэбна. Зь Менску мы прывезьлі кельмы, адразоўкі, гладзілкі, малаткі ды іншую дробязь. У сталярні працаваў толькі адзін хлопец-эвангеліст, які, як высьветлілася, памятаў мяне па Беларускай краёвай абароне. Ён быў вельмі акуратны і дакладны ў справе спэцыяліст-сталяр. Парабіў нам цёркі, паўцёркі, правідлы, тынкавальныя скрынкі, акаронкі. За тыдзень я пазнаёміўся з Ганулямі. З Асаўца прыйшла яшчэ адна тынкавальніца, таксама Гануля. Усе аформіліся па чацьвертым разрадзе з 15 кастрычніка. Перад брыгадай тынкавальнікаў паставілі задачу — да Новага году атынкаваць сухім спосабам неабходны пакой для канторы, краму і сталоўку, і мокрым — кухню. Такая задача для чатырох чалавек вельмі цяжкая. Буістаў сказаў мне самому шукаць людзей, колькі трэба. Неяк у размове прараб Гер'ятовіч спытаўся, ці ня ўзяў бы я ягоную жонку Зіну ў сваю брыгаду, хоць яна пра тынкоўку нічога ня ведае. Як жа свайму начальніку адмовіш?

- Навучым. Хай афармляецца, — згадзіўся я.

Праз колькі дзён зьявілася Вера, жонка трактарыста, а яшчэ знайшлі аднаго хлопца — Смалонскага, здаровага й вельмі стараннага ва ўсіх справах. Увесну давялося аддаць за яго адну з асаўлянскіх Гануль.

Пастаўленую задачу выканалі. З новага 1956 году запрацавала сталоўка і крама. Ня трэба ўжо ламаць галаву, дзе ўзяць бохан хлеба, каб увечары пакарміць жонку і цётку. Можна лёгка купіць цукру і крупаў, цукерак, а часам і кілбасы — былі б грошы. Працы ставала, і плацілі за яе нямала. Усе былі задаволеныя — і мы, і кіраўніцтва.

Пакуль я прабіваўся на працоўным фронце, Надзя таксама не марнавала часу. Увосень хадзіла ў калгас выбіраць бульбу і ўхітралася прыносіць дамоў два-тры вядры, хоць давалі толькі па адным. Хадзіла на малатарню. Наводзіла ў хаце парадак. Да нас часта заходзілі ВольгаЛіванарава і Моцік Цімохаў. Яны прыносілі малако і не хацелі браць ніякай платы. Зімой у хаце рабілася халаднавата. Паліць у печы не было чым. Сяргей Кураш абяцаў дровы (тут жа жыла ягоная матка), але абяцанкі так і засталіся абяцанкамі. З дрывамі дапамагаў дзядзька Цімох. Той, бывала, адкладзе бярэмя, каб ня бачыла ягоная жонка Надзя, зойдзе да нас і скажа, каб мая Надзя ішла ды забрала. А раз узяў каня ў калгасе, пазваў цётку Наталіну і маю Надзю і паехалі ў Сьніткаў лес па дровы. Надзя тады была ўжо на шостым месяцы цяжарнасьці. Дзякаваць Богу, ніякай бяды ня здарылася. Бывала, і я прыносіў з працы бярэмя дроваў, калі нічым не атаварваўся ў краме. Часам прыходзіў Іван. Гэты заўсёды што-небудзь прыносіў — то малака, то сыру, то кавалак сала ці мяса.

26 сакавіка, ідучы дамоў, я зайшоў у сталоўку, каб узяць дамоў чаго пад'есьці. Там сядзеў Сяргей з рабочымі, пэўна зьбіраліся выпіць. Ён мне сказаў, што днём маю Надзю завезьлі ў Маладзечна ў бальніцу. Уранку, калі мяне ўжо не было, у яе забалеў жывот. Цётка Наталіна хутка сабралася, і яны з Надзяй пайшлі ў Краснае ў паліклініку. Там яе агледзелі і загадалі тэрмінова везьці ў Маладзечна ў раддом. Цётка неяк хутка знайшла Сяргея, і той даў самазвал, на якім завезьлі Надзю ў Маладзечна. 29 сакавіка 1956 году жонка нарадзіла дзяўчынку, якую мы назвалі Верай. 7 красавіка, на Дабравешчаньне, Сяргей зноў даў мне самазвал і я паехаў па Надзю з дачкой. Надвор'е было страшэннае. Панавявала гурбы сьнегу. Але мы пасьпяхова даехалі ў Канчаны. Пачаліся адведкі. Прыходзілі ўсе Банадыські з падарункамі. Праз пару дзён непагадзь крыху супакоілася і дабраліся да нас мая і Надзіна мамы. Хрысьціў Веру айцец Віктар у дзедавай хаце — у царкву яе несьці пабаяліся з прычыны пагрозы перасьледу.

Здарылася невялікая для нас непрыемнасьць. Цётка Наталіна з таго, што прынесьлі Надзі ў адведках, сабрала самае каштоўнае і перадала дачцэ Талі ў Баранавічы, а, як прыехала мая мама, яе не было чым і пачаставаць. Крыўдна, але мусілі цярпець. Выйсьця не было. На Чысьці абяцалі кватэру, але яны яшчэ толькі будаваліся. У Сяргея на нашым пляцы хата яшчэ недабудаваная, але і ён неяк сказаў, што іх пяцёра і ім самім цесна (хоць і не на сваёй зямлі). Аднойчы Вольга Ліванарава расказала нам, што, калі мы прыехалі, цётка Наталіна пасьпешліва пераафарміла дзедаў дом у сельсавеце на сваю дачку Талю. Мусіць, баялася, што я магу завалодаць ім або хоць яго часткай.

У такіх умовах жыць ня вельмі прыемна. Цярпелі, а Надзя цішком часам пускала сьлязу.

16 студзеня 1957 году мяне выклікалі ў Мачадзечна ў ваенкамат. З сабой трэ' было мець пашпарт, даведкі аб вызваленьні, зь месца працы і зь сельсавету, дзе я жыву. Нейкія вайскоўцы правялі са мною размову, а затым заявілі, што зь мяне здымаецца далейшае абмежаваньне ў правох. Мне выдалі вайсковы білет.

Улетку я здаў дакумэнты ў Беларускі дзяржаўны ўнівэрсытэт і ў ліпені пачаліся ўступныя экзамэны. Адпачынку ня браў, а на дзень экзамэну адпрошваўся. Гэтым разам паступаў на матэматычны факультэт. Не пакідаў спадзяваньня на пэдагогіку. Здаў чатыры экзамэны на пяць, а расейскую мову - на тры. Зноў не прынялі. Прычына - не прайшоў па конкурсе, а яшчэ — паступаў не па спэцыяльнасьці. Расчараваны, забраў дакумэнты.

Даведаўся, што ў Маскве яшчэ можна паступіць у Ўсесаюзны завочны інжынэрна-будаўнічы інстытут (ВЗИСИ). Адразу ж у Менску ў БДУ сеў і пачаў рыхтаваць дакумэнты ў Маскву. Да мяне падсеў нейкі таксама няўдачнік, але ён здаў экзамэны на адны тройкі. Ён пагартаў мае дакумэнты, прачытаў аўтабіяграфію і лісток уліку кадраў, патрос імі й сказаў: калі я так буду пісаць пра свой жыцьцёвы шлях ад 1944 да 1954 году, у Савецкім Саюзе я ніколі не паступлю ў вышэйшую навучальную ўстанову. А што рабіць? Ён мне нічога не параіў. "Думай сам", - сказаў. А што думаць? Схлусіць? За хлусьню могуць вярнуць у лягер. Я вырашыў не хлусіць, але і праўды ўсёй не паказваць. Напісаў, што ў гэты пэрыяд працаваў у НКВД[14]. Кім і дзе працаваў, я прамаўчаў. У такой рэдакцыі і паслаў дакумэнты ў Маскву. Неўзабаве прыйшло накіраваньне на экзамэны ў Беларускі політэхнічны інстытут, куды я прасіў. І я неадкладна паехаў у Менск. Там залічылі адзнакі, якія я атрымаў у Беларускім дзяржаўным унівэрсытэце, але ў іншым афармленьні. Такім чынам за адзін дзень я "здаў" чатыры прадметы. Пяты, малюнак, здаваў у другі дзень і атрымаў чацьвёрку.

У канцы кастрычніка Вольга Ліванарава (яна яшчэ працавала паштальёнам) прынесла мне тоўстую бандэроль — з Масквы. Колькі ж было радасьці, калі, разгарнуўшы яе, прачытаў першую паперку — выпіску з загаду аб залічэньні мяне студэнтам. Далей былі заліковая кніжка, студэнцкі білет, праграмы і мэтадычныя матэрыялы. Мне прысвоілі шыфар "ПГС 56-100". Нарэшце мая мара зьдзейсьнілася!

---

[14] Лягеры тады былі ў распараджэньні НКВД.

Не адкладаючы на доўгі час, я з радасьцю ўзяўся за вучобу. На першым курсе толькі малюнак і рысаваньне ("черчение") былі па спэцыяльнасьці, а ўсе іншыя прадметы — агульнаадукацыйныя. Для іх выкананьня можна было абысьціся і падручнікамі для сярэдняй школы. Самым простым для мяне сталася выканаць чатыры кантрольныя па нямецкай мове. За тыдзень я іх зрабіў, але дасылаў па адной. Лёгка выконваў і іншыя кантрольныя. Тужэй ішлі справы з матэматычным аналізам і аналітычнай геамэтрыяй. Я ня мог адразу знайсьці патрэбныя падручнікі. Спробы атрымаць іх у інстытуце былі безвыніковыя. "Сваіх студэнтаў ня можам забясьпечыць", — так мне адказалі.

Узімку я завёз Надзю зь Верай у Вільню да мамы. Там у кнігарнях я купіў некалькі падручнікаў, праўда, ня тыя, што рэкамэндавалі, але й па іх я пасьпяхова займаўся і выконваў кантрольныя. Увесну па накіраваньні з інстытуту я здаў у БПІ экзамэны за першы курс - па расейскай і нямецкай мовах і па матэматыцы. У 1957 годзе летнюю экзамэнацыйную сэсію ў Маскве не праводзілі, бо там праходзіў фэстываль. Накіраваньне на сэсію я атрымаў у Ленінград з 2 ліпеня. За 19 дзён у Ленінградзе я здаў усе экзамэны за першы курс, наведаўся ў Петрадварэц, Паўлаўск, Пушкіна, у Эрмітаж (два разы) і паглядзеў амаль увесь горад. Купіў Надзі туфлі, а Веры — бразготку. На ўсё гэта выдаткаваў толькі 1500 рублёў, болей у мяне не было. На час сэсіі сям'ю завёз у Чапялі.

У Канчанах Надзя пасябравала зь дзяўчатамі, займалася вышываньнем. Увосень хадзіла ў калгас выбіраць бульбу і, як летась, нанасіла дамоў гэтулькі, што магло б хапіць нам на ўсю зіму. Позьняй восеньню нам далі на Чысьці адзін пакой у двухпакаёвай кватэры. Ад пёткі мы перавезьлі жалезны ложак з матрацам і два, яшчэ нашыя, цудам ацалелыя пасьля пажару ў 1944 годзе крэслы. З прадуктаў узялі вядро бульбы, астатнюю зьбіраліся браць зімой па меры патрэбы, бо на Чысьці падвалу, каб захоўваць яе ў вялікай колькасьці, не было. Пераезд для нас стаўся вялікай радасьцю. Мы жылі самастойна, незалежна ад нікога. Былі блізкія адно аднаму. Але неяк зімой мы засталіся вельмі пакрыўджаныя. Я паехаў у Канчаны, каб узяць вядро бульбы. Палез у склеп, дзе яна ляжала, а там — ніводнай нашай бульбіны. Цётка Наталіна сказала, што прыязджаў з Баранавічаў Косьця, ейны зяць, і памылкова забраў нашую бульбу. Цётка прапанавала ўзяць яе бульбы, хоць яна й дробная. Мне было так крыўдна, што яны гэтак з намі зрабілі, але я ня стаў спрачацца. Нічога не сказаў, ня ўзяў цётчынай бульбы і паехаў на Чысьць. Надзя, калі я ўсё ёй расказаў, аж расплакалася.

На працы справы ішлі добра. У брыгадзе было ўжо 12 чалавек — чатыры мужчыны і восем жанчын. У весну прывезьлі на Чысьць дзьве бочкі фармапласту. Ніхто ня ведаў, што зь ім рабіць, пакуль не дайшло гэта да мяне. Ва ўсіх дамох — і жылых, і іншага прызначэньня — у стыку сьценаў і столі выцягвалі карнізы. Работа гэта цяжкая, марудная, хоць у брыгадзе яе амаль усе ўмеюць і яна добра аплочваецца. Я запрапанаваў выкарыстаць фармапляст на формы для зборных карнізаў, для гэтага ён і прызначаўся. Такія карнізы можна рабіць зь любым арнамэнтам, і атрымоўваюцца яны хутчэй і лягчэй. Мяне падтрымалі і прараб, і начальнік. Тыдзень я распрацоўваў мадэль, і яе ўхвалілі. З гэтай мадэлі зрабілі дзесяць формаў, зь якіх пачалі адліваць мэтровай даўжыні карнізы. Знайшлі для гэтага асобнае памяшканьне, дзе дзьве тынкавальніцы, з слабейшых, за дзень выцягвалі па 30 мэтраў. Мантаж такой колькасьці карнізаў рабілі два тынкавальнікі за два дні. На выцягваньне ж карнізаў звычайным спосабам і афармленьне кутоў ім спатрэбілася б восем дзён. За ўкараненьне такіх карнізаў кіраўнік падпісаў загад аб аплаце нам працы цягам аднаго году як за карнізы, выкананыя звычайным спосабам. Гэта, калі ўлічыць хуткасьць выкананьня і выдаткі працы, давала за кожны мэтар амаль удвая болей грошай. Карнізы ўсім спадабаліся. Пастанавілі знайсьці час і памяняць карнізы з сухой тынкоўкі ў канторы і ў сталоўцы.

Дзён за пятнаццаць да гадавіны рэвалюцыі выклікаў мяне Буістаў і мы зь ім пачалі абмяркоўваць, што можна зрабіць з глядзельнай заляй, каб правесьці там сьвяточны сход. Плошчай 150 мэтраў квадратных, яна ўся была ў рыштаваньнях. Буістаў меркаваў атынкаваць хоць бы столь. Каб разабраць рыштаваньне і наслаць падлогу, цесьляром трэба чатыры дні. Дзень патрэбен, каб занесьці й расставіць лаўкі. Нам, тынкавальнікам, застаецца дзесяць дзён. Я паабяцаў атынкаваць столь, а можа, і выцягнуць столевыя і насьценныя карнізы. На наступны дзень уся брыгада была тут. Усе былі занятыя. Хто наладжваў тынкавальны агрэгат, каб назаўтра рыхтаваць алебастравую рашчыну, па шлянгах падаваць яе на рыштаваньне і рабіць накідку на столь. Астатнія набівалі па столі лучыны. Нам прывезьлі воз сена, і мы яго запарылі ў вялікім чане. Алебастравая рашчына, падрыхтаваная на вадзе з запараным сенам, ня так хутка цьвярдзее, а гэта патрэбна, каб пасьпець яе накідаць і разраўняць. За два наступныя дні мы закончылі тынкаваць столь і пачалі цягнуць столевыя карнізы. Маячныя рэйкі навешвалі ў другую зьмену. Прайшлі яшчэ два дні, і беленькія карнізы ўпрыгожылі столь. Заставалася яшчэ пяць дзён. Мы перайшлі да выцягваньня насьценнага вянчаль-

нага карнізу. Маляры загрунтавалі пабелкай столь, а электрыкі павесілі жырандоль. Цесьляры пачалі разьбіраць рыштаваньне, пакідаючы нам па пэрымэтры залі два мэтры. На дзясяты дзень засталося атынкаваць дзе-нідзе ўнізе сьцены. Цесьляры таксама папрацавалі на славу. 6 лістапада па абедзе адбыўся сьвяточны сход у чыстай залі. Пасьля дакладу зачытвалі загады. Першых адзначылі маіх тынкавальнікаў. Акрамя грамат кожнаму далі па канвэрце, а ў ім прэмія — сярэдні месячны заробак.

Вучыўся я таксама пасьпяхова. Усе кантрольныя выканаў і выслаў у Маскву. Адтуль прыйшоў выклік на сэсію. Надзя павінна была вось-вось нарадзіць. Хоіць парвіся — трэба ехаць у Маскву і Надзю трэба глядзець. Нарэшце 14 чэрвеня ўначы Надзя завойкала. Я пабег да Шуры-акушэркі. Яна жыла ў суседнім доме. Прыйшла адразу ж, агледзела Надзю, і павялі мы яе ў паліклініку. Там было і радзільнае аддзяленьне. Уранку, пакуль Вера спала, я пабег туды праведаць Надзю. Насустрач мне выйшла Шура і павіншавала з дачкой. Мяне да іх не пусьціла. На працу я ўжо ня выйшаў. Аформіў адпачынак для паездкі на сэсію. На трэці дзень Шура пусьціла мяне і Веру да Надзі і Ганулькі — так мы назвалі нованароджаную. Я сфатаграфаваў яе трохдзённую. 20 чэрвеня 1958 году мне пад расьпіску аддалі Надзю з дачкой, і ў гэты ж дзень я завёз іх у Канчаны. Там нас ужо чакала Надзіна мама. Наступнага дня запрасілі айца Віктара, і ён пахрысьціў Ганульку. 22 чэрвеня я завёз усіх у Менск, пасадзіў у аўтобус, што ішоў на Старобін, а сам паехаў у Маскву.

У Маскве мне не цярпелася хутчэй здаць экзамэны і ехаць да маіх дзяцей. Але, як на тое ліха, сэсія зацягвалася. Чыталі лекцыі, праводзілі лябараторныя заняткі, па геадэзіі шмат дзён займаліся на палёх у Царыцыне. Потым — дэталёвая апрацоўка матэрыялаў палявых работ. Роўна месяц прабыў я ў Маскве. Здаў усе экзамэны, чатыры залікі. Зрабіў усе адзнакі ў заліковай кніжцы і студэнцкім білеце. Атрымаў мэтадычкі на трэці курс. У бібліятэцы ўзяў цэлы пачак падручнікаў. З Масквы прыехаў адразу ў Чапялі.

## *З ПРЫСТАЎКАЙ “Ч.В.А” І “В.А.”*

У Чапялёх да імяне дайшлі чуткі, што ля Чыжэвічаў (гэта бліжэй да Старобіну) плянуецца будаўніцтва калійнага камбінату з шахтамі па здабычы калійных соляў, а таксама жылога пасёлку. На Чысьці аб'ект закончвалі і, нават калі б я атрымаў не асобны пакой, а кватэру, працы не было б. Хіба што давялося б кожнага дня езьдзіць, як іншыя, у Менск.

Калі б уладкавацца на будоўлі гэтага пасёлку ці камбінату, было б нядрэнна, разважаў я. Тут Надзіны бацькі: і ёй весялей, і за дзецьмі догляд. Гэтак разважаючы, я паехаў у Старобін, дзе, казалі, знаходзіцца кантора камбінату. Знайшоў яе ў адным пакоі сялянскай хаты. Там былі толькі два чалавекі — дырэктар і галоўны інжынэр. З апошнім мне і давялося весьці размову. Ён мяне нічым не парадаваў. Калі б у мяне была спэцыяльнасьць шахцёра ці іншая, зьвязаная з шахцёрскай справай, растлумачыў ён мне, мы маглі б дамовіцца. Галоўны інжынэр параіў мне заехаць у трэст № 3, які будзе беспасярэдне займацца будаўніцтвам.

Трэст знаходзіўся ў вёсцы Кулакі - гэта каля кілямэтра ад дарогі Старобін-Слуцак, як ехаць у Чапялі. Безумоўна, я выкарыстаў і гэтую магчымасьць. Мне заўсёды шанцавала гаварыць з галоўнымі інжынэрамі. І на гэты раз мяне прыняў галоўны інжынэр трэсту № 3 Ярэмчанка. Вельмі інтэлігентны чалавек. Уважліва паслухаў пра маю ранейшую працу, спэцыяльнасьць тынкавальніка і вучобу ў інстытуце. Пацікавіўся й пэрыядам 1944-1954 гадоў. Ён зрабіў на мяне такое станоўчае ўражаньне, што я не схаваў ад яго праўды. Я пачуваўся зьбянтэжаным, але ён мяне супакоіў.

Ярэмчанка растлумачыў, што пакуль на іхных будоўлях няма чаго тынкаваць. На прамысловай пляцоўцы толькі часовыя будынкі, неабходныя для праходкі вэртыкальных ствалоў у шахты. Неўзабаве пачнецца забудова жылой зоны, дзе спатрэбяцца майстры з маёй спэцыяльнасьцю, але гэта будзе не раней, як праз тры-чатыры месяцы. Ён пацікавіўся, ці ня думаю я, што ўжо час пераходзіць на інжынэрную працу — усё ж я вучуся на трэцім курсе інстытуту. Яму, напрыклад, патрэбны ў вытворча-тэхнічны аддзел інжынэр. Я зьбянтэжыўся і сказаў, што мне ў гэтым аддзеле праца незнаемая і што я, магчыма, ня спраўлюся зь ёй. У інстытуце яшчэ так мала вывучаў прадметаў па спэцыяльнасьці. Ярэмчанка ўсьміхнуўся. Яму мала даводзілася сустракаць такіх людзей, якім прапаноўвалі добрую працу, а яны шчыра выказвалі сумневы ў сваіх здольнасьцях. Мая сьціпласьць яму спа-

дабалася, і ён паабяцаў дапамагаць мне, калі я прыму яго прапанову. Я згадзіўся, хоць на душы было трывожна.

У першыя дні жніўня 1958 году я ўжо быў на Чысьці і атрымаў разьлік і працоўную кніжку. 6 жніўня мяне афармілі ў трэст № 3 "в.а." інжынэра вытворча-тэхнічнага аддзелу. На гэтую прыстаўку "в.а." (выканаўца абавязкаў) я не зьвяртаў увагі. Яно так, мне здавалася, і павінна быць - я ж пачатковец у гэтай справе.

Жыў я ў Чапялёх, а ў Кулакі езьдзіў на ровары або выходзіў на шашу, а там мяне падбірала машына, на якой вазілі работнікаў з Слуцку. У Чапялёх у Надзіных бацькоў была маленькая хатка 4х5 мэтраў з варыстай печчу і глінабітнай падлогай. З намі жыло восем чалавек. Вельмі цесна, і вучыцца не было дзе. У Кулакох у суседняй з трэстам хаце жыло некалькі нашых работнікаў. Далі месца і мне, але займацца і там было цяжка. Пасьля працоўнага дня суседзі любілі выпіць ці пайграць у карты, і мне выглядаць сярод іх белай варонай было няёмка. Я часта заставаўся ў кабінэце, зразумела, узгадніўшы гэта з галоўным інжынэрам.

Увосень у кабінэце галоўнага інжынэра зьявіўся яшчэ адзін супрацоўнік — Андрэй Захаравіч Новікаў. Яго рыхтавалі ў кіраўнікі новага ўпраўленьня, якое мела займацца будоўляй жылога пасёлку. Андрэй мне шмат дапамагаў у практычнай рабоце. Мы пасябравалі. Але зьявілася яшчэ адна непажаданая акалічнасьць, якая перашкаджала мне выконваць кантрольныя. Узначальваў трэст у гэты час Андрэй Емяльянавіч Воранаў, ужо пажылы чалавек. Спэцыяльна для яго ў Старобіне пабудавалі аднакватэрны дом. Адтуль у трэст яго вазіў шофер, які й жыў зь ім. Увечары пасьля працы Воранаў меў звычку праходзіць па кабінэтах (іх было пяць). Зьвярнуў увагу, што я і Новікаў часта затрымліваемся. Пацікавіўся, чым займаемся гэтак позна. У размове даведаўся, што ўмеем гуляць у карты ў прэфэранс. Вось тут і пачалося. Амаль кожны дзень (акрамя суботы й нядзелі, калі ён езьдзіў у Менск) Воранаў забіраў нас у Старобін. Там мы ўсю ноч "разьбівалі пульку" — гулялі ў прэфэранс. За гульнёй зьядалі за ноч зайца ці іншую дзічыну, якую яму нехта прыносіў. Не абыходзілася й без бутэлькі. Адмаўляцца ні я, ні Новікаў не насьмельваліся. А з вучобай я пачаў адставаць...

У лютым 1959 году было створанае новае будаўнічае ўпраўленьне № 123, а кіраўніком яго стаў Андрэй Новікаў. На ягоную просьбу мяне перавялі туды інжынэрам вытворча-тэхнічнага аддзелу, але зноў з прыстаўкай "ч.в.а." (часовы выканаўца абавязкаў). Як мне патлумачыў Андрэй, Старобінскі райкам партыі кантраляваў усе прызначэньні на кіраўнічыя пасады (у тым ліку брыгадзіраў). На прызна-

чаных часова або проста выканаўцаў абавязкаў увагі не зьярталі. Маральна гэта мяне крыху прыгнятала, ате журыцца часу не было. Аднойчы на плянёрцы нешта тычылася працы ВТА[15], і кіраўнік трэсту, а ім тады ўжо быў Кісялёў, стаў дакараць мяне за працу аддзелу. Я не стрымаўся і выказаў, што я толькі інжынэр, да таго ж — з прыстаўкай "ч.в.а.", а кіраўніка пакуль няма. Ён закіпеў і ў гневе загадаў тэрмінова прызначыць мяне кіраўніком вытворча-тэхнічнага аддзелу і як кіраўніку зрабіць вымову. Загад быў выкананы, але ўсё ж з прыстаўкай "ч.в.а.".

Працуючы ў БУ-123[16], я амаль усе вечары меў вольныя і падагнаў вучобу. Улетку паехаў у Маскву і здаў усе экзамэны без хвастоў.

Дома, у Чапялёх, усё было збольшага нармальна. Дочкі, мая радасьць, расьлі здаровыя і харошыя. Цесна было ў хаце бацькоў, але іншага жыльля пакуль ня мелі. У Кулакох я жыў у адным з пабудаваных баракаў (яшчэ не закончаным, але пару пакояў былі прыстасаваныя для жыльля). Там жа жылі майстры, прарабы і бухгальтар. У Чапялі езьдзіў раз на тыдзень у нядзелю, а як вярнуўся з Масквы, прабыў там цэлы тыдзень, а мо' і больш.

На працы мяне чакалі перамены. На мае месца кіраўніком вытворча-тэхнічнага аддзелу прызначылі нейкага новапрыбылага А. І. Мартыненкава. Да прыезду сюды ён працаваў недзе на Ўрале, як сам расказваў, прарабам і кіраўніком работ. У гэты час шмат новых людзей зьявілася ў БУ-123. Усе яны партыйныя. пазаймалі ў нашым ды іншых упраўленьнях адказныя пасады галоўных інжынэраў, кіраўнікоў аддзелаў кадраў, старшыняў прафсаюзаў, дыспэтчараў і г.д. Мартыненкаў здаўся мне вельмі запальчывым, грубаватым, незычлівым. Я зь ім не працаваў ніводнага дня і адразу падаў заяву з просьбай перавесьці мяне майстрам. З 1 жніўня я ўжо працаваў "в.а." майстра. Рабілі клюб будаўнікоў, лазьню, першую сталоўку, першую краму.

На тэрыторыі жылога пасёлку будавалася, можа, дваццаць ці болей аднакватэрных домікаў для супрацоўнікаў трэсту і ўпраўленьняў. Гэтай будоўляй кіраваў праараб В.С.Воранаў. Я яму заўсёды дапамагаў рабіць працэнтоўкі, матэрыяльныя справаздачы і нарады. У яго гэта слаба выходзіла. А вось выпіць ён любіў, тут у яго ўсё атрымоўвалася добра. Неяк раз закончылі мы чарговую справаздачу і за чаркай разгаварыліся пра жыльлё. Я расказаў пра ўмовы, у якіх жыве мая жонка з дочкамі. І тут у яго зьявілася ідэя.

[15] ВТА — вытворча-тэхнічны аддзел.
[16] БУ - будаўнічае ўпраўленьне.

— Зараз пойдзем і выберам домік, які табе спадабаецца, — сказаў Воранаў. — Я яго зраблю сваёй прарабскай і складзікам. У адзін пакой ты перавязеш сваю маёмасьць і можаш там жыць, а праз колькі дзён ці тыдняў — будзем бачыць па рэакцыі кіраўніцтва - перавязеш і сям'ю. Калі будзе працаваць дзяржкамісія па прыёмцы гэтых домікаў у эксплёатацыю, ты перасялісься ў які-небудзь іншы, яшчэ не закончаны. А там будзем дзейнічаць па абставінах.

Так і зрабілі. Не прайшло й месяца, як я зь сям'ёй жыў ужо ў Новастаробінску (так тады называўся пасёлак). Пазьней яму далі новае імя - Салігорск. Увесь 1960 і 1961 гады мяне папярэджвалі, загадвалі вызваліць домік, пагражалі, нават было папярэджаньне старобінскага пракурора Акулевіча. Але мы заставаліся ў гэтым доме. Урэшце ўсім, мабыць, абрыдла гэтая цяганіна, і 21 лістапада 1961 году мне выдалі законны ордэр. У гэтым доме мы жылі да лістапада 1985-га, калі нас перасялілі на бульвар Шахцёраў, а тут пачалі будаваць дзевяціпавярховы дом.

14 студзеня 1962 году я абараніў дыплёмны праект і з званьнем інжынэра-будаўніка вярнуўся ў Салігорск. Мае мары спраўджваюцца - у мяне ёсьць сям'я, дзьве дачкі, не паддаўся жорсткім выпрабаваньням, закончыў інстытут, стаў інжынэрам.

У лютым у Салігорску здарылася непрыемная гісторыя. У падвале аднаго дому знайшлі мёртвым кіраўніка нашага ўчастку Мікалая Кунцэвіча. Ён з тых "благонадежных", якімі засялілі нядаўна Салігорск. Вельмі любіў выпіць і амаль ніколі ня быў цьвярозы. Гэта яму неяк праходзіла беспакарана. Што да адукацыі, то ён ня надта адпавядаў і сярэдняй. Аб'ектаў тады на ўчастку было шмат. Усе яны знаходзіліся на стадыі будаўніцтва і ніводзін ня быў здадзены субпадрадчыкам. На ўчастку выявілі вялікую нястачу матэрыялаў. Але што ўзяць зь нябожчыка? Усё сьпісалі. На месца кіраўніка шукалі новую кандыдатуру. Выбралі мяне, хоць з вышэйшай адукацыяй у нашым упраўленьні было некалькі майстроў і прарабаў. 15 сакавіка я стаў "в.а." кіраўніка ўчастку.

Першы час мне давялося вельмі цяжка — аб'ектаў шмат, усе пачатыя, галоўныя аб'ёмы работ па іх зробленыя і грошы ўзятыя, а па некаторых аб'ектах уперад. На дробязях плян ня выканаеш, а завяршаць аб'екты трэба. Якраз у гэты час пачаўся штурм па здачы Першага калійнага камбінату Дзяржкамісіі. Усіх маіх рабочых, майстроў і прарабаў забралі туды. Мне пакінулі толькі кладаўшчыка і брыгаду зь дзевяці дзяўчат. Мяне на камбінат не пусьцілі. З такімі кадрамі і з субпадрадчыкамі я ўсё ж здаў замоўцам некалькі аб'ектаў: падстанцыю на цагельным заводзе, кароўнік і даілку ў Застарыньні, куратнік

у Забродзкіх. Да навучальнага 1964 году мы здалі ў эксплёатацыю школу № 3 у Салігорску. Туды з школы № 1 я перавёў сваю старэйшую дачку Веру, яна пайшла ўжо ў трэцюю клясу, а меншая — у першую.

На будаўніцтве каналізацыйных помпавых станцый я прыдумаў і выкарыстаў некалькі новых спосабаў работы ў слабых грунтох-плывунох і распрацаваў арыгінальную канструкцыю апалубкі. 8 траўня 1966 году мяне ўзялі ў трэст № 3 у якасьці галоўнага тэхноляга. Тым часам у Савецкім Саюзе была зроблена спроба Касыгіна правесьці рэформу ў сыстэме кіраваньня на прадпрыемствах і ў дзяржаве ў цэлым. Шырока ўкаранялася вылічальная тэхніка, і на яе базе распрацоўваліся аўтаматызаваныя сыстэмы кіраваньня з выкарыстаньнем сеткавых графікаў. У студзені я прайшоў адпаведныя курсы пры Дзяржбудзе СССР у Маскве і ўдзельнічаў у некалькіх сэмінарах у Міністэрстве будаўніцтва БССР. Укараненьне новых мэтадаў кдалася на плечы галоўнага тэхноляга, дзеля чаго, відаць, і бралі мяне на гэтую працу. Я і сам загарэўся не на жарт гэтымі ідэямі. Шмат чытаў па тэме ў савецкай і замежнай літаратуры. Пры вучэбным камбінаце трэсту праводзіў заняткі з кіраўнікамі нашых арганізацый — вучыў мэтадам распрацоўкі і кіраваньня з дапамогай сеткавых графікаў. Пры трэсьце стварылі асобны аддзел па ўкараненьні гэтых мэтадаў. Зь яго дапамогай я распрацоўваў сеткавыя графікі на будаўніцтве Трэцяга і Чацьвертага камбінатаў ды на іншых аб'ектах трэсту. Мяне запрасілі чытаць лекцыі ў тэхнікуме на вячэрнім аддзяленьні па тэхналёгіі і арганізацыі будаўніцтва. Зьявілася жаданьне здаць кандыдацкі мінімум. Здаў пры Беларускім політэхнічным інстытуце экзамэн па нямецкай мове і рэфэрат на тэму "Кібэрнэтыка і кіраваньне будаўніцтвам". У часопісах "Промышленное строительство в СССР", "Архитектура и строительство в СССР", "Жилищное строительство", "Бюллетень строительной техники" надрукавалі чатыры мае артыкулы па актуальнай тэматыцы. У мясцовай газэце зьявіліся мае лекцыі па распрацоўцы і выкарыстаньні сеткавых графікаў. Разам з тэарэтычным і практычным укараненьнем новых мэтадаў у трэсьце я як галоўны тэхноляг удзельнічаў у працы "Аўтаматызаванай сыстэмы кіраваньня Міністэрства будаўніцтва СССР". Штодня практычна выкарыстоўваў сеткавыя графікі ў арганізацыі работы субпадрадчыкаў. Кіраўніцтву трэсту дакладваў аб ходзе будаўніцтва толькі на падставе сеткавых графікаў і ў адпаведнасьці зь імі распрацоўваў рэкамэндацыі. Вывучаць нашыя мэтады прыяжджалі прадстаўнікі зь іншых трэстаў.

Але ня ўсё і не заўсёды ішло так гладка. Бывала (і даволі часта), наступала каманда, і "по просьбе" ці "по предложению коллектива

трудящихся" тэрмін будаўніцтва мяняўся. Звычайна яго скарачалі і прымяркоўвалі да якой-небудзь даты рэвалюцыйнага сьвята. У такіх выпадках пленным было б выкарыстаньне навуковых мэтадаў кіраваньня і арганізацыі працы, але рабілі наадварот. Пачынаўся штурм, любым коштам неабходна было выканаць "просьбу трудящихся". У такіх умовах графікі і навуковыя мэтады станавіліся фармальнасьцю. Толькі тэхнічны аддзел трэсту ўлучаў у справаздачу аб выкананьні пляну па ўкараненьні новай тэхнікі побач з выкарыстаньнем "рыкшы" і навуковыя мэтады кіраваньня, а таксама падлічваў ад гэтага грашовы эфэкт.

4 чэрвеня 1967 году мая сям'я павялічылася яшчэ на аднаго чалавека — жонка Надзя нарадзіла нам спадчыньніка і назвалі мы яго Славікам. Радасьці было — ня выказаць. Мне і маёй маме, якая ўжо жыла ў нас, ня верылася, што нарадзіўся хлопчык. Дочкі мае хацелі хутчэй пабачыць брацікa. Не дачакаўшыся полудня, пайшоў зь імі ў больніцу. У пакой нас, вядома, не пусьцілі, але пад вокнамі мы маглі выглядаць і спадзявацца ўбачыць хоць Надзю. А яна якраз карміла сына, мо' яшчэ першы раз. Падышла да вакна на трэцім паверсе і паказала нам нешта загорнутае ў белыя пялёнкі. Я пстрыкнуў фотаапаратам, а дочкі аж заскакалі ад радасьці, хоць там нічога нельга было ўбачыць. Зьдзейсьніліся мае мары — перажыў няволю, займеў сям'ю, дзяцей і сына — спадчыньніка роду Дубовікаў, атрымаў адукацыю, задаволены працай і мною задаволеныя на працы і дома. Што больш трэба? Жыві і радуйся, але...

Пад канец 1971 году да мяне ў кабінэт зайшоў намесьнік кіраўніка Ўласаў. Ён прынёс непрыемную навіну: у ЦК[17] кампартыі Беларусі паступіла на мяне ананімка. Уласаву даручылі разабрацца, каго ён трымае на такой пасадзе. Акрамя гэтага, мабыць, па той жа запісцы, мной зацікавіўся супрацоўнік КГБ[18]. Ён папрасіў мяне прынесьці яму ўсе стужкі і фатаграфіі калійных камбінатаў. Я рабіў іх для альбомаў, што ўручаліся членам дзяржаўнай камісіі на банкетах, прысьвечаных здачы ў эксплёатацыю чарговага камбінату. Я сабраў усё, што тычылася гэтага пытаньня, і здаў яму. Дома дадаткова прагледзеў усе фатаздымкі ды стужкі, і тое, да чаго, на маю думку, можна было прычапіцца, зьнішчыў. З гэтага часу я з фотаапаратам за агароджу свайго дому не выходзіў. Настрой меў вельмі благі. Я быў гатовы да самага непрыемнага, непажаданага і нечаканага. Шкада рабілася дзяцей, мамы і Надзі. Шкада было ўсяго, чаго я дасягнуў за гэ-

[17] ЦК — цэнтральны камітэт.
[18] КГБ — комитет государственной безопасности.

тыя гады на свабодзе. Але бяда не прыходзіла. Як разьбіралі маю справу ў трэсьце і ў КГБ, ня ведаю. Усё рабілася ціха, сакрэтна. Як і раіў мне Ўласаў, я падаў заяву на звальненьне, і маю просьбу безь пярэчаньня і тэрмінова выканалі.

Трэба ж было так здарыцца, што, выйшаўшы з аддзелу кадраў з працоўнай кніжкай у руках, я сутыкнуўся зь Язэпам Лойкам, начальнікам ПМК-16[19] трэсту Слуцксельбуд. У гэты дзень ён меў у трэсьце № 3 нейкія справы. Раней ён працаваў са мной у БУ-123 майстрам. Прывіталіся, загаварылі. Настрой у мяне быў не да размовы. Хацелася пабыць аднаму, пераасэнсаваць усё, што адбылося за апошнія дні. Лойка не адыходзіў, відаць, спадзеючыся на дапамогу ў сваіх справах. Ён яшчэ ня ведаў, што здарылася са мной. Даведаўшыся, што я толькі што зволнены з трэсту, ён вельмі зьдзівіўся і яшчэ больш настойліва імкнуўся працягнуць размову.

- Што вы мяркуеце рабіць далей? — спытаўся ён, а потым дадаў: - Нам патрэбен кіраўнік вытворча-тэхнічнага аддзелу. Кіньце вы журыцца. Давайце працаваць разам.

Ён спагадаў мне, што я цяпер ня ў стане адразу распачаць працу ў ПМК-16, і таму прапанаваў проста напісаць заяву, а на работу прыйсьці ў панядзелак пасьля добрага адпачынку, супакоіўшыся. Угаварыў. Я напісаў заяву.

22 лістапада, у панядзелак, як было дамоўлена, я зьявіўся ў ПМК-16 і Лойка пазнаёміў мяне з супрацоўнікамі аддзелу — Таняй Міхалевіч і Любай Курловіч. Вось такі шматлюдны быў мой новы аддзел. Без навукі тут з працай справіцца цяжка, можна не пасьпець за ходам будаўніцтва. Але, як потым высьветлілася, усё ня гэтак страшна. Сельскія аб'екты пасьля калійных камбінатаў здаліся мне забавай. Я вярнуўся да ўкараненьня навуковых мэтадаў у арганізацыю працы. У трэсьце ў галоўнага бухгальтара выпрасіў тры вылічальныя машынкі "Аскоты": дзьве для нашага аддзелу і адну для бухгальтэрыі. Паабяцаў, што яны будуць не ляжаць бяз справы, а выкарыстоўвацца паводле прызначэньня. Мае дзяўчаты хутка асвоілі новую тэхніку, а ў бухгальтэрыі ніяк не маглі разьвітацца зь лічыльнікамі, "фэліксамі", машынкамі "ВК". Праз паўтара году зволніўся начальнік плянавага аддзелу, і там заставалася адна жанчына. Яна ўсё бегала да нас раіцца, а таксама палічыць свае пляны і справаздачы на нашай тэхніцы. Яна спадабалася мне як работніца - старанная, працавітая, прыхільная да ўкараненьня навукі ў арганізацыю працы. Падумаўшы, я запрапанаваў аб'яднаць гэтыя два аддзелы. Што і зрабілі.

[19] ПМК — перасоўная механізаваная калёна.

У траўні 1973 году кіраўнік трэсту Слуцксельбуд Рэзьнік (той самы, што будаваў элеватар, а я ў яго быў брыгадзірам тынкавальнікаў) намерыўся правесьці на базе ПМК-16 навуковы сэмінар па арганізацыі і кіраваньні будаўніцтвам. Месяц рыхтавалася ПМК да гэтага сэмінару, чысьцілі тэрыторыю, рамантавалі кантору, наводзілі парадак на аб'ектах. Не сядзелі й мы. Разьвешалі сеткавыя графікі, аднавілі мой лёзунг, які я прынёс з сабой з трэсту: "Інтуіцыя шукае работу, навука і лёгіка выконваюць работу, эстэтыка завяршае работу". Я не памятаю, чые гэта словы, але згодна з гэтым лёзунгам я і стараўся працаваць. На час сэмінару мы пахавалі лічыльнікі. У працы былі дзьве "Аскоты" і ў кожнага была малая вылічальная машынка. Гэта быў ужо прагрэс. Сэмінар прайшоў на вельмі высокім роўні, але, як заўважыў Рэзьнік, не на базе ПМК, а на базе вытворча-тэхнічнага аддзелу ПМК-16.

На другі дзень сэмінару на банкеце Рэзьнік яшчэ раз пахваліў мяне і спытаўся, чым за гэта ўзнагародзіць. Я паўжартам сказаў: "Дайце мне машыну". Ён тут жа паклікаў свайго намесьніка і спытаўся, колькі на гэты год выдзелена трэсту легкавікоў. Той сказаў, што пяць, але тры ўжо разьмеркаваныя.

- Прыедзем у Слуцак, падрыхтуйце загад выдзеліць чацьвертую машыну Дубовіку.

Я думаў, што гэта жарт, ды на ўсялякі выпадак паступіў на курсы кіроўцаў, пабудаваў каля дому ў агародзе гараж. Але гэта ня быў жарт. У лістападзе таго ж году я ехаў зь Менску ў Салігорск на сваіх "Жыгулях". Першы раз у жыцьці я атрымаў за сваю працу такую каштоўную нагароду. А колькі гадоў мусіў бы стаяць у чарзе на яе атрыманьне, ды яшчэ ці далі б мне, хоць і па чарзе. Лойка быў таксама вельмі задаволены, бо хвалілі й яго, а ён гэта вельмі любіць.

Неяк узімку 1974 году я сустрэў свайго старога знаёмага Генадзя Качура. Зь ім мы будавалі Салігорскі тэхнікум. Ён быў тады мулярам, ды ня простым. Нейкі журналіст сфатаграфаваў яго на рыштаваньні, і гэты здымак красаваўся на вокладцы часопіса "Советское фото". Як высьветлілася, Генадзь таксама скончыў завочна інстытут і цяпер яго прыслалі ў Салігорск зь міністэрства ўзначаліць новае будаўнічае ўпраўленьне ў трэсьце № 3. Ён часта заходзіў да мяне, і часам мы рабілі па чарцы. А за чаркай толькі й размова, што пра жанчын ды работу. Ён угаворваў мяне перайсьці ў яго БУ-95, але гэтае ўпраўленьне падпарадкоўвалася трэсту № 3, і я катэгарычна адмаўляўся. Мне і ў ПМК-16 жылося нядрэнна. Праца наладзілася. Аб'екты былі нескладаныя, і легка было іх плянаваць. Вялікае кола знаёмых людзей,

замоўцаў. Мы ж будавалі ў сёлах Любанскага, Капыльскага, Клецкага, Нясьвіскага і Салігорскага раёнаў.

Некалькі разоў Качур прыносіў з сабой праекты, і мы вялі цікавую размову: як выконваць работы па гэтых аб'ектах і што прыдумаць, каб будаваць іх лягчэй. Можа, дзе падаць і якую рацыяналізатарскую прапанову. Качур гэта любіў. А каму зашкодзіць лішні рубель? Аднаго разу ён прынёс цэлую тэчку праектаў і каштарысаў. Прасіў у вольны час паглядзець. Сярод іх быў праект вадаводу ад вадасховішча да Чацьвертага калійнага камбінату. Праект мяне вельмі зацікавіў. Разгарнуўшы яго, я ўбачыў цэлы шэраг нерацыянальных рашэньняў. Інтуіцыя запрацавала. Удасканаліўшы гэты праект, можна было б заслужыць добрую нагароду. Аднак не аднаго дня гэта клопат. Кошт усяго вадаводу паводле каштарысу складаў больш за пяць мільёнаў рублёў. Мне захацелася папрацаваць над ім. Я адчуваў, што тут можна дамагчыся неблагой карысьці для замоўцы, падрадчыка і, канечне, для мяне з Качурам. Каб заняцца гэтым, мне трэ' было звольніцца з ПМК-16 і афарміцца на працу ў БУ-95. Качур і я патлумачылі Лойку, кіраўніку ПМК-16, сытуацыю, і ён звольніў мяне мірна, тым больш што яму з райкаму партыі прапанавалі ўладкаваць аднаго іхнага былога працаўніка. На новым месцы мяне аформілі старшым інжынэрам вытворча-тэхнічнага аддзелу і дадаткова ў загадзе паказалі мэту прызначэньня — "распрацоўка мерапрыемстваў па будаўніцтве вадаводу".

Першае, што я заўважыў у праекце: ён пракладаўся ўздоўж чыгункі, што ішла на Чацьверты калійны камбінат, па існым профілі зямлі. У выніку на ім атрымлівалася шмат пераломаў, што выклікала дадатковыя нагрузкі на канструкцыі вадаводу. Калі зрабіць невялікую пляніроўку трасы (а мясцовасьць раўнінная), ад гэтых нагрузак можна пазбавіцца. Акрамя таго, акультурыцца паласа зямлі каля чыгункі. Выраўноўваньне па вэртыкалі пракладкі вадаводу зьменіць расстаноўку нерухомых апораў, раўнамерна падзеліць трасу ў пляне, зьмяншаючы такім чынам нагрузкі на апоры і колькасьць апораў і кампэнсатараў. Геадэзічнае ўпраўленьне праверыла на практыцы магчымасьць такога выраўноўваньня. Я распрацаваў новыя рысункі, пляны і падоўжныя профілі, яшчэ раз праверылі з геадэзістам праект на месцы і падалі на ўзгадненьне ў праектную арганізацыю ВНІІГ[20] і замоўцу.

І адной, і другой арганізацыяй новы праект быў ухвалены і падпісаны "да выкананьня работ". Без асаблівых праблем прайшло ўзгад-

[20] Всесоюзный научно-исследовательский институт галургии.

неньне падлічаных мною нагрузак на кожную нерухомую апору. А вось з канструкцыяй апораў узьніклі непрадбачаныя цяжкасьці. Паводле першага праекту, апоры ўзводзіліся на жатезабэтонных палях, якія забіваліся на адлегласьці адзін мэтар адна ад адной. Было некалькі апораў, дзе прадугледжваіася забіваць такім чынам па 36 паляў сечывам 40x40 сантымэтраў. Такіх паляў Міністэрства будаўніцтва БССР не прадукавала, а калі б і прадукавала, то забіпь іх на такой малой адлегласьці і ў такой колькасьці было б немагчыма. Вельмі вялікае ўшчыльненьне грунту ад першай забітай палі не дазваляла б забіць наступную.

З праектаваньнем канструкный на палях я пазнаёміўся яшчэ ў інстытуце - зь вялікай цікавасьцю вывучаў і выкарыстоўваў іх у курсавых і дыплёмным праектах. Але тады яны разьлічватіся толькі на вэртыкатьныя нагрузкі. Разьлікі паляў на гарызантатьныя нагрузкі я не шукаў і не сустракаў, бо не было неабходнасьці. А тут якраз такія разьлікі патрэбныя. Мэтодыкі іх я не знаходзіў ні ў сваёй бібліятэцы, ні нават у арганізацыі, якая іх запраектавала. Давялося зьвярнуцца ў Менск, у спэцыяльную навукова-дасьледчую ўстанову, здаецца, гэта быў Інстытут асноваў і фундамэнтаў. Там, аднак, мяне нічым не парадавалі. Паглядзелі на распрацоўкі ВНІІГ, пацікавіліся, хто я і навошта гэта мне. Адзін з прысутных на разглядзе сказаў: "А чаму вы так хочаце выкарыстаць забіўныя палі? Паспрабуйце сьвідра-набіўныя. Яны больш простыя ў выкананьні і не такія дарагія".

Укараненьне сьвідра-набіўных паляў было ў іх, пэўна, у пляне распрацовак, таму яны і раілі так настойліва іх выкарыстаньне. Але ж мэтодыкі разьлікаў іх на гарызантальныя нагрузкі таксама няма. Мы дамовіліся правесьпі ў нас на тэрыторыі вадаводу выпрабаваньне апораў з такімі палямі. Адказным за гэта прызначылі кандыдата тэхнічных навук Шахірава. На выпрабаваньні пайшло чатыры месяцы, і па іх выніках былі прынятыя нерухомыя апоры — бяз паляў, зь дзьвюма і чатырма палямі (у залежнасьці ад нагрузак). На выпрабаваньні запрашалі прадстаўнікоў праектнай арганізацыі і замоўцу. Зрабілі супольную справаздачу, і такім чынам узгадненьне нашай прапановы прайшло безь пярэчаньняў.

Заставалася яшчэ памянаць рухомыя апоры. Паводле праекту ВНІІГ, яны ўяўлялі сабой мэталічныя шарыкавыя апоры, якія абапіраліся на жалезабэтонную пліту, пакладзеную на пяшчаную падушку. Такія апоры мелі толькі дзьве ступені рухомасьці — падоўжную і папярочную, а вэртыкальная, што якраз на прасадачных землях мае гатоўнае значэньне, адсутнічала. З Качурам распрацавалі канструкцыю падвесных трубаправодаў на балтавых падвесках. Гэтая кан-

струкцыя давала магчымасьць дакладнага і лёгкага выраўноўваньня трубаправоду па гарызанталі ў працэсе будаўніцтва і, што самае важнае, у працэсе эксплёатацыі, калі непазьбежныя нераўнамерныя прасадкі грунту. Замоўца пагадзіўся на такую канструкцыю, а праектавальнікі супраціўляліся (і бяз гэтага мы іхны праект увесь перарабілі). Яны казалі, што гатовыя пагадзіцца з намі, калі мы атрымаем станоўчую характарыстыку або рэкамэндацыі ад праектных арганізацый Нарыльску і Данецку, якія спэцыялізуюцца ў праектаваньні аб'ектаў на паверхнях, якія падпрацоўваюцца. Каб прысьпешыць рашэньне, трэба ехаць туды. Але ехаць у Нарыльск, мне сказалі, і думаць ня варта. Ня пусьцяць — гэта горад закрыты. Я даслаў туды бандэроль з просьбай даць заключэньне па нашых распрацоўках. А ў Данецк паехаў сам і прывёз адтуль станоўчую характарыстыку. Неўзабаве атрымалі станоўчы адказ і з Нарыльску. Наша канструкцыя была ўзгодненая. Усяго па праекце вадаводу атрыманая эканомія больш за два мільёны рублёў. Нагароду мне і Качуру давялося здабываць праз суд.

Увосень 1976 году ў трэсьце № 3 плянавалі рэформу - аб'яднаць вытворча-тэхнічныя аддзелы ўсіх упраўленьняў у адно пры трэсьце. Я не хацеў вяртацца ў трэст, і Качур пагадзіўся на мае звальненьне. Мяне ў гэты ж дзень прынялі (без прыставак "ч.в.а." ці "в.а.") у праектную групу трэсту Салігорскводбуд кіраўніком будаўнічага сэктару, дзе я спакойна адпрацаваў да сакавіка 1978 году, калі групу зьліквідавалі.

Шукаць працу мне пакуль ніколі не здаралася. Празь пяць дзён пасьля ліквідацыі праектнай групы я ўжо працаваў у Салігорскім домабудаўнічым камбінаце старшым інжынэрам праектна-каштарыснай і дагаворнай групы. У лютым 1979 году мяне прызначылі "ч.в.а." кіраўніка вытворча-тэхнічнага аддзелу ДБК, дзе я адпрацаваў да 24 ліпеня 1984 году, калі выйшаў на пэнсію. На пэнсію мяне праводзілі ўсе канторскія і лінейныя работнікі. Я ім падрыхтаваў шыкоўны банкет. Кіраўніцтва і прафсаюз домабудаўнічага камбінату не далі мне нават значка "Вэтэран працы". Мабыць, і раздача гэтых значкоў уваходзіла ў абавязкі гаркаму партыі. Страты мне ад гэтага ня стала, але маральна я пакідаў сваю працоўную дзейнасьць прыгнечаны. Ніводнага дня я там болей не працаваў.

Да гэтага часу мае дочкі ўжо закончылі Беларускі політэхнічны інстытут і працавалі. Вера ў 1980 годзе нарадзіла дачку Кацю. У сьнежні 1983 году захварэла мая мама і неўзабаве 24 сьнежня памерла. Пахавалі мы яе, як яна раней прасіла, на могілках у Чапялёх. Увесну ў агародзе ля свайго дому я рабіў помнік па маме. Аднаго дня я даво-

дзіў яго — шліфаваў, паліраваў. Па нашай вуліцы праходзіла дэлегацыя зь мясцовай салігорскай партыйнай і выканкамаўскай вярхушкі. Яны, відаць, аглядалі месца для новай забудовы. Домікі на нашай вуліцы плянавалася пабурыць і на іх месцы пабудаваць шматпавярховы дом. Яны ўбачыўшы мяне і, паколькі шмат хто мяне ведаў, спыніліся і пацікавіліся, чым я заняты. Я расказаў, што раблю маме помнік. "И надписи делаешь по-белорусски?" — спытаўся адзін зь іх. Астатніх гэта зацікавіла, а нехта дадаў: "Не зря тебе давалі десять лет". Вось так і прадоўжыць тэрмін у лягерах можна. Было б гэта дзясятак гадоў таму...

Увосень 1984 году пачалі бурыць нашыя домікі. Нас перасялілі на бульвар Шахцёраў. За 1985 год я сам пабудаваў на РУ-1 новы гараж і пачаў летні домік у Паварчыцах, дзе маёй жонцы ад трэсту Салігорскводбуд выдзелілі ўчастак пад агарод. Славіка забралі ў армію. Вера была ў камандзіроўцы ў Астрахані. Ганна атрымала кватэру ў Менску, там і працавала. Я, Надзя і ўнучка Каця заставаліся ў Салігорску. Надзя з унучкай былі дома, а я амаль кожнага дня езьдзіў на лецішча. Клаў на доміку 40-80 цаглін, здымаў каларадзкіх жукоў, змагаўся з пустазельлем, зьбіраў ураджай. А памідоры, як на дзіва, павырасталі і безь цяпліцы амаль па кілё.

У 1987 годзе Славік вярнуўся з арміі і працягнуў навучаньне ў Брэсцкім політэхнічным інстытуце, а закончыўшы яго ў 1991 годзе, жаніўся. Жонка Таня — зь Мікашэвічаў. Там і адбылося вясельле.

У 1989 годзе з згоды кіраўніка трэсту Сатігорскводбуд Царанкова я арганізаваў пры ягоным трэсьце праектна-каштарысны каапэратыў. Гэткая арганізацыя ў межах СССР тады была навіной, і гарвыканкам, які займаўся рэгістрацыяй, даў згоду зь вялікімі абмежаваньнямі. Пачаткова перад намі ставілася задача забясьпечыць трэст неабходнай праектнай дакумэнтацыяй, якую немагчыма было тэрмінова атрымаць ад дзяржаўных праектных арганізацый. Першыя месяцы мы спраўляліся пасьпяхова, але вялікай выгады ад гэтага ня мелі. У наш каапэратыў уваходзілі шэсьць чалавек: чатыры інжынэры (яны працавалі ў дырэкцыі, а ў каапэратыве — па сумяшчальніцтве), геадэзіст (працаваў у праектнай групе гарвыканкаму, у нас таксама па сумяшчальніцтве) і я — пэнсіянэр. Па савецкай традыцыі лічылі, што, калі мы будзем атрымліваць вялікую зарплату, яна будзе заробленая несумленна, і таму з боку трэсту і райвыканкаму нам ставілі абмежаваньні.

Пасьля 27 ліпеня 1990 году настала палёгка. Да гэтага часу мы ўжо крыху пазнаёміліся з калгасамі ды саўгасамі і рабілі, праўда, яшчэ асьцярожна, для іх сякую-такую дакумэнтацыю. У іх былі цяжкась-

ці з праектамі на будаўніцтва дарог. Дарогі невялікія — адзін-два, максымум пяць кілямэтраў даўжынёй, трэцяй катэгорыі. Такой дробязьзю дзяржаўным праектным арганізацыям нявыгадна займацца, дык і не займаліся. Мы гэта выкарысталі і перакваліфікаваліся. А пасьля перарэгістрацыі аддзяліліся ад трэсту й пачалі працаваць самастойна. Праектавалі толькі дарогі і добраўпарадкаваньне тэрыторый. Я як вольны чалавек з сваім транспартам у будныя дні выведваў, дзе ў калгасах патрэбная нашая дапамога. Калі знаходзіў, дамаўляўся з старшынёй наконт сустрэчы, і ён выказваў мне свае пажаданьні. Часта выяжджалі на месца. Дамаўляліся наконт тэрмінаў выдачы дакумэнтацыі і аплаты.

Замоўцаў зьдзіўляў тэрмін выкананьня заказу: месяц-два — ня болей, і безь ніякіх лімітаў і ўзгадненьняў з УКБ[21] райвыканкаму.

Узгадненьне мы рабілі толькі з архітэктарам раёну. Зьдзіўляла і задавальняла замоўцу таксама форма аплаты — толькі пералічэньнем у банк. Наяўны разьлік і разьлік натурай выключаўся. Пасьля ўзгадненьня ўсіх пытаньняў з замоўцам мы дзейнічалі самастойна. У выходныя дні я, геадэзіст і два інжынэры выяжджалі на аб'ект, рабілі нівэлірную і тэадалітную здымку тэрыторыі. За тыдзень вечарамі геадэзіст апрацоўваў гэтыя пошукі і выдаваў апрацаваныя матэрыялы на ватмане. Далейшую работу ў праектаваньні выконваў адзін з двох інжынэраў або я. Праца ня вельмі цяжкая, бо ў часе геадэзічных работ будаўніцтва гэтай дарогі абмяркоўвалі супольна. Заставалася пасядзець за рысавальнай дошкай, падлічыць аб'ёмы работ і скласьці каштарыс. Гэтым мае хлопцы займаліся пасьля асноўнай працы або ў выходныя дні, вольныя ад паездак. А яшчэ я адказваў за ўзгадненьне праекту зь магчымымі яго выканаўцамі, банкам і раённым архітэктарам. Такім чынам, нам дастаткова было месяца-двох для перадачы замоўцу гатовага, з усімі ўзгодненага праекту.

Далей — звычайная бухгальтарская праца. Заробленыя грошы (пасьля выплаты падаткаў, адлікаў на матэрыялы, транспарт, памнажэньне дакумэнтацыі) мы дзялілі між сабой, згодна з дамоўленасьцю, пароўну. Інжынэр, такім чынам, у каапэратыве атрымоўваў па чатыраста-пяцьсот рублёў у месяц, тады як на асноўнай працы — толькі дзьвесьце. Зразумела, стала праяўляцца яшчэ большая зацікаўленасьць у рабоце.

Аднойчы я дамовіўся з старшынёй калгасу у Капыльскім раёне запраектаваць дзьве дарогі. Сустрэча мелася адбыцца ў суботу раніцай а 7-й гадзіне. У прызначаны час мы былі ў калгасе. Выехалі з

[21] Упраўленьне капітальнага будаўніцтва.

старшынёй на скрыжаваньне, адкуль пачыналася адна з праектных дарог. Ён коратка расказаў, што яму трэба, і, як правадыр, правай рукой паказаў кірунак нашай работы. Затым я паехаў зь ім на ягонай машыне знаёміцца з пажаданьнямі і ўмовамі будаўніцтва (кар'ер, адлегласьць дастаўкі пяску і т.д.). Мы праезьдзілі зь ім каля дзьвюх гадзін, і, калі вярнуліся на скрыжаваньне, маіх хлопцаў ужо не было бачна. Яны з тэадалітам і нівэлірам аддаліліся ад скрыжаваньня мэтраў на пяцьсот.

— Дык вы што, ужо й працуеце? — зьдзівіўся старшыня. Прызвычаіўся ён да тэмпаў на сацыялістычных прадпрыемствах (перакуры, замочкі, "работа не волк..." і т.д.).

Зімой рабілі пошук на тэрыторыі для праектаваньня дарогі даўжынёй пяць кілямэтраў у вёсцы Гоцак Салігорскага раёну. Дні кароткія, і не хапала нам дня. Апошніх адзнак па рэйцы ўжо ня бачылі і, каб закончыць работу, падсьвечвалі сярнічкамі. Вось якую зацікаўленасьць мелі.

Ад лета 1991 году мы пачалі распрацоўвань праекты на беларускай мове. Паводле "Закону аб мовах у БССР", на гэта прадугледжвалася аж пяць гадоў (Артыкул 10). Мы баяліся, што нашую ініцыятыву прымуць у штыкі. Аднак ні замоўца, ні падрадчыкі, ні нават банк ні словам не запярэчылі. І навукі асаблівай не спатрэбілася. Усе ўсё зразумелі безь перакладнікаў.

У 1993 годзе стала вельмі адчувальным абмежаваньне ў выдаткоўваньні калгасам грошай на будаўніцтва, а сваіх, як звычайна, у іх не было. Будаўніцтва спынялася, а як вынік — скарачалася патрэба ў праектах. Мы пастанавілі спынінь сваю далейшую дзейнасьць і зьліквідаваліся.

## *ВУЗЕЛЬЧЫК НАШЧАДКАМ НА ПАМЯЦЬ*

Як часта казалі нам нашыя бацькі, а і мы не забываемся нагадаць нашым нашчадкам: "Не забывайне нас, як памрэм. Успамінайце нас хоць калі-нікалі".

А каго з сваіх продкаў мы памятаем? Або хоць што пра іх ведаем? Пра бацькоў, а часам і пра дзядоў сваіх яшчэ што-небудзь помнім. А далей у мінулае, на жаль, - непраглядная цемра. Як быццам нікога даўней і не было. Але ж гэта ня так - людзі жылі з сваімі вялікімі і малымі турботамі, талентамі і недахопамі, пачуцьцём свае годнасьці. Сярод іх і такія, кім маглі б з поўным правам ганарыцца іхныя нашчадкі. Гэта гісторыя кожнай сям'і — сотая, тысячная, мільённая доля гісторыі нашага народу. Ей мы ня можам грэбаваць, ня маем права забывацца і зьняважаць яе.

Калі я выйшаў на пэнсію, у мяне зьявілася шмат вольнага часу. І ня так вольнага ў простым яго значэньні. Фізычна я працаваў на лецішчы, будаваў там домік, рабіў рамонт кватэры ў новым доме — яе нам выдзелілі як перасяленцам з вуліцы Гуляева, дзе пачалі будаваць шматпавярховыя дамы. Разумова я ня быў нічым абмежаваны. І ўзяўся за рэалізацыю сваёй даўняй задумы — напісаць “Гісторыю нашай сям'і”. Гэтыя ўспаміны - трэцяя частка яе. Першая частка — "Генэалёгія" - радаводы трох сем'яў: Дубовікаў — па бацькавай лініі, Казлоў — па матчынай і Пятровічаў - па жончынай лініі. Радавод кожнага роду распрацаваны ў двох відах: у выглядзе табліцы і ў выглядзе радаводнага дрэва. У табліцы сабраныя ўсе продкі й іхныя нашчадкі з родавымі і сямейнымі сувязямі, з датамі нараджэньня і сьмерці (што магчыма ўстанавіць на сёньняшні дзень). Радаводнае дрэва пачынаецца ў корані родапачынальніка, ад якога адыходзяць галіны меншыя і яшчэ меншыя. Шлюбныя сувязі тут не паказаныя. У радаводзе Дубовікаў самым старым продкам мне вядомы толькі прадзед Зьмітрок. У радаводзе Казлоў — прапрапрапрапрадзед Пракоп. Для мяне гэта ня вельмі багатая гісторыя, але для маіх унукаў, якіх ужо пяцёра, дадасца яшчэ два "пра". А гэта ўжо ня так і мала. Затое кароны гэтых дрэваў — вельмі пышныя разгалінаваньні ў дзясяткі імёнаў. Пошук і збор дадзеных давялося весьці па сваёй памяці, у размовах з родзічамі і знаёмымі, на могілках Случчыны і "пад Юр'ем" ля мястэчка Краснае. Ніякіх архіваў не захавалася.

Другая частка "Гісторыі" — гэта генэалёгія ў фатаграфіях. Яна ўяўляе тры альбомы: першы - "Нашы продкі", другі - "Маё пакаленьне" і трэці — "Нашы нашчадкі". Усе фатаздымкі разьмешчаныя ў генэалягічнай пасьлядоўнасьці. Самы стары зроблены не пазьней за 1910

год. На ім — група людзей, сярод якіх, дакладна вядома, ёсьць мой дзед Рыгор, але каторы зь іх - ужо ніхто ня можа сказаць. Дзед Рыгор Казёл памёр 1 красавіка 1911 году. Здымак зроблены летам. На колькі гадоў я спазьніўся з гэтай працай? Хто даруе мне гэтае спазьненьне?

Дарагія нашчадкі, я прашу вас прадоўжыць маю працу для сваіх нашчадкаў. "Што напісана пяром, ня выйме і сякера". Мой дзядзька Сяргей, сын дзеда Ліванара, пакінуў пасьля сябе 16 сшыткаў, у якіх апісваў свае ўражаньні, падзеі, пра якія да яго даходзілі чуткі або сьведкам якіх ён быў сам. Мне, на жаль, не давялося пагартаць гэтую спадчыну. Прычыну ня буду шукаць, ня мае значэньня. Пра іх мне расказаў мой траюрадны брат Алесь Харытон, якому ў гэтым пашанцавала. З сшыткаў стала вядома пра нашых прадзедаў да сёмага калена - Піліпа, Палікарпа і Пракопа. Усе яны жылі ў Канчанах. Падзеі, апісаныя дзядзькам Сяргеем у сшытках, сьведчаць, што нашыя прадзеды не былі праваслаўныя: яны былі або каталікі, або вуніяты. Пра гэта яшчэ гаворыць і той факт, што ў Красным каталіцкі касьцёл быў у 1500 годзе, а праваслаўная царква пабудаваная толькі ў другой палове XIX стагодзьдзя, а на царскіх варотах дагэтуль захаваліся выявы вуніяцкіх крыжоў. У 1863 годзе, як піша дзядзька Сяргей, праводзілі наварочваньне жыхароў вёскі Канчаны ў самую справядлівую веру — праваслаўную. Выконвалі гэтую работу казакі. Яны выстройвалі жыхароў на вуліцы і прымушалі хрысьціцца і маліцца па новым звычаі. Тых, хто яшчэ не авалодаў новымі навыкамі, білі нагайкамі. Прадзед Пётра, паводле апісаньня, быў глухаваты, і ягоны бацька (мой прапрадзед) Банадысь крычаў яму, каб рабіў, што патрабуюць казакі.

А людзі спрадвеку верылі, і няважна, як зваўся іхны Бог: Ра ці Буда, Зэўс ці Юпітэр, Егова ці Хрыстос, Ярыла ці Ўсемагутны Сусьветны Розум. Важна, каб вера была сьвядомай і спрыяла станоўчаму разьвіцьцю чалавечага роду, яго ўдасканаленьню.

Падзеі 1989-га і наступных гадоў — стварэньне БНФ, Віскулі, разбурэньне савецкай імпэрыі, прыняцьце Дэкларацыі аб сувэрэнітэце БССР ды іншыя — прынесьлі вялікія перамены ў хаду нашага жыцьця. Актыўны ўдзел у Адраджэньні, дзе разам з былым настаўнікам Міхасём Ждановічам мы склададі ідэалягічнае ядро Садігорскай суполкі, патрабаваў ад нас адпаведных ведаў і дзеяньняў. Газэты "Звязда", "Народная газета", часопісы "Спадчына", "Беларуская мінуўшчына", "Беларускі гістарычны часопіс" і г.д., а таксама шматлікія кнігі й брашуры, што пачалі свабодна друкавацца і прадавацца ў кнігарнях і шапіках Саюздруку, дапамагалі нам самім прачнуцца і ў іншых абудзіць пачуцьцё нацыянальнай годнасьці. Аднак мяне не задаваль-

няла тая форма храналягічных датаў, што ўсюды падаваіася ў табліцах. У ёй не адчуваўся той час, пэрыяд ¯ калі, што і за якім уладаром адбывалася. Для сваіх дзяцей і сяброў, зь якімі меў штодзённыя кантакты, я намерыўся зрабіць табліцы на свой лад. Сабраў гатовыя даты і разьмеркаваў іх на дванаццаці аркушах — па адным стагодзьдзі на аркуш. Кожны аркуш падзяліў па вэртыкалі на тры калёнкі. Справа і зьлева былі маштабныя лінейкі па 2,5 сантымэтраў на кожныя 10 гадоў. У левай калёнцы ставіў год падзеі, якая коратка апісвалася ў другой калёнцы. У трэцяй калёнцы запісваў імя ўладара, які ў гэты пэрыяд кіраваў беларускімі землямі, даты пачатку і канца ягонага ўладараньня. Такая форма хоць і складаная, аде больш наглядная.

Аднак адначасова зь лёзунгамі Адраджэньня пачалі адгукацца і такія, як "старэйшы брат", "адвечная дружба", "адвечнае імкненьне да аб'яднаньня" і падобныя настальгічныя ўздыхі. Я ня веры ў праўдзівасьць гэткіх выказваньняў. І ўсё ж яны адмоўна ўзьдзейнічалі на яшчэ не падужэлую, не адроджаную сьведамасьць некаторых людзей. Але як даказаць іх недарэчнасьць? Пачаў зьбіраць даты па гісторыі нашых усходніх суседзяў і зрабіў табліцы, аналягічныя маім першым (па гісторыі Беларусі). Калі яны былі гатовыя, я сумясьціў іх па аднолькавых стагодзьдзях. І тут наглядна выявілася бязглузьдзіца настальгічнага стогну. Калі Полацак згадваецна як нейкае дзяржаўнае ўтварэньне ўжо на першым аркушы маіх табліц пад 862 годам, то Масква зьяўляецца толькі на чацьвертым аркушы пад годам 1147-м, і тое як уладаньне баярына Кучкі, дзе суздальскі князь Юры Далгарукі сустракаўся з кіеўскім князем Сьвятаславам Вольгавічам на паляваньні. Дадей ад 1243 да 1480 году на гэтых землях была імпэрыя Залатая Арда. Няёмка прызнаваць перад сваім і суседнімі народамі, што да 1480 году княствы, утвораныя манголамі на гэтых землях, ніякай самастойнасьці ня мелі, у тым ліку і Маскоўскае княства. Яны нагадвалі цяперашнія вобласьці ці краі, а губэрнатарамі-князямі былі пакорныя князі тыпу Івана Каліты, Дзьмітрыя Данскога ды іншыя.

А што было пасьля канчатковага скасаваньня залежнасьці Масквы ад Залатой Арды? Адвечнае імкненьне да аб'яднаньня двох брацкіх народаў? Але ж ад 1492 да 1537 году, за сорак пяць гадоў, Маскоўскае княства разьвязала пяць войнаў з мэтай захопу беларускіх земляў! Ці ж гэта не працяг мангольскай экспансіі на захад? А якім брацкім аб'яднаньнем можна назваць 1772-1793-1795 гады падзелу Рэчы Паспалітай і поўную акупацыю Беларусі?

Былі цяжкасьці ў разьмяшчэньні імёнаў уладароў у трэцяй калёнцы. Некаторыя зь іх уладарылі вельмі кароткі тэрмін, і іх імёны не

зьмяшчаліся ў адведзеным месцы. Акрамя гэтага, інтуіцыя падказала мне неабходнасьць распрацоўкі радаводаў нашых уладароў. Зь цяжкасьцю, але нешта атрымалася. Можа, такая работа дзе й існуе, але я яе ня бачыў. Кожнаму ўладару я зрабіў быццам візытоўку, дзе запісаныя ягоныя імя, дата нараджэньня і сьмерці, дзе й калі ўладарыў і, калі гэта вядома, ягонае сямейнае становішча. Вызначыў іх родавыя сувязі. Магчыма, будуць тут і недакладнасьці, і спрэчныя меркаваньні. Нямала іх і сярод гісторыкаў. Адны робяць гэта праз адсутнасьць дакладных пісьмовых крыніц, другія таму, што так, а не інакш патрабуе эпоха ці перакананьні, выгады, схільнасьць аўтараў. Прыкладам, каго Ўладзімеру нарадзіла Рагнеда? Толькі Ізяслава, як лічаць некаторыя, ці яшчэ сыноў і дачок? Калі толькі Ізяслава, то чый сын Яраслаў ды іншыя? Чаму да Рагнеды ніхто не нарадзіў Уладзімеру князевіча? Пра гэта нідзе нічога не сказана і меркаваньні розныя. Расейскім і украінскім патрыётам нявыгадна лічыць Рагнеду родапачынальніцай і кіеўскіх князёў, а калі капнуць глыбей, то і расейскіх. Гэта ніяк не ўзгадняецца з імпэрскімі плянамі некаторых уладароў, для якіх Беларусь ня што іншае, як "Северо-западный край" імпэрыі.

Падобным чынам і палякі замоўчваюць беларускае паходжаньне цэлай каралеўскай дынастыі Ягелонаў ад Ягайлы і Соф'і Гальшанскай. Мы не павінныя гэтыя ды іншыя факты хаваць. Мы мусім імі ганарыцца!

Гэтую сваю працу я аформіў у альбом і назваў яго "Гісторыя Беларусі: Храналёгія ў маштабе часу і ў суіснаваньні з суседзямі". Размножыў у дзесяці паасобніках з дапамогай галоўнага рэдактара газэты "Салідарнасьць" Беларускага незалежнага прафсаюзу гарнякоў Віталя Мурылёва і перадаў па адным паасобніку сваім дзецям і блізкім па перакананьнях сябрам. А пад час падрыхтоўкі гэтай кнігі зьявілася ідэя ўзнавіць яго ў выглядзе дадатку друкарскім спосабам. Спадзяюся, што ён будзе прыносіць карысьць у адраджэньні сьвядомасьці нашага народу і нашае Радзімы — Рэчы Паспалітай Беларусі.

## *ПАСЬЛЯСЛОЎЕ*

Гэтыя ўспаміны пісаў я не для сябе, хоць і зь вялікім задавальненьнем. Мне ўжо восемдзесят адзін. Усё для маіх нашчадкаў – дзяцей, унукаў, праўнукаў, а можа, і для далейшых пакаленьняў. Ці даруюць яны мне, што я так позна ўзяўся за гэтую працу? Калі б я пачаў гадоў дзесяць-дваццаць таму, яна была б нашмат багацейшая і цікавейшая. Памяць ня тая, шмат што ня мог успомніць.

Даруйце мне, мае нашчадкі! Я вінаваты перад вамі.

Не лянуйцеся! Працягвайце пачатую мной працу. Падзея, якая часам падаецца не вартай увагі, нашчадкам вашым праз 50-100 гадоў можа быць вельмі цікавай. Tempora mutantur, et nos mutamur in illis — кажа нам старажытнае рымскае выслоўе ("мяняюцца часы і мы мяняемся зь імі"). Нашчадкам нашым цікава будзе ведаць, як жылі іх продкі, якія мелі турботы, што ім прыносіла радасьць, а што — бяду. Яны ж будуць жыць у іншы, можа зусім не падобны да нашага, час. За вашу працу яны будуць удзячныя, будуць ганарыцца вамі. І не давядзецца, як мне, прасіць у іх прабачэньня.

Я ўдзячны за ідэйную і маральную падтрымку ў часе маёй працы жонцы Надзі, траюраднаму брату Алесю Харытону, гісторыку Міхасю Чарняўскаму. Дадаткова і за матэрыяльную падтрымку хачу адзначыць маіх дачок Веру і Ганну, сына Вячаслава, унучку Кацю і яе мужыка Андрэя, пляменьніцу Ганну Царык і вернага сябра Ўладзімера Рагалевіча, а таксама Беларускае грамадзкае аб'яднаньне "Ветэраны Адраджэньня", БСДП ("Грамада") і выдавецтва "Наша Будучыня".

*Юрась Дубовік,*
*сьнежань 2005 году*

© OCR: Камунікат.org, 2011 год
© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2011 год
© PDF: Камунікат.org, 2011 год

## *ДАВЕДКА*

Ва ўспамінах сустракаюцца назовы мясьцін, арганізацый ды іншае, што дзеля маёй самаўпэўненасьці здавалася агульнавядомым. Але ж гэта не заўсёды так. Ужо сёньня тыя, каму я даваў чытаць рукапіс, пытаюцца ў мяне: а што гэта. а дзе гэта і да т.п. Добра, што яшчэ ёсьць ад каго даведацца. А ў каго спытаюцца мае ўнукі ці праўнукі, кал і мяне ўжо ня будзе?

Даю ім цяпер кароткія тлумачэньні, якіх няма ў тэксьце.

КРАСНАЕ - упершыню згадваецца ў 1456 годзе як велікакняскі двор. Ад 1486 году - гэта мястэчка, а ў 1954 годзе перайменаванае ў вёску Маладзечанскага раёну. Разьмяшчаецца паабапал гасьцінца Менск-Маладзечна за 16 кілямэтраў ад Радашкавічаў і 17 кілямэтраў ад Маладзечна. На поўдзень ад галоўнай вуліцы, мэтраў за 50-100 ад яе, працякае невялікая рэчка Буша, а далей, яшчэ мэтраў праз 50-100, праходзіць чыгунка з станцыяй Буша. Да 1939 году Краснае называлася "Краснае над Ушой", гэта значыць над рэчкай Ушой. Працягласьць галоўнай вуліны ня менш за 3 кілямэтры. За чыгункай, мэтраў 50-100 ад яе, у адну вуліцу забудавана веска Канчаны. Краснае, станцыя Вуша і Канчаны ствараюць як быццам адно цэлае.

МЕСЯТА - веска, што за 3 кілямэтры ад Краснага ў бок Маладзечна, справа ад гасьцінца. Калісьці ад Краснага і Канчанаў да самай Месяты быў вялікі лес. Калі і хто яго зьнішчыў - ня ведаю. У гэтым лесе часта спыняліся цыганы. Памятаю, калі быў малы, езьдзілі з бацькамі глядзець тых цыганоў. У гэтым лесе дзед Рыгор сустрэўся з воўчай зграяй. Зь Месяты быў родам Тамаш Зан - філямат, філярэт, удзельнік беларускага вызвольнага руху ў XIX стагодзьдзі. Ягоным імем была названая польская гімназія ў Маладзечне, якая існавала да 1939 году.

ПЛЯБАНЬ - веска, што за 2-3 кілямэтры ад Краснага, калі ехаць па гасьцінцы ў Радашкавічы. Не даяжджаючы мэтраў 500 да Плябані, справа ад гасьцінца бачым могілкі "пад Юр'ем". Іх так называюпь таму, што на невялікім узгорку пасярод могілак даўней стаяла драўляная царква Сьвятога Юр'я. Пасьля вайны яна згарэла, кажуць, камсамольцы папрацавалі. На гэтых могілках пахаваны мой татусь, дзед Рыгор, бабулька Ганна, прадзед Петра і шмат родзічаў.

ПЯЦЮЛІ - веска за 10 кілямэтраў ад Краснага і за 3 кілямэтры зьлева ад гасьцінца, калі ехаць з Краснага ў Радашкавічы. Там у трыццатых гадох мой татусь зь нейкімі родзічамі купіў зямлю — фальварак Юхновічы. Назоў фальварку з гадамі забыўся, бо ён быў

невялікі і зь вёскай Пяцюлі ствараў адно цэлае. Так мы перасталі яго ўспамінаць і звалі ўсё "Пяцюлі".

НКВД (па-расейску) - народный комиссариат внутренних дел. Так бальшавікі называлі міністэрства нутраных справаў. Само слова “міністэрства”, “міністар” бальшавікі лічылі перажыткам капіталізму і ўсё называлі па-свойму. У свой час НКВД быў асноўным карным органам у Савецкай Расеі, на сумленьні якога - дзясяткі мільёнаў расстраляных, закатаваных у турмах і лягерах людзей. У народзе назву НКВД расшыфроўвалі: "Ня ведаеш, Калі Вернесься Дамоў". Найбольш крыважэрных камісараў - Дзяржынскага, Ягоду, Яжова, Берыю, у Беларусі Бермана, Цанаву — зьнішчылі самі бальшавікі.

БНС - Беларуская народная самапомач. Нацыянальная беларуская арганізацыя, створаная 22 кастрычніка 1941 году на акупаванай немцамі тэрыторыі Беларусі як дабрачынная, якая ставіла на мэце дапамагаць беларусам, пацярпелым ад ваенных дзеяньняў, бальшавіцкага і польскага перасьледу, дапамагаць у адбудове зруйнаванага чужынцамі беларускага краю. Першым кіраўніком быў І.Ермачэнка.

СБМ - Саюз беларускае моладзі. Патрыятычная моладзевая арганізацыя, створаная 22 чэрвеня 1943 году на акупаванай немцамі тэрыторыі Беларусі. Найвышэйшы орган - Кіраўнічы штаб на чале з шэфам-правадніком М.Ганько (хлопцы) і Н.Абрамавай (дзяўчаты) знаходзіўся ў Менску. Мэта гэтай арганізацыі - узгадаваньне пасьлядоўных будаўнікоў Беларусі, патрыятычнае выхаваньне моладзі, выкараненьне рабскай псыхалёгіі, разьвіцьцё пачуцьця нацыянальнай годнасьці, грамадзянскага абавязку, адказнасьці, працавітасьці і г.д.

БКА - Беларуская краевая абарона. Вайсковае беларускае фармаваньне, створанае 23 лютага 1944 году. Узначальваў Ф.Кушаль. Да сярэдзіны красавіка 1944 году было створана 36 пяхотных і 6 сапёрных батальёнаў - мабілізавана каля 25 тысяч чалавек. У ліпені 1944 году дзейнасьць БКА на тэрыторыі Беларусі спынілася.

© OCR: Камунікат.org, 2011 год
© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2011 год
© PDF: Камунікат.org, 2011 год